**МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
**“БРЭСЦКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭХНІЧНЫ УНІВЕРСІТЭТ”**

**Кафедра сацыяльна-палітычных і гістарычных навук**

**В.М. Папко, М.В. Стралец, С.М. Васовіч, П.У. Малашук**

# ГІСТОРЫЯ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСІ

*Рэкамендавана Саветам універсітэта ў якасці дапаможніка для студэнтаў усіх спецыяльнасцей*

**БРЭСТ 2010**

УДК 008 (476)(091)(075.8)
ББК 63.3 (4 Беи)-7я73
П 17

***Навуковыя рэцэнзенты:***
кандыдат гістарычных навук, дацэнт УА "Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А.С. Пушкіна" **А.І. Пашковіч**;

кандыдат гістарычных навук, старшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН Беларусі **Д.А. Крывашэй**;

кандыдат гістарычных навук, дацэнт УА "Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны універсітэт" **Л.Ю. Малыхіна**.

**В.М. Папко, М.В. Стралец, С.М. Васовіч, П.У. Малашук**
П 17 Гісторыя культуры Беларусі / В.М. Папко, М.В. Стралец, С.М. Васовіч, П.У. Малашук – Брэст: Установа адукацыі "Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны універсітэт", 2010. – 98 с.

ISBN 978-985-493-146-3

У дапаможніку даецца сістэматызаванае выкладанне ключавых пытанняў гісторыі культуры, якія ўваходзяць у тыпавую праграму курса гісторыі Беларусі для ВНУ. Адрасуецца студэнтам, для якіх гісторыя не з'яўляецца профільным прадметам.

УДК 008 (476)(091)(075.8)
ББК 63.3 (4 Беи)-7я73

ISBN 978-985-493-146-3

© Папко В.М., 2010
© Стралец М.В., 2010
© Васовіч С.М., 2010
© Малашук П.У. 2010
© Выд-ва БрДТУ, 2010.

## ЗМЕСТ

Уводзіны.....4
Раздзел I. Цывілізацыйная спадчына Старажытнага свету, Сярэдніх вякоў і Беларусь (С.М. Васовіч).....5
Тэма 1. Духоўная і матэрыяльная культура першабытнай эпохі.....5
Тэма 2. Культура Беларусі ў X–XIII стст.....11
Тэма 3. Культура Беларусі ў XIV – першай палове XVI ст.....19
Раздзел II. Цывілізацыйная спадчына Новага часу і Беларусь (В.М. Папко).....28
Тэма 4. Культура беларускіх земляў у складзе Рэчы Паспалітай (1569-к. XVIII ст.).....28
Тэма 5. Культурнае развіццё беларускіх земляў у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII- пач. XX стст.).....36
Раздзел III. Савецкая мадэль культурнага развіцця (М.В.Стралец, П.У. Малашук).....42
Тэма 6. Культура БССР (1917 – 1941 гг.).....42
Тэма 7. Культурныя працэсы ў Заходняй Беларусі (1921 – 1939 гг.).....51
Тэма 8. Культура Беларусі ў часы Вялікай Айчыннай вайны.....55
Тэма 9. Культурнае жыццё ў БССР (сяр. 1940-х – сяр. 1960-х гг.).....60
Тэма 10. Супярэчлівыя працэсы ў культурнай сферы БССР (сяр. 1960-х – перш. пал. 1980-х гг.).....64
Тэма 11. Беларуская культура ў часы перабудовы (1985 – 1991 гг.) (М.В.Стралец, В.М. Папко).....67
Раздзел 4. Суверэнная Рэспубліка Беларусь ва ўмовах глабалізацыі.....73
Тэма 12. Айчынная культура ва ўмовах станаўлення незалежнай дзяржавы (М.В. Стралец, В.М. Папко).....73
Тэма 13. Беларускае мастацтва на рубяжы XX і XXI стст. (В.М. Папко).....78
Тэма 14. Рэспубліка Беларусь як суб'ект міжнародных культурных адносін (М.В. Стралец, П.У. Малашук).....92
Заключэнне.....97

## УВОДЗІНЫ

У сучасным грамадстве актыўна ідуць розныя трансфармацыйныя працэсы. У першую чаргу гэта інтэграцыя і глабалізацыя, якія з кожным годам ахопліваюць усё большыя сферы жыцця. З іншага боку, ідзе фарміраванне новых нацыянальных дзяржаў (у прыватнасці, Беларусі), якія імкнуцца развіваць сваю культуру, мову і абараняць яе ад знешніх адмоўных уплываў. Усё гэта істотным чынам уплывае на культуру і мастацкае жыццё краін. У сучаснай сітуацыі культурная сфера хутка набірае вагу ў жыцці грамадства. Гэты працэс назіраецца ва ўсім свеце, таму і ўзрастае цікавасць да культурнай праблематыкі не толькі з боку даследчыкаў у традыцыйных галінах мастацтвазнаўства і гісторыі, але і з боку прадстаўнікоў эканамічнай, юрыдычнай, паліталагічнай, сацыялагічнай і іншых навук.

Культура – сукупнасць штучных парадкаў і аб'ектаў, якія былі створаны людзьмі ў дадатак да прыродных. Культура з'яўляецца асяроддзем пражывання людзей, арганізаваным спецыфічным, уласцівым толькі чалавеку спосабам. Культура – свет творчасці, дзе пастаянна з'яўляюцца новыя адкрыцці ў вытворчасці матэрыяльнага і духоўнага. Розныя фактары ўздзейнічаюць на развіццё культуры. І заўсёды далёка не апошнюю ролю ў гэтым працэсе адыгрывала дзяржава, якая і сама ёсць прадукт культуры, эвалюцыі чалавецтва. На працягу стагоддзяў творцы і ўлада ўзаемадзейнічалі, суіснавалі, процістаялі адзін аднаму. І гэтыя ўзаемаадносіны нельга назваць простымі ці аднасэнсоўнымі. У канцы XX ст. дзяржава – адзін з асноўных фундатараў у галіне культуры многіх краін. У свеце сфарміравалася вялікая колькасць разнастайных тыпаў яе падтрымкі, шмат формаў ўзаемадзеяння паміж дзяржавай, капіталам і творцамі.

Асноўнымі айчыннымі цэнтрамі па вывучэнню гісторыі культуры з'яўляюцца ўстановы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі: Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклора; Інстытут гісторыі; Беларускі універсітэт культуры і мастацтваў, навукова-даследчая ўстанова "Інстытут праблем культуры". Сур'ёзны ўклад у распрацоўку гісторыка-культурных праблем уносіць таксама прафесарска-выкладчыцкі склад ВНУ.

У працэсе вывучэння дысцыпліны "Гісторыя Беларусі" надзвычай важна прасачыць асноўныя этапы гісторыі айчыннай культуры, якая развівалася ў рамках агульных еўрапейскіх працэсаў. Менавіта такі падыход дапамагае зразумець як пастаянства, так і пераемнасць пры даследванні канкрэтных этапаў айчыннай культурнай гісторыі.

Перыядызацыя гісторыі культуры Беларусі:

- Культурныя працэсы на Беларусі ў дадзяржаўны перыяд.
- Культура першых беларускіх княстваў (IX-XIII стст.)
- Культура Вялікага княства Літоўскага (сярэдзіна XIII ст. – 1569 г.).
- Культура Вялікага княства Літоўскага ў складзе Рэчы Паспалітай абодвух народаў (1569 г. – канец XVIII ст.).
- Беларусь ў складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX стст.).
- Культура БССР (1921 – 1991 гг.)
- Культура Рэспублікі Беларусь (1991 – 2009 гг.)

# РАЗДЗЕЛ І. ЦЫВІЛІЗАЦЫЙНАЯ СПАДЧЫНА СТАРАЖЫТНАГА СВЕТУ, СЯРЭДНІХ ВЯКОЎ І БЕЛАРУСЬ

## Тэма 1. Духоўная культура і мастацтва першабытнай эпохі.

1. Вераванні ранняй родавай абшчыны.
2. Вераванні позняй родавай абшчыны.
3. Мастацтва.

***Фетышызм** (ад франц. fetiche – ідал, талісман)* – вера людзей у незвычайныя асаблівасці прадметаў.

***Татэмізм** (на мове* паўночнаамерыканскага племені індзейцаў аджыбвэ "от-атэм" азначае "ягоны род") – вера ў звышнатуральную роднасць паміж этнічнай групай людзей і якой-небудзь жывёлай, раслінай альбо іншым аб'ектам прыроды.

***Магія*** (ад грэч. mageia – вядзьмарства, чараўніцтва) – вера, якая прыпісвае звышнатуральныя здольнасці чалавечым дзеянням.

***Анімізм*** (ад лац. anima – душа, animus – дух) – вера ў існаванне духаў і душ.

***Культ продкаў-пакравіцеляў*** – вераванні, у якіх асноўным аб'ектам пакланення становяцца продкі і іх духі, дапамогай якіх можна быццам бы заручыцца, прыбягаючы да розных абрадаў і цэрымоній.

***Земляробчы (жывёлагадоўчы) культ*** – вераванні, згодна з якімі галоўнымі аб'ектамі пакланення становяцца духі і звышнатуральныя істоты – апекуныската і земляробства, падацелі ураджлівасці.

Да ІІ тысячагоддзя да н.э. старажытныя жыхары Беларусі рабілі прылады працы з камяню; у ІІ тысячагоддзі да н.э. яны пачалі выкарыстоўваць медзь і бронзу, у І тысячагоддзі да н.э. – ужо ведалі жалеза. Выкарыстанне металічных прылад працы значна палепшыла ўмовы жыцця.

Рэлігійныя вераванні пачалі ўзнікаць прыкладна каля 40 тысяч гадоў назад на адносна высокай ступені развіцця першабытнага грамадства, калі сфарміраваўся чалавек сучаснага тыпу (homo sapiens), а таксама ўзнікла культура як спецыфічны чалавечы спосаб жыццядзейнасці.

### *1. Вераванні ранняй родавай абшчыны.*

Першапачаткова аб'ектам рэлігійнага ўспрымання былі тыя прыродныя з'явы, з якімі чалавек быў звязаны ў сваей штодзённай практычнай дзейнасці і якія мелі для яго жыццёва важнае значэнне. Назіраючы розныя з'явы прыроды, першабытная людзі не маглі яшчэ іх зразумець. Аднак імкненне неяк растлумачыць іх прывяло да ўзнікнення веры ў дзівоснае і незвычайнае. Так узніклі першапачатковыя ўяўленні старажытных людзей аб фантастычных уласцівасцях асобных прадметаў. Тагачасныя жыхары Беларусі пакланяліся таксама многім сваім вырабам, у першую чаргу статуэткам. Старажытныя людзі прыпісвалі ім дзівосныя рысы: здольнасць вылечваць ад хваробы, ахоўваць жыллё, забяспечваць поспех у гаспадарцы. Такія прадметы і з'явы, якія надзяляюцца звышнатуральнымі ўласцівасцямі называюцца фетышамі, а вера сама – фетышызм. У далейшым прыпісваемыя прадмету звышпачуццёвыя ўласцівасці пачалі аддзяляцца ад яго, ператварацца ў самастойныя істоты – "духаў"; узнікла вера ў самастойную адносна ад цела "душу" (анімізм), стваралася магчымасць падвоенасці свету на рэальны існуючы і незямны, звышнатуральны.

У залежнасці ад свайго звышнатуральнага прызначэння фетышы падзяляліся на амулеты, талісманы і ідалы. *Амулеты* – прадметы, якія павінны былі засцерагчы чалавека ад розных няшчасцяў: хваробы, смерці, падману. *Талісманы* – прадметы, якія павінны былі забяспечыць здароўе і дабрабыт чалавека, а таксама поспех у розных відах дзейнасці. *Ідал* – прадмет, якому нададзена была форма чалавека альбо жывёлы і які "мог выконваць" просьбы і пажаданні. У адрозненні ад амулетаў і талісманаў, што ажыццяўлялі свае звышнатуральныя функцыі аўтаматычна, проста ў сілу іх прымянення, ідалаў трэба было прасіць і, адпаведна, дзякаваць ім за выкананне просьбы.

Старажытныя жыхары Беларусі прыпісвалі звышнатуральныя якасці ў асноўным не сваім вырабам, а прыродным з'явам і аб'ектам. Так, агонь лічыўся апекуном дома і асновай дабрабыту сям'і. Яго стараліся не пазычаць, нават суседзям, каб з хаты не сышоў дабрабыт. Нельга было пляваць у агонь, бо, па меркаванню тагачасных людзей, ён мог пакараць за непавагу: у чалавека магла ўзнікнуць хвароба, калі твар нібыта рабіўся чырвоным, як ад апёку. Увогуле культ агню быў сільна развіты ў індаеўрапейцаў. Агню надавалася значэнне ачышальнай сілы. Праяўленнем культу агню быў звычай пасыпаць цела нябожчыка мінеральнай чырвонай охрай. Чырвоны колер азначаў агонь.

Акрамя агню, звышнатуральныя ўласцівасці продкі беларусаў прыпісвалі вадзе, зямле і некаторым прадметам. Вада лічылася ачышчальнай і лячэбнай сілай. Таму перад святамі тагачасныя жыхары абавязкова мыліся. Дуб лічыўся сімвалам мудрасці, сілы, розуму. Бяроза шанавалася як сімвал дзявоцтва ў час вясенняга свята Сёмухі. Лічылася, што бяроза спрыяе росту збожжа і агародніны, таму на Сёмуху ссякалі бярозкі і ўтыкалі іх у зямлю каля хат. Найбольш вядомай з раслін-фетышаў ва ўсходніх славян з'яўлялася папараць-кветка. Паводле павер'яў, яна цвіла раз у год, на Купалле. Той, хто яе "знаходзіў", атрымліваў звышнатуральныя якасці: ён мог знаходзіць скарбы, разумець мову звяроў, птушак і раслін. У неаліце пачалі ўшаноўваць некаторыя крыніцы, а, магчыма, і некаторыя асабліва вялікія валуны. У шэрагу месцаў Беларусі захаваліся "камяні кахання" або "камяні нявест".

Фетышызм быў звязаны з магіяй. У аснове магіі ляжала ўяўленне аб тым, што пэўнае чалавечае дзеянне выклікае адпаведную жаданую з'яву. Магія займала вельмі важнае месца ў жыцці першабытных людзей і пранізвала ўсе яго сферы. Усё жыццё было насычана рознымі міфічнымі абрадамі і звычаямі, якія суправаджалі тагачасных жыхароў Беларусі ад нараджэння да смерці. Як правіла, магічныя ўяўленні і дзеянні мелі месца тады, калі чалавек быў не ўпэўнены ў сваіх сілах, сутыкаючыся з праблемамі, вырашэнне якіх залежыла не столькі ад яго самога, колькі ад мноства зменлівых фактараў. Найбольш пашыранымі відамі магіі на тэрыторыі Беларусі былі лячэбная, засцерагальная, земляробчая, любоўная. Напрыклад, лячэбная магія была накіравана на вылячэнне розных хвароб альбо іх прадухіленне.

Усе з'явы прыроды і свайго жыцця першабытныя людзі тлумачылі існаваннем духаў. Ім здавалася, што ў жывёл, раслін, камянёў, рэк, азёр і іншых з'яў, прадметаў і жывых істот ёсць душы. Такія вераванні чалавека носяць назву анімістычных.

Анімістычныя ўяўленні ўзніклі ў выніку прыпісвання раслінам і нежывым прадметам прыроды чалавечых якасцей. Прычым яны, як правіла, прыпісваліся тым прыродным з'явам, ад якіх залежала жыццядзейнасць чалавека і само ягонае існаванне. Таму чалавек спрабаваў наладзіць з імі своеасаблівы дыялог. На фарміраванне ўяўленняў першабытных людзей аб душы аказалі назіранні за працэсам сну.

Сярод духаў вылучаліся прыродныя і хатнія, добрыя і злыя. Да прыродных духаў адносілі лесуна – гаспадара пушчаў, вадзяніка і палевіка, багніка. Да хатніх – дамавіка, хлеўніка і гумніка. Усе хатнія духі, а таксама поля, лесу і лугоў уяўляліся тады добрымі для людзей.

Старажытныя людзі лічылі, што пасля смерці душа не знікае, а накіроўваецца ў нейкае іншае месца і вядзе там далейшае існаванне ў свеце духаў. На гэтай падставе склаліся ўяўленні аб замагільным свеце. Існаванне там спачатку бачылася аднолькавым для ўсіх людзей, незалежна ад іх прыжыццёвых маральных учынкаў. Чалавека рыхтавалі да замагільнага існавання. Ужо ў самых ранніх пахаваннях, якія адносяцца да перыяду палеаліту, археолагі знаходзяць зброю, прадметы побыту, упрыгожанні. Усё гэта, па меркаванню тагачасных жыхароў, павінна было служыць памерлым на тым свеце.

Старажытны чалавек стаў лічыць, што некаторыя жывёлы, расліны і прадметы з'яўляюцца яго родзічамі (татэмамі). Людзі верылі, што татэмы быццам бы дапамагаюць ім у цяжкую хвіліну. Прычыну ж смерці чалавека старажытныя людзі бачылі ў ператварэнні яго ў кроўныя з'явы прыроды. Таму татэмаў паважалі, часам абагатваралі, не прычынялі ім шкоды, імкнуліся іх аберагаць. Толькі у час татэмных свят дазвалялася есці мяса адпаведных жывёл. Дзеля задобрывання татэма-жывёлы і павялічэння яго колькасці старажытныя людзі выконвалі песні-заклінанні, татэмічныя танцы, у якіх звычайна імітаваліся паводзіны, вобраз і звычкі татэмаў. Для татэмізма характэрныя міфы-паданні пра фантастычных продкаў (паўлюдзей-паўжывёл), у якіх расказвалася пра ўзнікненне роду. Змест такіх міфаў быў асновай абрадавых дзеянняў. Верылі ў татэмных першапродкаў і старажытныя жыхары Беларусі. Тут былі распаўсюджаны павер'і, што бусел, вуж і мядзведзь нібыта садзейнічаюць чалавеку ў яго справах. Так, да вужоў звярталіся з просьбамі аб дажджы, ураджаі, шчасці. Існавалі ўяўленні аб ваўкалаках – людзях, якія ператвараліся ў розных жывёл, пераважна ў ваўкоў.

Татэмічныя ўяўленні адыгралі вялікую ролю ў фарміраванні родаплемяннога грамадства. На іх падставе адбываўся падзел усіх людзей на сваіх, на якіх распаўсюджваліся нормы і звычаі, і чужых.

Такім чынам, у часы існавання ранняй родавай абшчыны склаліся такія формы вераванняў, як анімізм, фетышызм, магія, татэмізм.

***2. Вераванні позняй родавай абшчыны.***

Заняткі земляробствам і жывёлагадоўляй прывялі да пашырэння культу сонца (салярнага культа). Распаўсюджвалася таксама ўшанаванне дажджу і звязаных з ім навальніц і маланак. Старажытныя людзі верылі, што добраму ўраджаю спрыяюць некаторыя ўрачыстыя абрады. Людзі зыходзілі з таго, што, танцуючы і спяваючы пад час гэтых абрадаў, можна быццам бы памагчы сонцу выклікаць дождж. Назва бажаства сонца ў продкаў беларусаў была розная ў залежнасці ад яго разнастайных функцый ці магчымасцей ў розную пару года: узімку – Каляда, на пачатку лета – Ярыла, на летні сонцаварот – Купала.

На стадыі распаду родавага ладу развіўся, як сямейны, культ продкаў. Гэты культ быў звязаны з анімістычнымі вераваннямі і ўяўленнямі аб продках як ахоўніках роду і іх нашчадкаў. Яшчэ ў каменным веку жыхары Беларусі аказвалі пашану памёршым і загінуўшым сваім сародзічам.

Першапачаткова пахавальны абрад складаўся з ахвярапрынашэння, ваенных гульняў, песень і памінальнага частавання. Звычай пахавання грунтаваўся на ўяўленні што душа чалавека жыве і пасля яго смерці. Таму нябожчыка клалі на бок або ніцма ў скурчаным стане ў позе спячага чалавека. Памерлым таксама клалі разнастайныя падарункі – прылады працы, посуд з ежай, зброю, упрыгожанні. Меркавалася, што яны спатрэбяцца нябожчыкам у замагільным свеце.

Доўгі час на большай часцы тэрыторыі Беларусі існаваў звычай трупапалажэння памёршых родзічаў у спецыяльна выкапаных ямах (грунтавое пахаванне). Але ў бронзавым веку пахавальны абрад значна змяніўся. У II тысячагоддзі да н.э. узнік звычай курганнага пахавання (над магілай насыпалі курганы вышынёй 3–4 метры). У тым жа тысячагоддзі пад уздзеяннем культу агню і надзялення яго ачышчальнай сілай з'явіўся звычай спальвання нябожчыкаў або абпальвання агнём плошчы, прызначанай для пахавання памерлага. Увогуле ў бронзавым веку на тэрыторыі Беларусі суіснавала некалькі відаў пахаванняў. У раннім жалезным веку таксама бытавалі абрады трупапалажэння і трупаспалення, курганныя і грунтавыя пахаванні.

У жалезным раннем веку ў асноўным сфарміраваўся пантэон багоў. Да хрысціянізацыі Кіеўскай Русі ў язычніцкі пантэон старажытных жыхароў Беларусі уваходзілі такія багі-духі, як Велес (апекун жывёлагадоўлі, гандлю, багацця, замагільнага свету, абрадавай паэзіі і песень), Пярун (бог грому і маланкі, заступнік воінаў, даравальнік дажджу), Дажбог (бог сонца), Зюзя (бог зімы і холаду), Ляла або Лада (багіня вясны, кахання, дзявочага хараства), Купала (бог дастатку і ўраджаю) і інш.

Воблікі некаторых багоў былі антрапаморфныя. Так, Пярун уяўляўся ў выглядзе высачэннага волата з доўгай барадой, чорнымі валасамі, лукам і стрэламі-маланкамі, Велес – магутнага велікана з доўгімі валасамі і барадой, Ярыла – прыгожага маладога хлопца, які ў белым адзенні, з вянком на галаве і каласамі ў руках вясновым досвіткам ездзіць па палях на белым кані і апладняе ніву, Лада – маладой прыгожай дзяўчыны, якая ранняй вясной ходзіць па праталінах і абуджае зямлю ад зімовага сну.

У гонар некаторых багоў існавалі святы. Так, Ярылаў дзень (6 мая) суправаджаўся карагодамі, вячэрай, песнямі, спяванне якіх павінна было забяспечыць добры ўраджай і нараджэнне здаровых дзяцей. У гэты дзень упершыню выпускалі скаціну ў поле. Сваё свята "меў" Пярун. Яно адзначалася 20 ліпеня. Каб захаваць хаты ад удара маланкі (па ўяўленню тагачасных жыхароў ад смяротнай кары Пяруна) на дзвярных шалёўках ставілі спецыяльны грамавы знак – круг з абазначэннем шасці радыусаў. У гонар Купалы адзначалася свята Купалле (у ноч з 6 на 7 ліпеня). Увогуле святы мелі для тагачасных жыхароў магічны сэнс. У гэтыя дні гадалі і выконвалі розныя магічныя абрады. У святы былі забаронены адны віды дзейнасці і прадпісаны іншыя, каб забяспечыць добрую будучыню.

Такім чынам, з удасканаленнем матэрыяльнай культуры ўскладнялася духоўная культура, міфалагічна-рэлігійныя ўяўленні.

### *3. Мастацтва.*

Мастацтва ўзнікла ў познім палеаліце. Яно было цесна звязана з рэлігійнымі вераваннямі. Мастацтва ўсёй першабытнай эпохі спалучала эстэтычныя і магічныя функцыі.

З-за адсутнасці на тэрыторыі Беларусі выхаду горных парод на паверхню магічныя выявы людзі наносілі на косці здабытых на паляванні мамантаў. Ствараліся таксама касцяныя статуэткі (адна такая, выраблена з біўня маманта статуэтка жанчыны – так званая "палеалітычная Венера", знойдзена непадалеку ад тэрыторыі Беларусі на стаянцы Елісеевічы ў Бранскай вобласці).

У неаліце выраблялiся касцяныя фігуркі жывёл, якія ушаноўваліся: лася, качкі, чаплі, змеі. Пашыраюцца таксама малюнкі і скульптуры антрапаморфных істот. Пра гэта сведчаць дзве галоўкі статуэтак (драўляная і касцяная), выяўленых на стаянцы Асавец-2 Бешанковіцкага раёна. Гэта не скульптурныя партрэты мужчын, а хутчэй за ўсё вобразы міфічных герояў, якім, відаць, пакланяліся старажытныя людзі. Вядомы выгравіраваныя схематычныя мужчынскія выявы на косці з возера Вячэра ў Любанскім раёне. Трэба адзначыць, што калі ў мастацтве палеаліту антрапаморфныя выявы былі прысвечаны пераважна жанчынам, то ў неаліце сустракаліся толькі мужчынскія выявы – вобразы нейкіх міфічных герояў і духаў. Гэта было выклікана складваннем патрыярхальнай родавай абшчыны, дамінаваннем у гаспадарцы паляўнічых і пастухоў. Пазней сталі пераважаць не выявы асобных фігур, а адпаведныя сцэны. Пры гэтым сустракаюцца выявы звяроў і птушак, якія раскрываюць іх паводзіны ў час палявання.

У бронзавым веку пры шырокім распаўсюджанні арнаментальнага мастацтва і кананізацыі знакаў-сімвалаў наглядаўся заняпад выяўленчай культуры. Тым не менш у паселішчы Асаўцы быў знойдзены абломак гаршка са схематычнай выявай чалавечай постаці. У эпоху ранняга жалезнага веку сустракаюцца фігуркі-ідалы.

Увогуле ў першабытным мастацтве вобраз чалавека не меў канкрэтных рыс. Яго знешні выгляд адлюстроўваў толькі аблічча людзей таго часу. Старажытныя скульптары і жывапісцы стварылі абагульнены вобраз свайго сучасніка. Таму, напрыклад, малюнкі чалавечых постацей на гаршках каменнага, бронзавага і ранняга жалезнага веку вельмі схематычныя і падобныя.

Гліняны посуд, што з'явіўся ў неаліце, пакрываўся разнастайнымі арнаментамі, якія мелі магічны сэнс, а таксама задавальнялі эстэтычныя патрэбы чалавека. Спачатку посуд аздабляўся вельмі сціпла: некалькі паскаў з плыткіх ямак. Але хутка ганчары пачалі ўпрыгожваць яго рознымі арнаментамі. Элементамі арнаментаў былі адбіткі лінейнага, зубчастага і грабеньчатага штампа, ямкі, насечкі, тычкі, прочыркі, шнуры, наколы, якія ўтваралі паясы, вертыкальныя лініі, касыя і рамбічныя кампазіцыі. Пакрывалася арнаментам звычайна уся паверхня гаршкоў. Нават донцы ўпрыгожваліся. Кожная археалагічная культура адрознівалася формай, арнаментацыяй і ўпрыгожаннямі посуду. Трэба адзначыць, што ў бронзавым веку пад уздзеяннем распаўсюджвання вытворчых форм гаспадаркі і з'яўленнем салярнага культу, істотна змяніўся арнамент. Ва ўзорах замест глыбокіх круглых ямак, насечак, грабеньчатых штампаў, наколак пачалі пераважаць адбіткі шнура. Дно посуду амаль заўсёды аздаблялася сонечнымі знакамі ў выглядзе крыжоў і кругаў. У свядомасці старажытных людзей яны звязваліся з нябеснымі свяцілямі і адраджэннем прыроды. Сярод арнаментаў сустракаліся зігзагі, якія сімвалізавалі ў шнуравікоў нябесную вільгасць. У канцы бронзавага веку з'явіўся зусім не аздоблены посуд. Дакладныя прычыны гэтага пакуль невядомы. Хутчэй за ўсё ў гэты час адбыліся значныя змены ва ўяўленнях людзей аб навакольным асяроддзі. Тым не менш ранейшы арнамент усё ж захаваўся. Яго ўзоры зрэдку сустракаліся на посудзе ранняга жалезнага веку. Аздабляліся зрэдку таксама прылады працы з рога і костак.

На першых стаянках людзей на тэрыторыі Беларусі знойдзены падвескі – аздоба для адзення і прычоскі. Старажытныя жыхары Юравіцкага паселішча выраблялі падвескі з пласцінак біўня мамонта. Цела і вопратку людзі каменнага веку яшчэ з часоў пазняга палеаліту ўпрыгожвалі рознымі амулетамі з зубоў ваўка, лісіцы, пясца і іншых звяроў. Чалавек у той час надаваў зубам жывёл чарадзейныя ўласцівасці. Хутчэй за ўсе, яны павінны былі перадаць па ўяўленням старажытных людзей ім сілу і спрыт адпаведных звяроў. Магчыма, людзі лічылі, што паляўнічы, на шыі якога красаваліся іклы мядзведзя будзе дужы, як гэты звер. Магчыма, амулетамі маглі быць зубы звяроў – татэмаў роду. Амулеты і каралі з зубоў татэмных жывёл ўжываліся не толькі як упрыгожанні, але і як сродак, які быў здольны засцерагчы чалавека ад няўдачы і няшчасця.

Асабліва любілі жыхары Беларусі аздабляць сваё цела і вопратку ў бронзавым веку. У гэты час пачаўся выраб упрыгожанняў з медзі і бронзы. Таксама выкарыстоўваліся косць і прыбалтыйскі бурштын (з бурштыну рабілі вялікія падвескі, каралі, гузікі, кольца). Прычым у бронзавым веку ўпрыгожанні паступова пачалі губляць магічны сэнс, ўсё больш набывалі эстэтычныя і сацыяльныя функцыі.

Першабытнаму грамадству былі вядомы некаторыя музычныя інструменты. У бронзавым веку людзі выкарыстоўвалі разнастайныя духавыя інструменты – жалейкі і свістулькі з птушыных костак, берасцянкі, казіныя ражкі. Напэўна існавалі у той час і ўдарныя музычныя інструменты.

Такім чынам, першабытныя помнікі мастацтва, знойдзеныя на тэрыторыі Беларусі (жаночыя ўпрыгажэнні, статуэткі, малюнкі на касцях), сведчаць аб развіцці тут мастацтва.

### *Літаратура*


1. Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. / М.П. Касцюк, У.Ф. Ісаенка, Г.В. Штыхаў [і інш.]. – Мн.: Беларусь, 1994. – Ч. 1. – 1994. – С. 10–50.
2. Тарасаў, К. Памяць пра легенды: постаці беларускай мінуўшчыны. – Мінск: Полымя, 1994. – С. 27–40.
3. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / Пад рэд.: М.Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн.: Экаперспектыва, 2000–2008. – Т. 1: Старажытная Беларусь: ад першапачатковага заселення да сярэдзіны XIII ст. / Пад рэд.: М.Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – 2000. – С. 59–62, 84–86, 118–122.
4. Гісторыя Беларусі: падруч. у 2 ч. / Пад рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля. – Мн.: Выш. шк., 2003. – Ч. 1: Ад старажытных часоў – па люты 1917 г. / Пад рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля. – 2003. – С. 17–37.
5. Чигринов, П.Г. Очерки истории Беларуси: учеб. пособие. – Мн.: Выш. шк., 2004. – С. 7–13.

## Тэма 2. Культура Беларусі ў Х–ХІІІ стст.

1. Прынящце хрысціянства: прычыны, асаблівасці, вынікі.
2. Дойлідства.
3. Мастацтва.
4. Пісьменства і літаратура.
5. Рэлігійна-асветніцкія дзеячы.

***Язычніцтва*** – рэлігійныя вераванні, заснаваныя абагаўленні розных сіл прыроды.

***Хрысціянізацыя насельніцтва*** – пераўтварэнне хрысціянскай рэлігіі ў складаную частку духоўнага светапогляду, светаўспрымання насельніцтва, распаўсюджванне хрысціянскай абраднасці ў вытворча-гаспадарчай дзейнасці і побыце, скасаванне язычніцкіх культаў.

***Епархія*** – царкоўна-тэрытарыяльная акруга, якой кіраваў епіскап.

***Пергамент*** – спецыяльна выробленая тонкая скура маладых жывёл, якая ужывалася для пісьма.

***Летапіс*** – гэта гістарычна-літаратурны твор з апісаннем падзей па гадах.

***Дойлідства*** – тое ж, што архітэктура.

***Раманскі стыль*** (франц. roman, ад лац. Romanus – рымскі) – стыль сярэдне-вяковага заходнееўрапейскага мастацтва, які развіваўся пад моцным уздзеяннем рымскіх традыцый. Раманская архітэктура вызначалася суровасцю, выкарыстаннем масіўных, цяжкіх форм. У выяўленчым мастацтве пераважала экспрэсіўная трактоўка сюжэтаў, адлюстраванне ў роспісах, рэльефах, кніжных ілюстрацыях магутнага і грознага Бога.

***Готыка*** (франц. gothique ад назвы германскага племені – готаў) – стыль у еўрапейскім мастацтве XII–XV стст. Выяўленчае мастацтва эпохі готыкі вызначалася падпарадкаванасцю вертыкальнаму рытму архітэктурных форм, выцягнутымі прапорцыямі, дынамізмам, увасабленнем у алегарычнай форме ідэі грахоўнасці чалавека.

***Фрэска*** – роспіс вадзянымі фарбамі па свежай тынкоўцы.

Характэрнай прыкметай Х–ХІІІ стст. з'яўлялася цеснае перапляценне культуры з рэлігійнымі вераваннямі. Культура старажытных беларускіх зямель мела шмат агульнага з культурай іншых усходнеславянскіх народаў. Гэта агульнае выяўлялася ў стылі, спосабе ўпрыгожвання арнаментам прадметаў прыкладнога мастацтва. Але пры ўсёй агульнасці культуры Старажытнай Русі на тэрыторыі Беларусі яна мела спецыфіку.

### *1. Прынящце хрысціянства: прычыны, асаблівасці, вынікі.*

***Перадумовы прыняцця хрысціянства.***

1. Знаёмства з хрысціянствам воінаў, якія ўдзельнічалі ў паходах на Візантыю.
2. Неабходнасць усталявання княжацкага адзінаўладдзя.
3. Неабходнасць цеснай сувязі з іншымі дзяржавамі, якія ў той час станавіліся хрысціянскімі.

На Беларусь хрысціянства пачало пранікаць яшчэ ў ІХ ст., але пануючай рэлігіяй стала толькі ў канцы ХІІ – пачатку ХІІІ ст.

***Асаблівасці распаўсюджвання хрысціянства на Беларусі:***

1. Хрысціянства на беларускія землі даходзіла як з Візантыі, так і з паўночнага захаду (Скандынавіі).

2. Калі ў Рымскай імперыі хрысціянства развівалася знізу – ад нізоў да вярхоў, урада, эліты, то ў славян яно насаджалася зверху – ад эліты да народа.

3. Хрысціянства на тэрыторыі Беларусі ўводзілася не гвалтоўна і не насільна, як у Кіеўскім княстве.

4. Хрысціянства у X–XIII стст. не выцесніла язычніцтва, а напласталася на яго, прывяло да двухвер'я.

5. Пэўны час хрысціяне на землях Полацкага княства, маючы непасрэдныя зносіны з Візантыяй, духоўна не падпарадкоўвалася кіеўскаму мітрапаліту.

Было выбрана хрысціянства ўсходняга ўзору, таму што у тыя часы Канстанцінопаль меў несумненнае першынство ў культуры (славяне лічылі Царград цэнтрам міру); у Візантыі існавала літургічная літаратура на мове славян (царкоўнаславянскай).

Хрысціянства на Беларусі было прынята прадстаўнікамі вышэйшай знаці ўслед за афіцыйным увядзеннем яго ў Кіеве (афіцыйнае прыняцце хрысціянства па візантыйскаму абраду адбылося ў 988 г. пры князе Уладзіміры Святаслававічы). Пасля яно пачало паступова распаўсюджвацца сярод іншых пластоў грамадства. Новая вера на беларускіх землях распаўсюджвалася павольна і павінна была вытрымаць барацьбу з язычніцтвам. Простае насельніцтва, пасля таго як прыймала хрысціянства, доўгі час працягвала пакланяцца язычніцкім багам, выконваць язычніцкія абрады, прытрымлівацца язычніцкіх ўяўленняў і вераванняў. У XI–XIII стст. на Русі нават працягвалі функцыянаваць язычніцкія свяцілішчы. Суіснаванню язычніцкай і хрысціянскай вер садзейнічала тое, што суседзямі нашых продкаў былі балцкія плямёны, у якіх высокага развіцця дасягнула шматбожжа. Палітэістычная вера не стварала ніякіх перашкод для веры хрысціян, бо прызнавала не аднаго Бога, а шмат. Таму хрысціянства фактычна выклікала ***двухвер'е*** – з'яву, калі з хрысціянствам перапляталіся розныя формы больш ранніх вераванняў. Двухвер'е на Беларусі ахоплівала X–XIII стст.

Пасля прыняцця хрысціянства ў буйных гарадах і княствах пачалі стварацца епархіі. У Полацку епархія узнікла ў 992 г. (трэцяя пасля Кіеўскай і Ноўгарадскай), у Тураве – у 1005 г. (у духоўным падпарадкаванні тураўскага епіскапа знаходзілась Берасце), у Смаленску – у 1137 г. Адкрываюцца цэрквы і манастыры. Напрыклад, у Полацку ў XII ст. існавалі не менш 10 культавых мануметальных збудаванняў, тры манастыры. У Тураўскім княстве першым манастыром быў Лешчынскі пад Пінскам. Ён быў заснаваны Уладзімірам Святаслававічам.

Свецкая улада садзейнічала царкве. Царква атрымлівала ад князёў дзесятую частку дзяржаўных даходаў і, акрамя таго, значныя зямельныя ўладанні.

***Прыняцце хрысціянства мела важныя станоўчыя вынікі:***

1. Хрысціянства, як рэлігія агульнапрынятая ў Еўропе, яшчэ больш наблізіла землі Беларусі да заходнееўрапейскіх дзяржаў і Візантыі. У выніку, значна ўзрос аўтарытэт княстваў Беларусі (з імі, як з роўнымі пачалі лічыцца іншыя хрысціянскія дзяржавы), пашырыліся і паглыбіліся палітычныя і культурныя узаемасувязі з іншымі краінамі.

2. Сувязі з хрысціянскімі краінамі, асабліва з Візантыяй, садзейнічалі развіццю рамяства і гандлю, у першую чаргу знешняга.

3. Хрысціянства садзейнічала далейшаму паспяховаму развіццю феадальных адносін, ідэалагічнаму умацаванню адзінства дзяржаў-княстваў, розных сацыяльных слаёў грамадства і усталяванню манархічнага дзяржаўнага ладу (хрысціянская вера адпавядала адзінаўладдзю князя ў дзяржаве; хрысціянскае веравучэнне сцвярджала, што ўсякая ўлада ад Бога).

4. З хрысціянствам звязана ўвядзенне і пашырэнне пісьменнасці. У XI ст. у полацкай зямлі асвойвалася кірылічная азбука (яе склалі для старабалгарскай мовы ў 863 г. браты Кірыла і Мяфодзій).

5. Знаёмства з візантыйскай культурай з'явілася стымулам для развіцця адукацыі, літаратуры, выяўленчага мастацтва, архітэктуры. З прыняццем хрысціянства зараджаецца каменна-цяглянае будаўніцтва, узвядзенне манументальных культавых пабудоў. Пры цэрквах і манастырах адкрываліся школы, перапісваліся кнігі.

6. Паляпшаўся маральны стан грамадства (хрысціянскія запаведзі садзейнічалі усталяванню добрых адносін паміж людзьмі). З прыняццем хрысціянства зніклі такія заганы язычніцтва, як кроўная помста, мнагажонства, ахвяраприынашэнне, у тым ліку людзей.

7. Хрысціянства садзейнічала кансалідацыі старажытнарускага народа. Страчвалася плямянная самасвядомасць (этнонім «дрыгавічы» у апошні раз у летапісу прыгадваецца пад 1149 г., «крывічы» – пад 1162 г., «радзімічы» – пад 1169 г.). Узнікае адзіная этнічная самасвядомасць для ўсіх ўсходніх славян. Яны называюць сябе агульным імем – «рускія».

Такім чынам, у выніку прыняцця хрысціянства быў зроблены вялікі крок уперад у культурным развіцці. На працягу стагоддзяў хрысціянская царква аказвала плённы ўплыў на духоўнасць, культуру беларускага народа.

***2. Дойлідства.***

Вянцом матэрыяльнай культуры на беларускай зямлі было дойлідства. Спачатку помнікі дойлідства будаваліся з дрэва, а пасля прыняцццця хрысціянства – з цэглы і камяню. У X–XI стст. храмы будавалі пераважна майстры, запрошаныя з Візантыі. Яны прынеслі на старажытнарускія землі традыцыі канстанцінопальскага будаўніцтва (раманскі стыль).

Першым мураваным храмам на тэрыторыі Беларусі быў грандыёзны Сафійскі сабор у Полацку. Ён быў узведзены ў 50-х гг. XI ст. пры князю Усяславу Брачыславічу. Меў сем (пяць) купалоў. Гэта была не толькі культавая, але і грамадская пабудова. Там размяшчаліся архіў, бібліятэка, дзяржаўная казна. Полацкая Сафія была сімвалам незалежнасці.

На Беларусі склаліся дзве архітэктурныя школы: полацкая і гродзенская. Асаблівасці полацкай школы: вежападобны выгляд цэркваў, невядомы візантыйскаму дойлідству, з кілепадобнымі какошнікамі ўверсе; цэнтрычна-пірамідальная кампазіцыя архітэктурных форм; сцены складваліся з прыроднага камяню і плінфы ў тэхніцы паласатай муроўкі (што стварала чырвона-белую гаму паверхні). Асаблівасці полацкай школы характэрны для полацкай Спаса-Еўфрасіннеўскай царквы, Барысаглебскай царквы ў Бельчыцах .

Акрамя полацкай школы дойлідства ў XII ст., склалася яшчэ адна самабытная школа дойлідства – гродзенская. Яна была больш лакальная і ахоплівала Гародню і Ваўкавыск. Адметнымі рысамі гродзенскай школы з'яўляюцца цагляная роўнарадовая

муроўка, незвычайная планавая структура і своеасаблівая дэкарыроўка фасадаў. Сцены ўпрыгожваліся ўстаўкамі з каляровага паліраванага каменю і каляровымі паліванымі керамічнымі пліткамі. У верхняй частцы сцен умуроўвалася вялікая колькасць галаснікоў (керамічныя збаны), якія выконвалі трайную функцыю: аблягчалі будаўнічыя канструкцыі, паляпшалі акустыку і дадаткова дэкаратыўна аздаблялі інтэр'ер. Найбольш характэрнымі помнікамі гродзенскай школы былі Барысаглебская (Каложская) і Ніжняя (на тэрыторыі дзядзінца) цэрквы ў Гародне, недабудаваны Ваўкавыскі храм.

У канцы XII ст. манументальнае культавае будаўніцтва старажытнай Беларусі практычна прыпыняецца. Гэта было звязана з тым, што пачаўся працэс драблення княстваў на невялікія ўдзелы. Пастаянная пагроза нападу з боку татар і крыжакоў, міжусобіцы прывялі да перавагі абарончых збудаванняў. У апошняй чвэрці XIII ст. у Камянцы была ўзведзена 3-мятровая пяціярусная вежа ("Камянецкі стоўп"), пабудаванная дойлідам Алексам паміж 1276 і 1288 гг. Ёсць звесткі пра тое, што такія вежы былі ў Гродна, Тураве, Новагародку і, магчыма, у Полацку. Гэтыя збудаванні адлюстроўвалі ўжо новы этап манументальнага дойлідства, звязаны з уплывам традыцый ранняй готыкі (будаўніцтва з брусковай цэглы, выкарыстанне ў дэкоры стральчатых вокнаў і ніш).

Усяго на тэрыторыі Беларусі выяўлена і даследавана 25 мураваных помнікаў культавай і грамадзянскай архітэктуры XI–XIII стст.

Такім чынам, з усталяваннем хрысціянства ў якасці афіцыйнай рэлігіі пачынаецца гісторыя манументальнага дойлідства Беларусі. Мураванае дойлідства беларускіх зямель развівалася ў рэчышчы архітэктурнага працэсу ўсяго ўсходнехрысціянскага свету і спалучала ў сябе шэраг арыгінальных асаблівасцей.

***3. Мастацтва.***

Прыяцце і пашырэнне хрысціянства на Беларусі спрыяла развіццю не толькі дойлідства, але і мастацтва. На фарміраванне мастацкай культуры аказалі ўплыў таксама і поліэтнічны склад насельніцтва, функцыянаванне вялікага воднага шляху "з варагаў у грэкі", стварэнне дзяржаўнасці, узнікненне гарадоў, пачатак выцяснення племяннной свядомасці насельніцтва тэрытарыяльна-дзяржаўнай.

Адначасова з каменнымі будынкамі ў жыццё і мастацтва ўсходніх славян увайшоў манументальны жывапіс. Яго прызначэннем у храме была ілюстрацыя хрысціянскага вучэння і Евангелля. Жывапіс быў дапаўненнем да царкоўнага рытуалу. Ён наглядна ілюстраваў праз мастацкія вобразы хрысціянскае веравучэнне. Таму сцены кожнай святыні знутры абавязкова ўпрыгожваліся фрэскамі. Прычым роспісы рабіліся ў візантыйскай манеры і паводле візантыйскіх канонаў. Роспісы захаваліся толькі на двух помніках: фрагментарна ў Сафійскім саборы і практычна цалкам у царкве Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра.

З пачаткам кнігапісання нараджаецца такая галіна жывапіснага мастацтва, як кніжная графіка. Тагачасная кніга была не толькі крыніцай ведаў, але і творам мастацтва, каліграфіі, жывапісу, залатарства. Жывапіснае аздабленне старажытных рукапісаў выяўлялася ў афармленні ініцыялаў, заставак і канцовак, у мініяцюрах. У цэлым рукапісы XI–XIII стст. афармляліся ў візантыйскім стылі. У іх аздабленні выкарыстоўваліся нескладаныя геаметрычныя і раслінныя элементы.

Шырокае развіцце на беларускіх землях атрымала прыкладное мастацтва. Насельніцтва Беларусі аздабляла нават звычайныя рэчы штодзённага ўжытку, якія задавальнялі чыста утылітарныя патрэбы. Рэчы упрыгожваліся геаметрычным арнаментам, раслiннымі кампазіцыямі, фігурамі людзей, птушак, жывёл, фантастыных істот. Прадметы, прызначаныя для феадальнай арыстакратыі, заможных гараджан, часта ўпрыгожваліся выявамі фантастычных звяроў і птушак, выкананымі ў асаблівай манеры – "звярыным стылі". Любімымі сюжэтамі старажытнарускага прыкладнога мастацтва былі геральдычныя львы.

Найкаштоўнейшым творам прыкладного мастацтва Беларусі таго перыяду з'яўляецца крыж Еўфрасінні Полацкай, створаны мясцовым майстрам Лазарам Богшам у 1161 г. Памер крыжа – 51 см у даўжыню, 1,5 см у таўшчыню. Паверхня пакрыта залатымі пласцінамі, а бакі – срэбнымі. На залатых пласцінах змешчаны выявы святых, выкананыя living рознакаляровымі эмалямі. Акрамя эмаляў парадны бок крыжа аздаблялі каштоўныя камяні, а па перыметры ён быў абведзены шнуркам перлаў. У крыжы захоўваліся першазначныя хрысціянскія рэліквіі, атрыманыя з Канстанцінопаля (напрыклад, кроў Хрыста, што засталася на распяцці, частка ад каменнай труны Багародзіцы, кавалачак ад каменя з труны Ісуса, мошчы св. Панцеляймона і інш.).

Апрача Лазара Богшы на беларускіх землях працавала вялікае мноства майстроў-ювеліраў. Старажытнабеларускія залатары выкарыстоўвалі наступныя тэхналогіі: ліццё, коўка, плаўка, цісненне, залачэнне, пляценне, зернь, скань, перагародчатая эмаль, гравіроўка, інкрустацыя металамі, шклом, каштоўнымі і напаўкаштоўнымі камянямі. Для стварэння прадметаў хатняга побыту выкарыстоўваліся і іншыя металы: жалеза, бронза, медзь.

Інтэнсіўнае храмавае будаўніцтва садзейнічала развіццю вытворчасці дэкаратыўнай керамікі. Керамічныя падлогі былі абавязковым элементам храмаў і аздаблялі не толькі мураваныя, але і драўляныя бажніцы. Прыкладна ў сяр. XII ст. на тэрыторыі Беларусі складваецца своеасаблівая сістэма афармлення керамічных падлог, якая прыкметна вылучалася на фоне суседніх рэгіёнаў. Падлога ўспрымалася ўся як адно цэлае – шыкоўны трохколеравы дыван. Пліткавыя майстэрні далі імпульс для вытворчасці маёлікавага і паліванага посуду, побытавых рэчаў, дробнай пластыкі: напрыклад, місак, збанаў, падсвечнікаў.

Да XI–XII стст. адносіцца ўзнікненне арыгінальнай дробнай пластыкі. Найбольш цікавым відам пластыкі XII–XIII стст. 'яўляюцца абразкі. Іх выраблялі з бронзы, косці і каменю. Частка абразкоў была зроблена па візантыйскіх і кіеўскіх узорах. Трэба адзначыць: старажытнабеларуская школа пластыкі выдавочна адрознівалася ад усіх рэгіянальных школ на абшарах усходніх славян актыўнай асіміляцыяй, творчай адаптацыяй розных мастацкіх патокаў. Менавіта ў гэтай сферы мастацтва, як ні ў якой іншай, моцна адчувалася ўздзеянне заходнееўрапейскай стылістыкі. Увогуле развіцце манументальнага жывапісу, кніжнай графікі, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, дробнай пластыкі старажытных зямель Беларусі ў XI–XIII стст. адбывалася ў рэчышчы візантыйскай традыцыі.

***4. Пісьменства і літаратура.***

Пісьменства з'явілася на Беларусі даволі рана – у X ст. Доказам гэтаму служаць старажытнейшы надпіс на пячатцы полацкага князя Ізяслава, знойдзеныя шматлікія пісьмовыя прылады – касцяныя ці жалезныя палачкі, якія называліся пісаламі.

Да XII ст. пісьменства распаўсюдзілася амаль сярод усіх слаёў грамадства таго часу. Пісьменнымі ў старажытных гарадах былі не толькі прадстаўнікі духавенства і знаці, але і простыя гараджане.

Выдатнымі помнікамі пісьменнасці з'яўляюцца розныя эпіграфічныя матэрыялы (так званыя "Барысавы" і "Рагвалодавы" камяні – у Падзвінні іх вядома дзевяць; доўгі надпіс на крыжы Еўфрасінні Полацкай; графіці полацкай Спаскай царквы Еўфрасіннеўскага манастыра; надпісы на праслачках, амфарах). У Берасці знойдзены грэбень з самшыта, на якім паслядоўна размешчаны славянскія літары ад "а" да "л". Гэты алфавіт выразаны ў пачатку XIII ст. Грэбень выконваў ролю "буквара" для навучання грамаце.

Выключную навуковую каштоўнасць маюць берасцяныя граматы – сярэднявечныя лісты. На тым баку бяросты, які прылегаў да дрэва, літары надрапвалі пісалам. Знойдзены берасцяныя граматы ў Віцебску і Мсціслаўлі.

У першай палове XI ст. пачалося летапісанне. Летапісцы праяўлялі цікавасць да падзей, якія адбываліся ва ўсіх усходнеславянскіх землях. У пачатку XII ст. Нестарам (манахам Кіева-Пячорскага манастыра) была створана "Аповесць мінулых гадоў" – першы ўсходнеславянскі летапісны звод. У ім змяшчаліся унікальныя звесткі з гісторыі беларускіх зямель. Летапісанне вялося ў XII–XIII стст. у буйных гарадах. Ёсць звесткі аб існаванні Полацкага летапісу, які страчаны ў XVIII ст. Не дайшоў да нас таксама Смаленскі летапіс. Летапісныя запісы, магчыма, вяліся ў Тураве і Навагрудку.

Рукапісных царкоўных кніг XI–XIII стст. таксама захавалася няшмат. Вядомы Тураўскае і Полацкае Евангеллі таго часу. Самае ранняе – Тураўскае Евангелле, створана на беларускіх землях у XI ст.

Кнігі пісалі на пергаменце. Рукапісы складалі ў сшыткі. Вокладкамі да іх служылі дзве дошкі. Такая кніга мела выгляд скрыні. Пераплёт каштоўных рукапісаў аздабляўся металічнымі ўпрыгожаннямі. Каб лісты кнігі не камячыліся, дошкі-вокладкі сцягваліся металічнымі засцежкамі. Розныя засцежкі ад старажытных кніг XII–XIII стст. знойдзены ў Менску, Друцку, Ваўкавыску, Навагрудку. Перапісам кніг займаліся спачатку пісьменныя людзі: адукаваныя манахі, княгіні, а пасля з'явіліся пісцы-прафесіяналы. Яны працавалі ў так званых скрыпторыях – майстэрнях рукапісных кніг у манастырах. Пісалі так званым уставам: буйнымі, прасталінейнымі і нязвязанымі літарамі з роўнай адлегласцю паміж імі і асобнымі словамі. Кнігі былі рэдкай і дарагой з'явай, даступнай толькі багатым людзям і такім установам, як царква і манастыры.

Асноўную масу кніг складалі рэлігійна-дыдактычныя творы. Была распаўсюджана перакладная літаратура, першымі творамі якой былі кнігі Свяшчэннага Пісання (кананічныя кнігі). Сярод шматлікіх відаў і жанраў некананічнай царкоўна-рэлігійнай літаратуры найбольшае распаўсюджанне мела агіяграфічная літаратура. Гэта царкоўная літаратура, у якой апісваецца жыццё святых, подзвігі і пакуты кананізаваных царквой людзей. На Беларусі такая літаратура вядома з канца XII ст.: "Жыціё і хаджэнне Еўфрасінні Полацкай". "Жыціе

Кірылы Тураўскага", "Слова пра манаха Марціна". У XIII ст. бытуе "Жыціе Аўрамія Смаленскага". Вяршынай мастацкай літаратуры старажытнай Русі лічыцца твор "Слова аб палку Ігаравым", у якім ёсць цікавыя звесткі аб полацкіх князах.

Такім чынам, у X–XIII стст. на тэрыторыі Беларусі шырока была распаўсюджана пісьменнасць. Высокага ўзроўня дасягнула літаратура, якая адлюстроўвала багацце духоўнага жыцця ўсходніх славян.

***5. Рэлігійна-асветніцкія дзеячы.***

***Еўфрасіння Полацкая (1104(1110)–1167(1173)).*** Дачка полацкага князя Георгія Усяславіча (унучка Усяслава Чарадзея), мела імя Прадслава. У юнацтве стала манашкаю, прыняўшы імя Еўфрасінні. Пасяліўшыся ў келлі Сафійскага сабора пры бібліятэцы, пачала перапісваць кнігі, а грошы ад іх продажу аддавала бедным людзям. У канцы 20-х гг. XII ст. у якасці ігуменні заснавала каля Полацка жаночы манастыр пры Спаскай царкве, пры якім адкрыла школу для навучання грамаце дзяцей. Замест драўлянай пабудавала каля 1160 г. каменную царкву святога Спаса (цяпер Спаса-Еўфрасіннеўская). Пазней падаравала Спаскай царкве дарагі крыж, выкананы па асабістым заказе і яе эскізам ювелірам Лазарам Богшам. Заснавала яшчэ і мужчынскі манастыр, якому падаравала Эфескі вобраз Божай Маці, прывезены з Візантыі. Асветніца надавала вялікую ўвагу духоўнаму самаўдасканаленню і вучыла вернікаў і вучняў цярплівасці і душэўнай чысціні, павазе да старэйшых, любові да тых, хто побач. Дзякуючы дзейнасці Еўфрасінні, полацкая Сафія стала важным цэнтрам духоўнай культуры Беларусі, а сабраная асветніцай бібліятэка дала магчымасць атрымаць добрую адукацыю многім пакаленням палачан. Еўфрасіння Полацкая – першая жанчына з усходніх славян, якая была кананізавана ў святыя. Яе мошчы знаходзяцца ў Спаса-Еўфрасіннеўскім манастыры з 1910 г.

***Кірыла Тураўскі*** (каля 1130–1182 гг.) вядомы як пісьменнік, выдатны прамоўца, прапаведнік, царкоўны дзеяч. Нарадзіўся ў Тураве ў багатай сям'і. Па жаданню гараджан быў пастаўлены епіскапам у сваім горадзе. З таго часу пачалася яго пісьменніцкая дзейнасць. Яму належаць 8 "слоў", або павучэнняў, 2 прытчы (іншасказальнае апавяданне з павучальнай высновай), 2 казанні пра манаскі чын і ангельскі вобраз, 2 пасланні (да Васіля ігумена Пячорскага), 32 спавядальныя малітвы і 3 каноны (царкоўнае песнапенне ў пахвалу святога, самога свята і да т.п.). Усё гэта дае поўнае права лічыць Кірылу Тураўскага першым вялікім мастаком слова, першым пісьменнікам еўрапейскага ўзроўню, які жыў і тварыў на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Творы Кірылы Тураўскага карысталіся вялікай папулярнасцю на землях усходніх славян і ўвайшлі ў залаты фонд старажытнай літаратуры. Сучаснікі называлі Кірыла Тураўскага "ўсея Русі Златавуст". Кірыл настойліва раіў шукаць лагоднасць, якая ёсць "маці мудрасці, і розуму, і добрай думкі, і ўсім добрым справам". Ён заклікаў адкінуць гордасць, непакорнасць, гнеў, варожасць, ўсялякую злосць. Апошнія 4 гады жыцця правеў у адасобленай келлі ў манастыры, дзе і памер. За гэты подзвіг стоўпніцтва далучаны да ліку святых.

***Клімент Смаляціч*** – выдатны царкоўны дзеяч і пісьменнік. З 1147 г. да 1154 г. быў мітрапалітам у Кіеве, дзе абараняў незалежнасць усходнеславянскай Праваслаўнай Царквы ад Візантыі. Напісаў шмат твораў, але захаваўся толькі адзін з іх "Пасланне Фаме прасвітару". Як сцвярджае Іпацьеўскі летапіс, Клімент Смаляціч "быў кніжнік і філосаф, якіх у Рускай зямлі не бывала"

***Аўраміи Смаленскі (Працалюбівы)*** – царкоўны прапаведнік і кніжнік. У канцы XII – пачатку XIII ст. карыстаўся вялікім аўтарытэтам у насельніцтва зямель сучаснай Беларусі. Яго казанні прыцягвалі слухачоў не толькі са Смаленска, але і з іншых мест. Быў настаўнікам не толькі для манаскай брацііі, але і для недухоўных асоб. 50 год свайго жыцця правёў у манастыры і нястомна прапаведаваў рэлігійнае пакаянне. Заклікаў смалян няўхільна прытрымлівацца маральных прынцыпаў хрысцыянства, клапаціцца пра духоўнае ўдасканаленне жыцця. Толькі дзякуючы незвычайнай вытрымцы, стойкасці, высакароднасці Аўрамій змог атрымаць маральную перамогу над лютай нянавісцю, публічнымі здзекамі, асмяяннем зайздроснікаў. За актыўнае прапаведаванне хрысціянства і ўзорнае жыццё Праваслаўная Царква кананізавала яго.

Увогуле імёны большасці асветнікаў не захаваліся ў народнай памяці, і вялікая колькасць таленавітых твораў не дайшла да нас. Але нават тое нямногае, што зберaглося, дае падставы сцвярджаць: выдатныя царкоўныя дзеячы сваімі творамі ўнеслі значны ўклад у фарміраванне ідэі агульнарускага, уходнеславянскага адзінства; яны рабілі жыццё людзей больш узнёслым і мэтанакіраваным.

### *Літаратура*


1. Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. / М.П. Касцюк, У.Ф. Ісаенка, Г.В. Штыхаў [і інш.]. – Мн.: Беларусь, 1994. – Ч. 1. – 1994. – С. 104–113.
2. Тарасаў, К. Памяць пра легенды: постаці беларускай мінуўшчыны. – Мінск: Полымя, 1994. – С. 19–23.
3. Лыч, Л. Гісторыя культуры Беларусі. – Мн.: Экаперспектыва, 1996. – С. 5–17.
4. Ковкель, И.И. История Беларуси с древнейших времен до начшего времени. – Мн.: Аверсэв, 1998. – С. 16–19.
5. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / Пад рэд.: М.Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн.: Экаперспектыва, 2000–2008. – Т. 1: Старажытная Беларусь: ад першапачатковага засялення да сяр. XIII ст. / Пад рэд.: М.Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – 2000. – С. 273–323.
6. Гісторыя Беларусі: падруч. у 2 ч. / Пад рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля. – Мн.: Выш. шк., 2003. – Ч. 1: Ад старажытных часоў – па люты 1917 г. / Пад рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля. – 2003. – С. 60–71.
7. Парашкоў, С.А. Гісторыя культуры Беларусі. – Мн.: Бел. навука, 2004. – С. 13–51.
8. Чигринов, П.Г. Очерки истории Беларуси: учеб. пособие. – Мн.: Выш. школа, 2004. – С. 37–44.
9. Козел, А.А. Философская мысль Беларуси: учеб. пособие. – Мн.: Амалфея, 2004. – С. 5–62.
10. Новік, Я.К. Гісторыя Беларусі. Ад старажытных часоў – па 2008 г.: вучэб. дапам. / Пад рэд. Я.К. Новіка. – Мн.: Выш. школа, 2009. – С. 49–57.

## Тэма 3. Культура Беларусі ў XIV – першай палове XVI ст.

1. Фарміраванне старабеларускай мовы. Развіццё літаратуры і летапісання.
2. Адраджэнне на Беларусі. Узнікненне кнігадрукавання.
3. Пачатак Рэфармацыі
4. Архітэктура і выяўленчае мастацтва.

***Адраджэнне (Рэнесанс)*** – эпоха ў развіцці духоўнай культуры Еўропы ў пераходны перыяд ад Сярэднявечча да Новага часу (XIV – першая палова XVII ст.), якая характарызавалася ўздымам свецкай навукі і мастацтва, станаўленнем нацыянальнай мовы, літаратуры і нацыянальнай самасвядомасці, гуманістычным светапоглядам; эпоха станаўлення і росквіту ранняй буржуазнай культуры.

***Рэфармацыя*** – (ад лац. Reformation – пераўтварэнне) – шырокі сацыяльна-палітычны і ідэалагічны рух у Еўропе, накіраваны супраць усяўладдзя рымска-каталіцкай царквы і яе значнай ролі ў палітычнай сістэме грамадства. Рэфармацыя прывяла да з'яўлення новага кірунку ў хрысціянстве – пратэстантызму.

***Гуманізм*** (ад лац. Humanus – чалавечы, чалавечны) – гэта філасофска-светапоглядная пазіцыя, якая сцвярджае высокую годнасць чалавека – творцы зямнога шчасця, прызнае яго права на свабоднае развіццё здольнасцей, абараняе ідэі справядлівасці, чалавекалюбства, свабоды і дасканаласці асобы.

***Храм-крэпасць*** – будынак, які сумяшчае функцыі культавага і абарончага збудавання.

***Гравюра*** – друкаваны адбітак на паперы з пласціны (дошкі), на якую нанесены малюнак.

***Кніжныя мініяцюра*** – малюнкі, шматколерныя ілюстрацыі, а таксама выяўленча-дэкаратыўныя элементы афармлення кніг – ініцыялы, застаўкі, канцоўкі, зробленыя ад рукі.

Беларуская культура ў XIV – першай палове XVI ст. мела ў асноўных рысах сярэдневечны характар, развівалася на феадальнай аснове пры панаванні дагматычнай царкоўна-рэлігійнай ідэалогіі. Змест і формы культуры вызначаліся ў першую чаргу інтарэсамі феадалаў і рэлігіі.

Царква ўнесла значны ўклад у развіццё асветы, літаратуры, дойлідства, жывапісу, музыкі. Калі Праваслаўная Царква з'яўлялася носьбітам старажытнарускіх традыцый, то каталіцтва прыўносіла элементы полькай і пераважна заходнееўрапейскай культуры.

Для характарыстыкі развіцця беларускай літаратуры, пісьменства і культуры XVI ст. некаторыя даследчыкі выкарыстоўваюць выраз "залаты век" (гэты выраз – вобраўзная назва перыяду найбольш яркага развіцця якой-небудзь з'явы).

### *1. Фарміраванне старабеларускай мовы. Развіццё літаратуры і летапісання.*

У XVI ст. адбылося фарміраванне адзінай старабеларускай (старажытнабеларускай) мовы. Яна пачынае прыкментна адрозніівацца ад агульна-ўсходнеславянскай мовы IX–XIII стст. У XIII–XVI стст. склаліся ўсе важнейшыя фанетычныя (напрыклад, "дзеканне", "цэканне", цвёрдае вымаўленне гука "р", "аканне" і "яканне"), граматычныя і лексічныя рысы, уласцівыя беларускай мове і цяпер.

На самых ранніх этапах развіцця беларуская мова стала афіцыйнай мовай дзяржаўных дакументаў (выконвала функцыі дзяржаўнай мовы). На ёй вялося справаводства і судаводства, пісаліся статуты і граматы, соймавыя пастановы і дагаворы, акты. Шырокае выкарыстанне старабеларускай мовы ва ўсіх відах канцылярска-юрыдычнай дакументацыі мела вынікам пераўтварэнне яе ў другой палове XVI ст. у развітую літаратурную мову.

У XIII–XVI стст. па-ранейшему шырока распаўсюджвалася царкоўна-рэлігійная літаратура з яе асноўнымі жанрамі: кнігі Бібліі, жыціі святых, пацерыкі, разнастайныя зборнікі слоў, казанні, павучэнні, апокрыфы. У XIV–XV стст. у рэлігійнай літаратуры выкарыстоўвалася царкоўнаславянская мова.

Адносна спрыяльныя культурна-гістарычныя ўмовы для развіцця беларускай літаратурнай мовы садзейнічалі яе пранікненню ў рэлігійнае пісьменства. Ужо ў XV ст. з'явіліся пераклады на беларускую мову розных твораў рэлігійнага характару, у тым ліку асобныя кнігі Свяшчэннага пісання (Бібліі). Разам з тым трэба адзначыць: у XIV–XV стст. па сутнасці не развіваўся такі папулярны ў ранейшыя гады жанр царкоўна-рэлігійнай літаратуры, як жыціі. Адзіны твор агіяграфічнага жанру разглядаемага перыяду, тэматычна і геаграфічна звязаны з літоўска-беларускімі землямі – "Жыціе літоўскіх (віленскіх) пакутнікаў" – узнік у канцы XIV ст. у Візантыі і быў мала вядомы на Русі.

Слаба развівалася і ўрачыстае царкоўнае красамоўства. Ніхто не мог параўнацца і наблізіцца да Кірылы Тураўскага. Варта адзначыць толькі асобу Рыгора Цамблака (1364 г. – каля 1420 г.), выхадца з Балгарыі, які з'яўляўся аўтарам больш як 40 твораў (пахвальныя і палемічныя словы, павучанні, жыціі, пропаведзі). Рыгорый Цамблак нейкі час быў кіеўскім мітрапалітам (быў абраны у 1415 г. на саборы праваслаўных епіскапаў ВКЛ у Навагрудку па ініцыятыве вялікага князя Вітаўта, і гэта падзея была пачаткам часовага аддзялення Праваслаўнай Царквы ВКЛ ад Маскоўскай мітраполіі).

Станаўленне ўласна беларускай літаратуры адбывалася даволі марудна. Гэта было абумоўлена, у першую чаргу, запаволенасцю працэсу фарміравання беларускай народнасці. З усіх жанраў беларускай літаратуры перыяду яе станаўлення найбольш дынамічна развіваліся летапісы. У новых гістарычных умовах перыяду палітычнай кансалідацыі беларускіх зямель і фарміравання беларускай народнасці летапісы набылі новыя якасці і рысы. Летапісанне стала беларуска-літоўскім паводле зместу і агульнадзяржаўным паводле накіраванасці (супраць феадальнай раздробленасці, за адзінства і магутнасць краіны, за яе высокі міжнародны аўтарытэт).

Беларуска-літоўскія летапісы і хронікі складваліся ў асяроддзі феадалаў, таму і падзеі там адлюстроўваліся з рыцарскімі ідэаламі. Эвалюцыяніравала і сама структура летапісаў, дзе традыцыйнае пагадовае адлюстраванне адметных падзей паступова замянялася цыкламі займальных гістарычных твораў апавядальнага жанру з відавочным ідэалагічным і выхаваўчым падтэкстам.

Першымі летапіснымі творамі, складзенымі з новых агульнадзяражаўных пазіцый, былі "Летапісец вялікіх князёў літоўскіх" і Беларуска-літоўскі летапіс 1446 г. "Летапісец вялікіх князёў літоўскіх", які быў складзены ў Смаленску на старабеларускай мове невядомай асобай і прысвечаны палітычнай гісторыі ВКЛ з 1341 г.(ад смерці Гедыміна) да канца XIV ст., быў створаны ў форме хронікі і складаўся з шэрага гістарычных

апавяданняў. Напісаны без дат, у форме суцэльнага апавядання, што значна адрознівала яго ад традыцыйных старарускіх летапісаў. У ім абгрунтоўваецца цэнтралізатарская палітыка літоўскіх князёў, падтрымліваецца іх памкненне да ліквідацыі феадальнай раздробленасці.

Практычна адразу ж пасля стварэння "Летапісца вялікіх князёў літоўскіх" у Смаленску распачалася праца па напісанні першага агульнадзяржаўнага летапісанага зводу ВКЛ, які ў сучаснай літаратуры вядомы як Беларуска-літоўскі летапіс 1446 г. Адна з асноўных мэт працы – паказаць пераемнасць Кіеўскай Русі і ВКЛ. Таму летапіс ахоплівае апісанне падзей за 854–1446 гг. Выказваецца погляд на ВКЛ як на літоўска-славянскую дзяржаву, якая прызнаецца адным з цэнтраў палітычнага аб'яднання ўсходнеславянскіх зямель.

У 20-я гг. XVI ст. была створана "Хроніка Вялікага княства Літоўскага і Жамойцкага", дзе выкладалася гісторыя ВКЛ ад легендарнага князя Палемона да Гедыміна. Гэты твор безгрунтоўна сцвярджае паходжанне літоўскіх князёў ад рымскіх арыстакратаў, якія ўцяклі ў Прынёманскі край ад праследаванняў Нерона. Хроніка была напісана з мэтай зацверджання перавагі літоўскіх феадалаў над феадаламі ўсходнеславянскага паходжання. У разглядаемы перыяд была створана і "Хроніка Быхаўца", дзе апісваліся падзеі палітычнай гісторыі ВКЛ ад легендарных часоў да пачатку XVI ст. Шмат увагі ўдзялялася апісанню розных паходаў і бітваў, ратных подзвігаў суайчыннікаў. У цэлым, трэба адзначыць, што летапісанне ў ВКЛ на дзяржаўным узроўні вялося нерэгулярна. У другой палове XVI ст. летапісы сталі паволі уступаць месца іншым гістарычным жанрам.

На працягу XV ст. пашыраецца ўжыванне паперы, што садзейнічала далейшаму развіццю пісьменнасці на беларускіх землях. Папера каштавала менш, чым пергамент, таму рукапісныя кнігі сталі даступнымі большаму колу тагачаснага грамадства. Пастаўлялася папера з еўрапейскіх краін.

Значныя цэнтры па перапісванню кніг дзейнічалі пры манастырах і княжацкіх рэзідэнцыях у Навагрудку, Вільні, Слуцку, Пінску, Полацку, Супраслі, Жыровічах і Віцебску. На першым месцы сярод іх прадукцыі стаялі кнігі рэлігійнага зместу. На працягу XIII–XV стст. былі створаны такія шэдэўры айчыннага кнігапісання, як Аршанскае, Полацкае, Лаўрышаўскае, Жыровіцкае Евангеллі, а таксама Смаленскі ды Мсціслаўскі псалтыры. Рукапісныя кнігі таго часу маглі мець розныя сістэмы пісьма (устаў, паўустаў, скорапіс) і адрозніваліся адна ад адной індывідуальнымі адметнасцямі почырку пісца.

Пад уплывам заходнееўрапейскай культуры ўзрастала колькасць свецкіх перакладных твораў. Сярод такой літаратуры асаблівай папулярнасцю карысталіся такія перакладныя рэчы, як "Александрыя", "Троя", "Трыстан і Ізольда". Далейшае развіццё атрымаў у Беларусі і такі асобны літаратурны жанр, як мемуарныя апісанні вандраванняў па розных краінах свету.

Такім чынам, пісьмовыя помнікі з беларускай моўнай асновай можна падзяліць на тры групы: юрыдычна-дзелавая, свецка-мастацкая і канфесійная. Гэтыя помнікі адрозніваліся не толькі прызначэннем і зместам, але і сістэмай моўных сродкаў.

### 2. Адраджэнне на Беларусі. Узнікненне кнігадрукавання.

Беларускую культуру не абмінула такая агульнаеўрапейская з'ява, як Адраджэнне, або Рэнесанс. Росквіт рэнесанснай культуры на Беларусі прыпадае на XVI ст. У гэты перыяд адбывалася пранікненне свецкіх гуманістычных і асветніцкіх павеваў у культуры, пэўная яе секулярызацыя, узнікненне кірылачнага і лаціна-польскага кнігадрукавання. Аднак складаныя сацыяльныя ўмовы другой паловы XVI ст. (Лівонская вайна, Люблінская унія 1569 г., рост грамадскай напружанасці) не далі магчымасці нармальна развіцца многім рэнесансавым з'явам беларускай літаратуры і мастацтва, паскорылі зараджэнне барочных тэндэнцый. Другім фактарам, стрымліваючым ўсебаковае развіццё свецкіх форм культуры, было агульнае эканамічнае адставанне Беларусі ад перадавых краін Еўропы і панаванне феадалізму. Негатыўна паўплываў і той факт, што Беларусь тэрытарыяльна знаходзілася на перыферыі Заходняй і Цэнтральнай Еўропы. Акрамя таго, тут толькі зараджалася свецкая літаратура на роднай мове, філасофская і грамадская думка мела яшчэ ўплыў багаслоўя і арыентавалася на Біблію, не было і яскравых вялікіх дасягненняў у такіх відах мастацтва, як жывапіс, скульптура, музыка. У выніку, хаця ідэі Адраджэння пранікл і ў літаратуру, мастацтва, філасофскую і грамадска-палітычную думку, на Беларусі развіццё рэнесанснавай культуры засталося незавершаным.

Філасофія эпохі Адраджэння носіць назву "гуманізм". Насуперак сярэдневяковаму аскетызму і самазнявазе асобы, царкоўна-рэлігійнаму асуджэнню чалавечай гордасці гуманізм прапаведае пачуццё асабістай годнасці чалавека, прызнае імкненне да самавыяўлення і самасцвярджэння асобы, да наватарства і творчай смеласці.

***Асаблівасці беларускага гуманізму:***

1) дэмакратычны характар;

2) выхаваўча-асветніцкая накіраванасць;

3) цесная сувязь з традыцыямі папярэдняй эпохі;

4) кампраміснае злучэнне новага светапогляду з элементамі старога – сярэднявечнага (у выніку адбылося іх творчае засваенне з выбарам найбольш актуальных на дадзеным этапе развіцця норм, каштоўнасцей, прынцыпаў і ідэй).

У перыяд Адраджэння высокага ўзроўню дасягнула грамадска-палітычная і прававая думка, што найбольш яскрава праявілася ў Статутах ВКЛ 1529, 1566 і 1588 гг. У апошнім прававым дакуменце знайшлі адлюстраванне такія прынцыпы, як падзел улады на заканадаўчую, выканаўчую, судовую. Найбольш поўна і ўсебакова ідэі Рэнесанса знайшлі адлюстраванне ў беларускім кнігадрукаванні, заснавальнікам якога стаў Францыск Скарына – пачынальнік беларускага рэнесансавага асветніцтва, каментатар першай беларускай Біблії. Яго кнігавыдавецкая дзейнасць пачалася ў Празе з кніг Біблії. 6 жніўня 1517 г. ён выдаў "Псалтыр". Усяго на працягу 1517–1519 гг. было выдана ў пражскай друкарні 23 кнігі Старога Запавету. Праз некалькі гадоў Францыск Скарына пераехаў у Вільню. Тут, у першай у ВКЛ друкарні, арганізаванай у доме бурмістра Я. Бабіча, ён надрукаваў "Малую падарожную кніжку" (каля 1522 г.) і "Апостал" (1525 г.).

Ф. Скарына ўвёў у шырокі ўжытак прадмову, надаў ёй філасофска-асветніцкі, навучальна-дыдактычны і маральна-этычны змест. З'яўляўся заснавальнікам у беларускай літаратуры анатацыі да кніг. Заслуга Ф. Скарыны і ў тым, што ён у свае перакладныя і неперакладныя выданні ўнёс беларусізмы ў царкоўнаславянскую мову. У кнігах Ф. Скарыны змяшчаліся дзесяткі гравюр.

Ф. Скарына зрабіў спробу перагледзець артадаксальна-сярэдневяковую трактоўку праблемы чалавечага існавання, паводле якой зямное жыццё – толькі падрыхтоўка да жыцця на тым свеце. Сцвярджаючы самакаштоўнасць чалавечага жыцця, ён рэабілітаваў зямное быццё. Вышэйшае прызванне чалавека – служыць грамадству. У разуменні Ф. Скарыны вартасць чалавека вызначаецца не тым, якога ён веравызнання, а тым, як ён паводзіць сябе з пункту гледжання універсальнага закону маралі – абыходзіцца з іншымі так, як хочаш, каб з табой абыходзіліся.

Пераемнікам Ф. Скарыны ў беларускім кірыліцкім кнігадрукаванні быў нясвіжскі кнігавыдавец Сымон Будны. Ён выпусціў некалькі кірылічных выданняў, з якіх да нашага часу дайшоў толькі "Катэхізіс" на беларускай мове (1562 г.). С. Будны заклікаў да гуманных дачыненняў між людзьмі, прапаведаваў культ розуму і бараніў свабоду чалавека, лічыў недапушчальным дагматызм, нецярпімасць і фанатызм.

Пазней выдавецкую дзейнасць ажыццяўляў беларускі шляхціч Васіль Цяпінскі на Полаччыне. У другой палове XVI ст. І. Фёдараў і П. Мсціславец выпусцілі у беларускім мястэчку Заблудаў "Евангелле вучыцельнае", а Фёдараў у 1570 г. – "Псалтыр з Часаслоўцам". У пачатку 1570-х гг. заблудаўская друкарня спыніла сваю дзейнасць у сувязі з грамадска-палітычнымі ўмовамі, якія ўскладніліся пасля ўтварэння Рэчы Паспалітай, а таксама хваробай пратэктара друкарні гетмана вялікага Р. Ходкевіча. Іван Фёдараў пераехаў на Украіну, дзе арганізаваў друкарні ў Львове і Астрогу. Пётр Мсціславец з 1569 г. усталяваўся ў Вільні, дзе быў выпушчаны шэраг кніг.

Выданні на польскай і лацінскай мовах выпускаліся галоўным чынам у XVI ст. рэфармацыйнымі друкарнямі. У ліку першых у 1553 г. была заснавана падобная друкарня ў Берасці (першая друкарня на тэрыторыі сучаснай Беларусі).

Прадстаўніком ранняй рэнесансавай культуры на Беларусі быў М. Гусоўскі – паэт-гуманіст. У 1522 г. ён стварыў літаратурны шэдэўр – "Песнь пра зубра". Гэты твор быў прасякнуты любоўю да роднай зямлі. Зубр у паэме – гэта алегарычны вобраз роднага краю, яго магутнасці ў "залаты век ВКЛ" (праўлення Вітаўта). Праз усю паэму праходзіць галоўная ідэя тагачасных гуманістаў – глыбокая пашана да чалавека як да разважлівай, дзейнай, гарманічна развітай духоўна і фізічна асобы, перад якой адкрыты ўсе магчымасці да далейшага самаўдасканалення. М. Гусоўскі заклікаў пакончыць з міжусобіцамі, прапанаваў ідэю яднання розных па культуры і веры еўрапейскіх народаў перад пагрозай турэцкага і татарскага нашэсцяў.

Такім чынам, беларуская культура эпохі Адраджэння развівалася складана і своеасабліва. У гэты перыяд узнікла беларускае кнігадрукаванне і адбылося станаўленне мясцовай школы кніжнай графікі. Пад уздзеяннем дзейнасці Ф. Скарыны ў 50–60-я гг. XVI ст. адкрыліся друкарні ў Вільні, Берасці, Несвіжы, Заблудаве. У выніку рэзка павялічыўся беларускі фонд кірылічнага і лаціна-польскага кнігадруку.

### *3. Пачатак Рэфармацыі.*

Храналагічныя рамкі Рэфармацыі на тэрыторыі Беларусі: другая палова XVI ст. – сярэдзіна XVII ст. Своеасаблівасць Рэфармацыі ў ВКЛ выявілася ў тым, што яе галоўнай сацыяльнай асновай былі прывілеяваныя слаі грамадства – магнаты, частка сярэдняй і дробнай шляхты (нярэдка магнацкая "кліентура"). Магнацкія сем'і і прадстаўнікі іншых княжацкіх родаў імкнуліся скарыстаць рэфармацыйныя ідэі ў сваіх карысных мэтах і

больш узбагаціцца за кошт царкоўнага і манастырскага зямельнага фонду, каб захаваць і ўмацаваць свой палітычны ўплыў і незалежнасць ад цэнтральнай улады вялікага князя. Праследуючы гэтую мэту, яны сталі не толькі прыхільнікамі ідэй Рэфармацыі, але і кіраўнікамі іх практычнага ажыццяўлення.

Нягледзячы на тое, што рэфармацыйны рух у ВКЛ пачаў развівацца ў форме ***лютэранства*** (у 1535 г. слуцкі князь Юрый Сямёнавіч падараваў зямельны надзел у Слуцку для пабудовы лютэранскай царквы), гэтая канфесія ў далейшым не атрымала распаўсюджання. Падначаленасць лютэранскай царквы свецкай уладзе не задавальняла шляхту. Лютэранства было пашырана ў асноўным сярод гараджан-іншаземцаў, якія, такім чынам, акрэслівалі сваю рэлігійную адасобленасць, і сярод нязначнай часткі шляхты, звязанай з нямецкай культурай. Яе галоўным цэнтрам у ВКЛ была Вільня, дзе існавалі нямецкія і польскія абшчыны.

Найбольшы ўплыў меў кальвінізм. На Беларусь гэта вучэнне прыйшло з Швейцарыі праз Польшчу. ***Кальвінізм*** – кірунак пратэстантызму, які ўзнік у перыяд Рэфармацыі ў XVI ст. Асновы веравучэння і культу сфармуляваў французскі тэолаг Жан Кальвін (1509–1564 гг.). Як рэлігійная сістэма кальвінізм склаўся ў Жэневе (Швейцарыя).

У кальвінізме шляхту прываблівала:

1) палітычны разлік: пад крылом новай веры магнаты хацелі адгарадзіцца ад каталіцкай Польшчы;

2) эканамічныя інтарэсы: хацелі абагаціцца за кошт зямельных уладанняў каталіцкай царквы;

3) апраўданне Кальвінам барацьбы з тыранам адпавядала традыцыйным каштоўнасцям вольнасці шляхты, давала падставу для супраціўлення цэнтральнай уладзе (кальвінізм займае самастойную пазіцыю ў адносінах да дзяржавы, аж да прызнання права супраціўлення тырану, які парушае запаведзі Бога);

4) вялікі ўплыў патронаў на кіраванне рэфармацкай царквой дазваляў ім кантраляваць рэлігійнае жыццё падданых.

У 1562–1565 гг. з кальвінісцкага лагера вылучаецца самастойная плынь, якая атрымала назву антытрынітарызм ці арыянства. Антытрынітарыі (ад грэч. anti + лат. Trinitas – Тройца) – прыхільнікі рэлігійных вучэнняў і сектаў, якія адмаўлялі адзін з асноўных дагматаў хрысціянства – дагмат пра Тройцу – «Трыадзінства Божае» (Бог-Айцец, Бог-Сын, Бог-Дух Святы). Адным з прадстаўнікоў антытрынітарызму быў С. Будны.

Рэфармацыя спрыяла пашырэнню асветы ды дабрачыннасці ў грамадстве. Пры цэрквах арганізоўваліся школы. Прычым рэфармацыйная адукацыя імкнулася выкарыстоўваць еўрапейскі педагагічны вопыт.

Разам з фарміраваннем рэфармацыйнай царквы практычна адначасова ўзнікла і рэфармацыйнае кнігадрукаванне. Так, друкарня у Берасці дзейнічала з 1553 г. да 1570 г. (было выдадзена каля 40 назваў кніг на польскай мове). Прычым тут друкавалася не толькі рэлігійная, але і свецкая літаратура. У 1563 г. убачыла свет Берасцейская кальвінісцкая Біблія. У 1561–1562 гг. С. Будны разам са сваімі аднадумцамі Л. Крышкоўскім і М. Кавячынскім арганізавалі ў Нясвіжы друкарню, дзе выйшлі першыя ў Беларусі друкаваныя творы на старабеларускай мове. З 1563 г. Нясвіжская друкарня цалкам перайшла на выпуск польска-лацінскіх выданняў.

У 1573 г. Ян Кішка арганізаваў у Лоску цэнтр арыянскага кнігадрукавання. Вядома каля 20 яе выданняў на польскай і лацінскай мовах. Друкарні для выдання арыянскіх кніг існавалі ў Любчы каля Навагародка, Заслаўі каля Менска.

У шэрагу гарадоў ды мястэчак пры храмах і манастырах дзейнічалі школы граматы, дзе ўсе жадаючыя маглі засвоіць асновы пісьма, чытання і лічэння. Шырокай папулярнасцю карысталіся вандроўныя настаўнікі, якія за грошы, а часам і проста за харчы вучылі дзяцей асновам азбукі і пісьменнасці. Працэс навучання грунтаваўся на літаразлучальным метадзе. Вяршыняй вучобы лічылася засваенне цітлаў (надрадковых знакаў, што азначалі скарочанае напісанне слоў ці лікавае значэнне літар). Засваенне азбукі спрыяла хутчэй пашырэнню прыватнай перапіскі, чым знаёмству адукаваных колаў свецкага грамадства з еўрапейскай ці антычнай літаратурнай спадчынай.

У сувязі з пранікненнем на Беларусь ідэй Адраджэння і Рэфарацыі з XVI ст. колькасць школ павялічылася, перш за ўсе за кошт пратэстанцкіх навучальных установ. Значная частка прывілеяванай моладзі вучылася ў розных вышэйшых навучальных установах Еўропы. Найбольшую папулярнасць на Беларусі меў Кракаўскі універсітэт, заснаваны ў 1364 г.

***4. Архітэктура і выяўленчае мастацтва.***

Для архітэктуры XIII–XVI стст. характэрны абарончыя збудаванні, крэпасныя комплексы і культавыя пабудовы.

У XIV–XV стст. айчыннае дойлідства пераарыентавалася з ужывання выключна візантыйскіх і мясцовых будаўнічых традыцый на выкарыстанне таксама і найбольш каштоўных здабыткаў тагачаснай заходнееўрапейскай архітэктуры. Шырокае распаўсюджанне на Беларусі набыла готыка. Найбольш тыповыя гатычныя пабудовы вылучаліся вялікай вышынёй, стромкім сілуэтам, вертыкальнымі лініямі, вузкімі стральчатымі парталамі і вокнамі з каляровымі вітражамі, высокімі вежамі.

Узросшая знешняя пагроза з боку крыжакоў і татараў патрабавала ўзвядзення ў самых важных гарадах мураваных вежаў. Будаўніцтва на Беларусі так званых "валынскіх" вежаў (пашырыліся з Заходняй Украіны) распачалося яшчэ ў апошняй чвэрці XIII ст. і працягвалася больш за два стагоддзі. Аднак даволі хутка стала зразумела, што падобныя адносна невялікія і адзінкавыя збудаванні не маглі стрымліваць крыжакоў з іх куды больш дасканалай тактыкай аблогі ("валынскія вежы" маглі быць паспяхова выкарыстаны толькі у час дробных канфліктаў паміж удзельнымі княствамі альбо пры абароне ад нападаў невялікіх татарскіх атрадаў). Гэта і паслужыла асноўнай прычынай пераходу да будаўніцтва ў найбольш стратэгічна важных месцах Беларусі цалкам мураваных замкавых комплексаў тыпу нямецкіх "кастэляў".

Беларускія "кастэлі" адрозніваліся ад крыжацкіх большымі памерамі, узводзіліся сярод балот на невялікіх пясчаных выспах, часта штучных. Беларускія замкі тыпу "кастэль" уяўлялі сабой пляцоўку, замкнёную высокімі сценамі, змураванымі з палявога каменю, і 1–2 вежамі. З найбольш небяспечных бакоў рабіліся равы, якія часта абвадняліся. Гарнізонныя памяшканні будаваліся з дрэва ва ўнутраных баках сцен. Пасярэдзіне "кастэлі" на вялікім двары выкопваліся адна або дзве студні. Мураваныя замкі тыпу "кастэляў" былі пабудаваны у XIV ст. у Лідзе, Крэве і Медніках. У канцы XIV ст. – пачатку XV ст. былі узведзены многавежавыя замкі ў Гародне, Новагрудку, Оршы. Працягвалі функцыянаваць і старыя драўляныя замкі ў Полацку, Магілеве, Мазыры, Берасці і ў іншых месцах.

Пры ўзвядзенні замкаў дамінаваў гатычны стыль. У XVI ст. замкавае будаўніцтва набыло якасна новыя рысы, што было звязана з непасрэдным уздзеяннем архітэктуры Рэнесансу. Найбольш гэта адносілася да прыватнаўласніцкіх замкаў, у якіх асноўны акцэнт абароны паступова пераносіўся на знешнія ўмацаванні. Напрыклад, Мірскі замак быў перабудаваны ў стылі рэнесансу пад загарадную княжацкую рэзідэнцыю ў 1580–1590-я гг. Ен адрозніваўся ад аналагічных сярэднявечных фартэцый выкарыстаннем шматлікага дэкору ў аздабленні фасадаў.

У другой палове XII ст. адбыўся заняпад Полацкай і Гродзенскай школ дойлідства. У выніку больш за сто год на беларускіх землях увогуле не ўзводзіліся мураваныя храмы. Толькі напрыканцы XIII ст. становішча пачало змяняцца. У Берасці і Камянцы адначасова з узвядзеннем "валынскіх" вежаў былі пабудаваны праваслаўныя цэрквы. На жаль, гэтыя храмы не захаваліся. Галоўная адметнасць культавай архітэктуры Беларусі таго перыяду заключалася ў тым, што візантыйскія традыцыі саступалі месца заходнееўрапейскім.

Новым этапам у мураваным храмавым дойлідстве Беларусі можна лічыць канец XIV–XV стст., калі ў Беларусі з'явіўся шэраг храмаў, пабудаваных у гатычным стылі (Марыінскі касцёл у Гродна, Троіцкі касёл у в. Ішкалдзь, касцёлы ў в. Уселюб і ў Іўі). Акрамя бязвежавых культавых пабудоў, у канцы XV – першай палове XVI ст. узводзіліся чатырох-пяцівежавыя цэрквы-крэпасці. Гэтыя інкастэляваныя храмы ўзніклі ў сувязі з ускладненнем міждзяржаўных адносін, пашырэннем міжусобных сутычак паміж феадаламі, ростам класавай барацьбы. Цэрквы, касцелы, кляштары і манастыры сталі набываць элементы абарончых збудаванняў: сцены былі высокія і тоўстыя, па вуглах будынкаў ці над уваходам ставіліся баявыя вежы з байніцамі, уваходы дадаткова засцярагаліся бабінцамі, каванымі дзвярыма, пад'ёмнымі кратамі-чэрсамі. Вокны такіх храмаў былі вузкія, байніцападобныя, размяшчаліся высока над зямлёй.

У храмах быў выразны падзел унутранай прасторы на фартыфікацыйную і культавую часткі. Адным з першых умацаваных храмаў на Беларусі быў Полацкі Сафійскі сабор, перабудаваны на мяжы XV–XVI стст. у 5-вежавы храм-замак. Аналагічнымі абарончымі храмамі былі Супрасльская царква-крэпасць, Сынкавіцкая царква-крэпасць, Мураванкаўская (Маламажэйкаўская) царква-крэпасць. Такім чынам, аднаўленне мураванага культавага дойлідства ў Беларусі не прывяло да простага капіравання ўжо існуючай архітэктурнай спадчыны. У выніку сінтэзу готыкі з візантыйскімі традыцыямі ў Беларусі з'явіўся унікальны для еўрапейскага дойлідства тып цэркваў-крэпасцей.

У жывапісе пераважаў іканапісны стыль. Паступова у іканапіс пранікалі гатычныя традыцыі, якія праяўляліся ў ломкай лініі, якой мадэліраваліся рысы твара і рук, кінутым у бок позірку, выцягнутым сілуэце і ў выразным рытме складак адзення. З пачатку XVI ст. пад уплывам рэнесансных павеваў у іканапісных творах персанажы ўсё часцей надзяляліся індывідуальнымі рысамі, у сюжэце з'яўляліся элементы бытавога, этнаграфічнага характару.

Пад уплывам заходнееўрапейскага мастацтва зарадзіўся ў Беларусі і свецкі фрэскавы партрэт. Адметнымі рысамі яго сталі "застылыя", амаль безжыццёвыя твары персанажаў, што практычна цалкам адпавядала іканапіснай традыцыі. У XV ст. партрэт перастае належыць да твораў манументальнага жывапісу і паступова набывае самастойнае значэнне. У пачатку XVI ст. у беларускім мастацтве стаў праяўляцца

Рэнесанс. Рэнесансавы партрэт імкнуўся дакладна перадаць індывідуальнасць персанажаў. Увогуле шырокае распаўсюджанне партрэта прыходзіцца на XVI ст. Значнае месца ў партрэтах стала адводзіцца і прадметам абсталявання. Магнаты, буйная шляхта і багатыя мяшчане пачалі збіраць карціны.

Развіццё гравюрнага мастацтва ў Беларусі звязана з дзейнасцю Ф. Скарыны. У яго кнігах змешчана значная колькасць гравюр, дзе цесна перапляталіся гатычныя і рэнесансавыя традыцыі. Сярод гравюр сустракаліся не толькі партрэты, але і гарадскія краявіды, біблейскія сюжэты. У XIV–XVI стст. назіраўся росквіт кніжнай мініяцюры.

Развіццё скульптуры ў стылі рэнесансу пачалося толькі ў канцы XVI ст. Скульптары імкнуліся паказаць індывідуалізм персанажа і дакладныя формы яго фігуры, удзялялі ўвагу бытавым абставінам. Якасна новым напрамкам развіцця скульптуры было з'яўленне надмагілляў. Паспяхова развівалася і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. У разглядаемы перыяд узнікае беларускі лялечны тэатр – батлейка. Такім чынам, пад уздзеяннем ідэй Рэнесанса і Рэфармацыі адбыліся пэўныя змены ва ўсіх відах мастацтва.

### ***Літаратура***

1. Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. / М.П. Касцюк, У.Ф. Ісаенка, Г.В. Штыхаў[і інш.]. – Мн.: Беларусь, 1994. – Ч. 1. – 1994. – С. 178–191.

2. Тарасаў, К. Памяць пра легенды: постаці беларускай мінуўшчыны. – Мінск: Полымя, 1994. – С. 105–110.

3. Лыч, Л. Гісторыя культуры Беларусі / Л. Лыч, У. Навіцкі. – Мн.: Экаперспектыва, 1996. – С. 18–49.

4. Ковкель, И.И. История Беларуси с древнейших времен до нашего времени / И.И. Ковкель, Э.С. Ярмусик. – Мн.: Аверсэв, 1998. – С. 36–44.

5. Гісторыя Беларусі: падруч. у 2 ч. / Пад рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля. – Мн.: Выш. шк., 2003. – Ч. 1: Ад старажытных часоў – па люты 1917 г. / Я. Новік, Г. Марцуль, І.Л. Качалаў [і інш.]; пад рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля. – 2003. – С. 142–161.

6. Парашкоў, С.А. Гісторыя культуры Беларусі. – Мн.: Бел. навука, 2004. – С. 51–130.

7. Козел, А.А. Философская мысль Беларуси: учеб. пособие. – Мн.: Амалфея, 2004. – С. 63–135.

8. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / Пад рэд.: М.Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн.: Экаперспектыва, 2000–2008. – Т. 2: Беларусь у перыяд Вялікага Княства Літоўскага / Ю. Бохан [і інш.]; пад рэд.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.] – 2008. – С. 567–637.

9. Новік Я.К., Качалаў И.Л., Новік Н.Я. Гісторыя Беларусі. Ад старажытных часоў – па 2008 г.: вучэб. дапам. / Пад рэд. Я.К. Новіка. – Мн.: Выш. школа, 2009. – С. 97–103.

10. Кавалева, Н.М. Гісторыя Беларусі (у кантэксце сусветных цывілізацый): выбраныя лекцыі / Н.М. Кавалёва, М.В. Стралец, Л.Ю. Малыхіна. – Брэст, 2007. – С. 31–38.

# РАЗДЗЕЛ II. ЦЫВІЛІЗАЦЫЙНАЯ СПАДЧЫНА НОВАГА ЧАСУ І БЕЛАРУСЬ

## Тэма 4. Культура беларускіх земляў у складзе Рэчы Паспалітай (1569-к. XVIII ст.)

1. Асвета і навука.
2. Літаратура.
3. Архітэктура.
4. Тэатр і музычная культура.
5. Выяўленчае мастацтва.
6. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва.

***Асветніцтва*** – ідэйны рух у еўрапейскай культуры XVII—XVIII стст., у аснове якога ляжала ўяўленне аб важнасці ролі адукацыі, навукі і розуму ў жыцці асобы. На Беларусі распаўсюдзілася ў другой пал. XVIII – пач. XIX стст.

***Базыльяне*** – манахі адзінага ўніяцкага ордэна Св. Васілія. Дзейнасць гэтага ордэна актывізавалася на Беларусі пасля заключэння Брэсцкай царкоўнай уніі 1596 г. Мелі манастыры і школы, якія былі скасаваны расійскімі ўладамі ў сяр. XIX ст.

***Барока*** – стыль у мастацтве XVI—XVIII стст., які вызначаўся пышнасцю і велічнасцю, дынамізмам у трактоўцы мастацкіх вобразаў. Праявіўся на беларускіх землях у канцы XVI ст. у архітэктуры. Пазней пранік у іншыя віды мастацтва – музыку, дэкаратыўна-прыкладное, тэатр і літаратуру.

***Езуіты*** – манахі каталіцкага ордэна "Таварыства Ісуса", які быў створаны ў 1534 г. для барацьбы з Контррэфармацыяй. На Беларусі займаліся ў асноўным арганізацыяй і ўтрыманнем навучальных устаноў (калегіумаў).

***Калегіум*** – сярэдняя навучальная ўстанова ў ВКЛ.

***Класіцызм*** – стыль у мастацтве XVII—XIX стст., асновай якога стала выкарыстанне антычных вобразаў і прынцыпаў. Характэрызуецца сіметрыяй, яснасцю і прастатой прапорцый, увасабляў грамадскія гераічныя і маральныя ідэалы.

Культура беларускіх земляў у XVI—XVIII стст. адлюстравала шматлікія і разнастайныя працэсы, якія адбываліся ў еўрапейскай культуры ў цэлым. Перадавыя ідэі таго часу рабілі свой уплыў і на развіццё сістэмы адукацыі, архітэктуру, літаратуру, тэатр і выяўленчае мастацтва беларускіх зямель.

### *1. Асвета і навука.*

Да канца XVII ст. большасць школ апынулася ў руках розных каталіцкіх манаскіх ордэнаў, галоўным з якіх быў ордэн езуітаў. У многіх буйных гарадах у тыя часы магнаты адкрывалі езуіцкія калегіумы, якія на той час лічыліся перадавымі навучальнымі ўстановамі. Значнымі цэнтрамі езуіцкай адукацыі былі Полацк, Нясвіж, Орша, Бабруйск, Брэст, Пінск, Віцебск, Гродна і іншыя гарады. Гэтыя школы і калегіумы вялі заняткі на лацінскай мове, большасць прадметаў мела дачыненне да багаслоўя. Найлепшую адукацыю ў ВКЛ давала Віленская езуіцкая акадэмія. Езуіцкія манастыры і калегіумы былі значнымі культурнымі цэнтрамі таго часу – пры іх існавалі медыцынскія ўстановы, прыюты, школьныя тэатры. Езуіты адкрылі першыя на Беларусі аптэкі – у Пінску (1561 г.) і Брэсце (1566 г.)

Уніяцкі ордэн базыліян таксама меў свае школы, якія давалі адукацыю, ў тым ліку і на роднай мове. У сярэдзіне XVIII ст. базыліянскія школы працавалі ў Навагрудку, Мінску, Полацку, Пінску, Віцебску, Брэсце, Ружанах і іншых гарадах. Праваслаўныя вернікі пасля Брэсцкай царкоўнай уніі аб'ядноўваліся ў праваслаўныя царкоўныя брацтвы, якія апекаваліся царкоўнымі справамі, школамі, прыютамі, займаліся друкам неабходнай літаратуры. Навучанне ў брацкіх школах вялося на царкоўнаславянскай або беларускай мовах. Паступова старабеларуская мова была выцеснена з афіцыйнага ўжытку, яе месца заняла польская.

Перамены ў сацыяльна-культурным жыцці Рэчы Паспалітай другой паловы XVIII ст. патрабавалі новых падыходаў да арганізацыі сістэмы адукацыі. У 40-я гг. XVIII ст. польскі асветнік Станіслаў Канарскі правёў рэарганізацыю навучання ў школах каталіцкага ордэна піяраў. Навучанне ў школе стала бясплатным, працягвалася 6 гадоў, сярод вучняў былі прадстаўнікі розных саслоўяў, нават сялян. Акрамя багаслоўя ў піярскіх школах сталі выкладаць матэматыку, фізіку, гісторыю, палітыку і польскую мову.

У 70- гг. XVIII ст. была праведзена шырокая рэформа у галіне адукацыі. Па ініцыятыве магната І. Храптовіча пачала дзейнічаць Адукацыйная камісія (1773-1794 гг.), якая фактычна стала першым у гісторыі Еўропы міністэрствам адукацыі. Адной з мэт дзейнасці камісіі стала вывядзенне адукацыі з-пад уплыву каталіцкай царквы. Камісія пачала падрыхтоўку свецкіх настаўнікаў, на тэрыторыі Беларусі адкрыла 20 акруговых і падакруговых школ. Гэтыя рэформы значна палепшылі якасць навучання, якое наблізілася да рэалій тагачаснага жыцця. Ніжэйшай ступенню новай сістэмы адукацыі сталі прыхадскія вучылішчы, дзе выкладаліся геаметрыя, ветэрынарыя, пачаткі прафесійна-вытворчай дзейнасці. У сярэдніх школах вучні знаёміліся з фізікай, матэматыкай, земляробствам, батанікай і іншымі прадметамі.

Паспяховаму ходу рэформы і дзейнасці Адукацыйнай камісіі садзейнічала скасаванне ў 1773 г. ордэна езуітаў, школы і маёмасць якога сталі асновай новай сістэмы адукацыі. Існавалі і іншыя ўстановы адукацыі: у 1775-1781 гг. у Гродна дзейнічала Вышэйшая медыцынская акадэмія.

Развіццё сістэмы адукацыі прывяло да добрых вынікаў у навуцы. Адным з самых цікавых вучоных XVII ст. з'яўляўся вынаходнік Казімір Семяновіч (каля 1600-1651 гг.), які ў 1650 г. ў Амстэрдаме надрукаваў кнігу на лацінскай мове "Вялікае мастацтва артылерыі". У гэтым творы Семяновіч выклаў свае ідэі па праблемах артылерыі, піратэхнікі, выказаў многія перадавыя ідэі па канструяванню ракет.

У Гродзенскім павеце нарадзіўся Марцін Пачобут-Адляніцкі (1728-1810 гг.) – вядомы астраном эпохі Асветніцтва, дырэктар Віленскай астранамічнай абсерваторыі. Першае гістарычнае даследаванне па гісторыі ВКЛ "Гісторыі Літвы" было напісана Альбертам Каяловічам (1609-1677). Нясвіжскі майстар гадзіннікаў Е. Якабсон сканструяваў элементарную вылічальную машыну, якая магла вылічаць, складваць, памнажаць і дзяліць. Гэты твор механікі зараз захоўваецца ў музеі імя М.В. Ламаносава ў Санкт-Пецярбургу.

### *2. Літаратура.*

Адметныя працэсы адбываліся ў літаратуры, якая набывала ўсё больш свецкі характар, адчувала на сабе ўплыў стылю барока і ідэй Асветніцтва. Кніжная старабеларуская мова паступова здавала пазіцыі, саступаючы месца больш жывой гутарковай мове. Аднак умовы для развіцця беларускай мовы не былі спрыяльнымі –

пад націскам паланізацыі яна паступова выцяснялася з афіцыйнага ўжытку. Часам стваралiся двухмоўныя творы: беларуска-украінскія, беларуска-польскія. Умоўна развіццё літаратуры на Беларусі ў гэты час можна аднесці да двух перыядаў. У другой палове XVII ст. – 40-х гг. XVIII ст. яна знаходзілася пад уплывам барока. Другі перыяд пачаўся з 50-х гг. XVIII ст., і галоўнай яго асаблівасцю з'яўляецца праяўленне рысаў класіцызму і сентыменталізму.

Беларускае барока было цесна звязана з ідэямі Контррэфармацыі. У творах стылю барока містыка бярэ верх над розумам, ім характэрны песімізм і анархічныя ідэі. Аднак барока сінтэзавала ў сабе кніжныя і народныя традыцыі, што надавала яму нацыянальныя асаблівасці. Беларускае барока вылучалася тым, што пераварыла ў сабе каталіцкую і праваслаўную духоўныя традыцыі, развівалася на своеасаблівым культурным і рэлігійным "пагранiччы". Барочнае мастацтва імкнулася ўздзейнічаць на слых і зрок чалавека, паражаць яго знешняй пышнасцю, мудрагелістасцю.

Сярод вышэйшага духавенства і магнатэрыі была пашырана духоўная паэзія, якая стваралася на лацінскай, польскай, стараславянскай мовах. Лепшымі прадстаўнікамі гэтага накірунку літаратуры з'яўляюцца Сімяон Полацкі (1629-1680 гг.) і Андрэй Белабоцкі (жыў у другой палове XVII ст.). Творчасць гэтых аўтараў належыць да гісторыі як беларускай, так і рускай літаратур. Іх творам характэрна падкрэсленая эмацыянальнасць, гіпербалізацыя пачуццяў, культ духоўнага і прыніжэнне цялеснага бакоў жыцця чалавека.

С. Полацкі ў сваіх творах уздымаў шматлікія праблемы таго часу. Ён смела выказвае свае парады рускаму цару, пры двары якога панавалі даволі жорсткія норавы, а крытыка магла вярнуцца апалай:

Мало есть правды царю мудру быти
И подчинённых мудрости лишити...
Вели и рабом мудрости искати,
И того тебе будут роботати...
От искусных муж ищи совета
И от разумных вопроси ответа.
Милостив буди, и скор оставляти,
Косен казнити, а готов слушати...

У прадмове сваёй кнігі "Рифмологион, или Стихослов" С. Полацкі прыгадвае гады маладосці і навучання, тлумачыць, што ёсць розніца паміж яго роднай мовай і кніжнай:

Писах в начале по языку тому,
Иже свойственный бе моему дому.
Таже увидев многу пользу быти,
Словенскому ся чисту учити.

Грамадска-філасофская лірыка таго часу мела больш свецкі і дэмакратычны характар. У ёй знайшлі адлюстраванне перажыванні чалавека зямнога, які задумваецца аб пытаннях сацыяльнай няроўнасці, шчасця і нядолі, дабра і зла. Філасофская лірыка ў якасці галоўных маральных вартасцей прапаноўвае не багацце і знатнае паходжанне, а працавітасць і сумленнасць. Барочная лірыка заклікае берагчы тое, чым чалавек валодае на зямлі.

Не всегды зіма бывае,
по ночі дзень наступае.
Не всегды пёруны біют
і ветры зімные вьют.
На весну клён заквітае,
хоць в осень ліст опадае.
Хоць солньце в хмуру заходіт,
Еднакжэ по небе ходіт.

Новай з'явай для беларускай літаратуры стала песенна-інтымная лірыка, якую стваралі шкаляры і вандроўныя музыканты. Яна мела свецкі характар і была прапулярнай у дамах гараджан і шляхты. Асноўнай тэмай гэтых твораў стала каханне, якое трактавалася як натуральнае права чалавека. Часта песні гэтыя стылізаваліся пад народныя, таму мелі адпаведны ім настрой і мову.

Ідэі Асветніцтва праявіліся ў літаратуры сярэдзіны XVIII ст. Гэтая эпоха ставіла перад літаратурай новую задачу – сфарміраваць грамадзяніна і патрыёта. Вырашэнню гэтай задачы больш падыходзіў стыль класіцызма, які ўзнік у Францыі ў XVII ст. Асноўнай мовай у літаратуры на беларускіх землях стала польская. Тут нарадзіліся ці жылі многія прадстаўнікі польскай літаратуры класіцызму: Ю. Нямцэвіч, А. Нарушэвіч, Ф. Карпінскі і іншыя.

### *3. Архітэктура*

На пачатку XVII ст. большасць беларускіх гарадоў былі абнесены каменнымі мурамі, валамі і вежамі. Цэнтрам горада была гандлёвая плошча, вакол якой узводзіліся культавыя і грамадскія пабудовы. Увядзенне ў гарадах магдэбургскага права патрабавала асобнага будынка для паседжанняў магістрата – ратушы, якія сталі ўзнікаць у многіх гарадах: Магілёве, Нясвіжы, Брэсце, Віцебску. Палацава-замкавая архітэктура другой паловы XVI ст.– пачатку XVII ст. знаходзілася пад уплывам фламандскай і нідэрландскай архітэктуры. Часта іх праектавалі і будавалі замежныя архітэктары і інжынеры. Асабліва гэты ўплыў адчуваецца ў Гальшанскім замку, збудаваным у пачатку XVII ст.

Уплыў Рэнесенсу паступова пазбаўляў будынкі таго часу абарончай функцыі. У 1580 г. была перабудавана любімая рэзідэнцыя караля Стэфана Баторыя – Стары замак у Гродна. Італьянскі архітэктар Скота надаў яму рэнесансныя рысы. Дасягненні італьянскай фартыфікацыі адлюстраваліся ў самым знакамітым палацава-замкавым комплексе таго часу – палацы кн. Радзівілаў у Нясвіжы.

У 1584 г. на сродкі кн. Мікалая Радзівіла па мянушцы Сіротка пачалося будаўніцтва езуіцкага касцёла ў Нясвіжы. Архітэктарам гэтага храма стаў італьянец Ян Марыя Бернардоні, які спраектаваў гэты будынак – першы ў стылі ранняга барока на тэрыторыі ўсёй Усходняй Еўропы. Узорам для Бернардоні стаў храм Іль Джэзу ў Рыме. Паступова барока распаўсюджваецца па ўсёй тэрыторыі Беларусі. У гэтым стылі былі пабудаваны многія найпрыгажэйшыя помнікі архітэктуры – палац Сапегаў у Ружанах, Радзівілаў у Нясвіжы, фарны касцёл у Гродна і многія іншыя.

Найвышэйшага росквіту стыль барока (так званае віленскае барока) перажыў у творчасці архітэктара І. Глаўбіца, які пабудаваў на Беларусі шмат храмаў. Самыя знакамітыя з іх – касцёлы ў Сталовічах і Лідзе, Спаская царква ў Магілёве. Глаўбіц быў адным з аўтараў праекта перабудовы полацкага Сафійскага сабора, які таксама набыў рысы барока.

XVIII ст. стала перыядам бурнага будаўніцтва і росквіту г. Гродна. За кароткі адрэзак часу тут былі пабудаваны дзесяткі прыгожых будынкаў – тэатральна-музычная школа, гасцініца, рэстаран, палац, мануфактуры, цэлы новы раён Гарадніца. Гродна пераўтварыўся ў вялікі культурны і прамысловы цэнтр, які саступаў толькі сталічнай Вільні. Гэтыя пераўтварэнні былі звязаны з дзейнасцю магната, палітычнага дзеяча і мецэната Антонія Тызенгауза (1733-1785), які актыўна запрашаў у горад таленавітых людзей – архітэктара Дж. Сака, медыка Ж. Жылібера і многіх іншых.

Значнымі культурнымі цэнтарамі таго часу станавіліся прыватныя магнацкія гарады, дзе на грошы іх гаспадароў узводзіліся храмы розных канфесій, друкарні, тэатры, навучальныя ўстановы, палацы. Сярод іх неабходна адзначыць замкі ў Нясвіжы, Любчы і Ружанах.

***4. Тэатр і музычная культура.***

У рэчышчы барока нарадзіліся і першыя беларускія драматычныя творы, якія ствараліся для школьных пастановак. Паміж дзеяннямі ў польскамоўных і лацінскіх творах уводзіліся невялікія сцэнкі-інтэрмедыі на беларускай мове. Героі гэтых сцэнак паходзілі з народа, таму размаўлялі на зразумелай гледачам мове. Часта сцэнкі былі напісаны самімі вучнямі. Першы вядомы нам твор, дзе адзін з герояў размаўляе па-беларуску – інтэрмедыя Каспара Пянткоўскага "Цімон Гардзілюд". Гэтая п'еса была пастаўлена ў Вільні ў 1584 г. з нагоды пачатку навучальнага года. Над галоўным героям, філосафам Гардзілюдам насмяхаецца малады швец, які гаворыць "па-русінску". З XVII ст. паходзіць драматычны твор "Чорт і яго хлопцы, селянін, яўрэй" (больш вядомы як "Чорт Асмалейка"). Камедыя распявядае аб хваробе чорта, якога ўзяўся вылечыць просты селянін. Твор цалкам адпавядае стылістыцы барока, пры гэтым разлічаны на простага, непатрабавальгага гледача.

У канцы XVII ст. была напісана польская драма "Духоўнае прычасце святых Барыса і Глеба". Антыпралог, пралог і інтэрмідыйныя сцэнкі да гэтага твора былі створаны на беларускій мове і таксама маюць камедыйны характар. Драма пачынаецца размовай полацкага рамесніка з селянінам, які прыйшоў у горад. Усё дзівіць селяніна і падаецца незразумелым. Рамеснік ганарыцца вучонасцю свайго сына, які вучыцца ў езуіцкім калегіуме. Селянін бачыць станоўчыя рысы ў іншым:

Так, суседзе, і нам Бог даў добрага сына,
Так жэ то розкошна нам розумна дзеціна.
Год тулько мает, южэ з огорода гоніт
Свіне і хоць бохон озме хлеба, не уроніт.

Селянін і рамеснік выступаюць тут і як носьбіты тагачаснай маралі. Яны крытыкуюць сялян, што не ходзяць у касцёл, высмейваюць модніц, што фарбуюць вусны і абмахваюцца веерамі.

У XVIII–пачатку XIX стст. на беларускіх землях дзейнічалі прыватныя тэатры пры дварах буйных магнатаў. Сустракаліся два тыпы такіх тэатраў. Маёнткавы тэатр быў закрытым, трупа пераважна складалася з аматараў, мастацкі ўзровень спектакляў быў не вельмі высокім. Гарадскі (або местачковы) тэатр адрозніваўся больш дасканалым узроўнем выканання, у ім ігралі прафесійныя акцёры. Тэатр гэты быў адкрытым, яго наведвалі гараджане і дробная шляхта.

Першы прыватны тэатр з'явіўся ў 1740 г. у Нясвіжы. Жонка гаспадара знакамітага палаца Уршуля Францішка Радзівіл пісала п'есы для пастаноўкі на яго сцэне. Галоўнай тэмай яе твораў "Каханне – зацікаўлены суддзя", "У вачах нараджаецца каханне", "Дасціпнае каханне", "Адпачынак пасля клопатаў" з'яўляюцца чалавечыя пачуцці. Звычайна цэнтральнай фігурай гэтых п'ес была жанчына, якая аддана кахае свайго мужа, даруючы яму яго праступкі. Францішка Уршуля з'ўлялася аўтаркай першых перакладаў п'ес Мальера на польскую мову. Гэтыя творы таксама ставіліся на сцэне нясвіжскага тэатра. Аўтарка брала для сваіх камедый, трагедый і опер вядомыя літаратурныя або казачныя сюжэты, якія яна творча перапрацоўвала.

У 1747-1748 гг. на замкавым двары быў пабудаваны спецыяльны "камедыяхауз", дзе ставіліся спектаклі. У прадмесці Нясвіжа Альбе пад адкрытым небам і ў палацы "Кансаляцыя" таксама глядзелі пастаноўкі. Спектаклі нясвіжскага тэатра Радзівілаў ладзіліся на польскай, італьянскай, нямецкай і французскай мовах. Пры тэатры дзейнічала музычная, вакальная і балетная школы. Акцёрамі былі спецыяльна запрошаныя іншаземцы і прыгонныя сяляне Радзівілаў. У тэатры працавалі і творцы з сусветная славай – кампазітары Я. Д. Голанд і Дж. Альберціні, балетмайстар Л. Дзюпрэ.

Прыватныя тэатры ў сваіх уладаннях мелі Геранім Фларыян Радзівіл у Слуцку, П. Зорыч у Шклове, А. Тызенгауз у Гродна, Сапегі ў Ружанах, М.К. Агінскі ў Слоніме і многія іншыя. Пасля закрыцця прыватных тэатраў многія іх артысты пераходзілі ў трупы сталічных тэатраў Пецярбурга, Масквы і Варшавы, што сведчыць аб іх вялікім таленце і прызнанні.

### *5. Выяўленчае мастацтва.*

Рысы барока пранікі ў выяўленчае мастацтва значна пазней, чым у архітэктуру, і праявіліся каля сярэдзіны XVII ст. Найлепшыя творы беларускага мастацтва прадстаўляюць роспісы культавых збудаванняў і скульптура рэлігійнай тэматыкі. Творы скульптуры ў стылі барока ўпрыгожваюць інтэр'ер касцёла аўгусцінцаў у в. Міхалішкі Астравецкага раёна, касцёл францысканцаў ў Пінску. Спецыфічнай рысай беларускага мастацтва гэтага перыяду з'ўляецца спалучэнне дзвюх мастацкіх традыцый, якія здаўна тут панавалі: візантыйска-старажытнарускай і заходнееўрапейскай.

Біблейскія сюжэты ў жывапісе набываюць жанравасць. Складваюцца новыя мясцовыя падыходы да трактоўкі вобраза Маці Божай. Асобнае месца ў іканапісе беларускіх земляў 40-х гг. XVII ст. займае Пётр Еўсеевіч з Галынца. У 1649 г. ён стварыў адну з лепшых сваіх ікон – "Нараджэнне Багародзіцы". Гэты твор адлюстроўвае некаторыя рысы прыватнага жыцця сярэдніх гарадскіх слаёў Магілёўшчыны таго часу – за акном відаць архітэктурны пейзаж, у іконе прысутнічаюць прадметы побыту.

Шырокае распаўсюджанне атрымалі разныя драўляныя пазалочаныя іканастасы (так званая "беларуская рэзь"). Да найлепшых прыкладаў мастацтва гэтага часу традыцыйна адносяць іканастасы Мікалаеўскай царквы ў Магілёве (1669) і Смаленскім саборы Новадзевічага манастыра ў Маскве (1685). Творы "беларускай рэзі" з'явіліся ў Расіі ў выніку ваенных дзеянняў паміж Рэччу Паспалітай і Расійскай дзяржавай другой паловы XVII ст., калі тысячы беларускіх ювеліраў, мастакоў, будаўнікоў і рэзчыкаў эмігрыравалі ў Маскву і іншыя расійскія гарады, дзе актыўна працаваі і ўнясці значны ўклад у развіццё мастацтва.

У выніку перабудовы касцёла езуітаў у Нясвіжы у сяр. XVIII ст. тут былі створаны ўнікальныя фрэскі, якія адносяцца да залатога фонду беларускага барока. Роспісы нясвіжскага касцёла спалучаюць у сабе два накірункі італьянскага манументальнага мастацтва XVIII ст.: рымскую традыцыю выкарыстання квадратуры (архітэктура малявалася ў складаных ракурсах) і балонскую традыцыю дэкаратыўна-арнаментальнага характару жывапісу. Аўтар большасці роспісаў – мастак Ксаверы Дамінік Гескі прызнаны заснавальнікам нацыянальнай школы манументальнага жывапісу ў Рэчы Паспалітай. Роспісы былі створаны ў 1750-1753 гг. мастацкім калектывам з васьмі прыдворных жывапісцаў, вядучую ролю сярод якіх адыгрываў Гескі. Італьянскі дойлід Маурыцы Падэці быў аўтарам архітэктурнай перабудовы інтэр'ера, алтароў і перспектыўнага размяшчэння жывапісу на зводах касцёла. На кампазіцыю нясвіжскіх фрэсак і іх стыль паўплывалі гравюры П.П. Рубенса. Фрэскі ў нясвіжскім касцёле езуітаў дэманструюць цесную сувязь мясцовага мастацтва з заходнееўрапейскімі традыцыямі эпохі барока.

У 1765 г. мастак Павел Пятроўскі распісаў інтэр'ер касцёла Св. Станіслава ў Магілёве. Роспісы гэтыя прадстаўляюць узор характэрнага для барока сінтэзу стыляў. У сюжэтах фрэсак мастаком арыгінальна выкарыстаны гарадскі пейзаж, тыпы гараджан другой паловы XVIII ст., падзеі мясцовай гісторыі.

Свецкі жывапіс значна пашырае сваю тэматыку і жанравую разнастайнасць. У гэты час сталі папулярнымі новыя для беларускага мастацтва жанры – нацюрморт, гістарычны і батальны. Аднак вядучым жанрам становіцца партрэт.

Галоўнымі героямі патрэтаў і гістарычных карцін былі дзяржаўныя дзеячы, прадстаўнікі шляхты і духавенства. Часцей за ўсё такія творы ствараліся для ўпрыгожання каралеўскіх і магнацкіх палацаў. У Ніжнім замку Вільні была створана вялікая і цікавая калекцыя твораў мастацтва Заходняй Еўропы, сярод якіх сустракаліся працы М. Караваджа і мастакоў школы Тыцыяна. Звесткі пра тагачасных мясцовых мастакоў рэдкія і разрозненыя. Дакументы захавалі для нас імёны мастакоў XVI ст. Тамаша і Неваша з Брэстчыны, Антонія з Вільні і нямногіх іншых.

Традыцыя напісання парадных партрэтаў трапіла на Беларусь з Заходняй Еўропы, дзе фламандскімі і іспанскімі мастакамі былі закладзены асновы гэтага жанра. Асаблівасць жывапісу Рэчы Паспалітай стала выпрацоўка канонаў "сармацкага партрэту". Асновай паняцця "сарматызм" стаў міф аб паходжанні шляхты Рэчы Паспалітай ад старажытнага племені сарматаў, якое вылучалася ваяўнічасцю. Польскі сярэдневечны храніст Ян Длугаш упершыню ўвёў ва ўжытак гэтую тэрміналогію. Паступова паняцце "Сарматыя" сталі суадносіць з дзяржавай Ягелонаў. Сарматызм як рыса шляхецкай культуры праявіўся ва ўсіх сферах жыцця гэтага грамадскага слоя – быце, манеры апранацца, этыкеце, адносінах да іншых саслоўяў, мастацкіх густах.

Элементам сарматызму стала цікавасць да ўсходняй культуры, чаму спрыялі кантакты з Турцыяй, Татарскім ханствам і Масковіяй. Арыентальныя матывы пранікалі ў афармленне сядзібаў, аздабленне зброі, тэатральныя відовішчы, касцюм. Актыўна распаўсюджваліся янычарскія аркестры. Найбольшага росквіту дасягнуў парадны – "сармацкі" партрэт. Характэрнай рысай кожнай магнацкай рэзідэнцыі сталі галерэі партрэтаў продкаў і знакамітых асоб, якія павінны былі дэманстраваць багацце рода, яго старадаўняе і высакароднае паходжанне. Да такіх партрэтаў меліся наступныя патрабаванні – выява павінна была быць падобнай на прататып, мець рэальную

атрыбутыку. Пышнасць сармацкага барока праглядалася і ў традыцыі падпісвання на партрэце ўсіх званняў і тытулаў асобы. З партрэтаў эпохі сарматызму глядзяць на нас асобы ўплывовыя, актыўныя, чые ўчынкі і меркаванні клаліся ў аснову грамадска-палітычнага жыцця краіны. Сярод сармацкіх партрэтаў сустракаюцца выявы Ю. Радзівіла, Г. Сапегі, А.К. Завішы і многія іншыя. Цікавая калекцыя гэтых партрэтаў захоўваецца ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі.

У сувязі з развіццём кнігадрукавання пашыраецца кніжная гравюра. У 1613 г. нясвіжскі гравёр Тамаш Макоўскі надрукаваў у Амстэрдаме карту ВКЛ, на якую былі нанесены населеныя пункты, рэкі і азёры. Макоўскі стварыў гравюры з відамі многіх гарадоў – у тым ліку Масквы, Вільні, Нясвіжа і Клецка. Большая частка са 160 графічных партрэтаў прадстаўнікоў рода кн. Радзівілаў, сабраных у альбоме "Выявы сям'і Радзівілаў адпаведна арыгіналаў" былі створаны гравёрам Г. Лейбовічам. Гэты альбом быў надрукаваны ў нясвіжскай друкарні ў 1758 г.

***6. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва.***

Замкі і палацы магнатаў, цэрквы і касцёлы ўпрыгожваліся не толькі скульптурай і творамі жывапісу. Асобную ролю ў інтэр'еры адыгрывалі творы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Сусветную вядомасць атрымала прадукцыя Слуцкай мануфактуры паясоў, заснаванай у 1758 г. М.К. Радзівілам. Гэта былі ўнікальныя тканыя вырабы з шаўковых, залатых і срэбных ніцяў. Штогадова мануфактура выпускала каля 200 паясоў, які дорага каштавалі і цаніліся як творы мастацтва. Цэнтрамі вытворчасці такіх паясоў сталі таксама Нясвіж, Гродна і Ружаны. Паясы – неад'емны атрыбут сармацкага касцюма, сімвал багацця і знатнасці таго, хто яго насіў. У беларускіх музеях захоўваюцца толькі адзінкавыя экзэмпляры, большасць з іх апынулася за мяжой.

***Літаратура***

1. Баженова, О.Д. Радзивилловский Несвиж. Росписи костёла Божьего Тела. – Мн.: Харвест, 2007. – 416 с.

2. Гісторыя Беларусі: У 6 т. Беларусь у часы Рэчы Паспалітай (XVII – XVIII стст.) / Ю. Бохан, В. Голубеў, У. Емельянчык [і інш.] – Мн.: Экаперспектыва, 2004. – Т. 3. – С. 66–70.

3. Гісторыя беларускай літаратуры: Старажытны перыяд: вучэб. дапам. для фак. пед. ВНУ / М.М. Грынчык, У.А. Калеснік, У.Г. Кароткі [і інш.]; пад рэд. М.А. Лазарука, А.А. Сямяновіча. – Мн.: Вышэйшая школа, 1998. – 351 с.

4. Культурология: теория и история культуры: учеб. пособие / И.Е. Ширшов, К.И. Баландин, В.В. Качановский [и др.]; под общ. ред. И.Е. Ширшова. – Мн.: БГЭУ, 2004. – С. 320–345.

5. Лакотка, А.І. Драўлянае сакральна-манументальнае дойлідства Беларусі. – Мн.: Беларусь, 2003. – 224 с.

6. Радзівіл, Ф.У. Выбраныя творы. – Мн.: Беларускі кнігазбор, 2003. – 448 с.

7. Тэатральная Беларусь: Энцыклапедыя: у 2 т. / Рэдкал.: Г.Л. Пашкоў [і інш.] Мн.: БелЭн, 2003. – Т. 2 – 576 с.

## Тэма 5. Культура беларускіх земляў у складзе Расійскай імперыі (к. XVIII- пач. XX стст.)

1. Асвета.
2. Літаратура.
3. Тэатральнае і музычнае жыццё.
4. Выяўленчае мастацтва.
5. Развіццё архітэктуры.

***Акадэмізм*** – мастацкі накірунак, які прапагандаваў класічныя ўзоры і каноны, што лічыліся ідэальнымі і непераўзыдзенымі. Назва пайшла ад слова "акадэмія", якія сталі цэнтрамі па распаўсюджанню гэтага накірунку.

***Класіцызм*** – стыль у еўрапейскім мастацтве XVII – першай паловы XIX стст., які характэрызуецца творчай перапрацоўкай антычнай ордэрнай сістэмы, строгай сіметрычнасцю кампазіцыі і формы, стрыманым дэкорам.

***Рамантызм*** – кірунак у мастацтве канца XVIII – першай чвэрці XIX стст., які адлюстраваў незадаволенасць еўрапейцаў вынікамі буржуазных рэвалюцый. Мэта жыцця рамантыкаў – дасягненне свабоды. Галоўным героям іх твораў стаў актыўны чалавек-творца, яркая і рознабаковая індывідуальнасць, які канфліктуе са сваім акружэннем.

***Эклектызм*** – накірунак у архітэктуры канца XIX – пачатку XX стст., які спалучаў у сабе элементы розных стыляў (неаготыка, неабарока, неакласіцызм, неарускі стыль і інш.)

Пасля ўваходу беларускіх земляў у склад Расійскай імперыі пачынаецца новы перыяд у развіцці беларускай культуры.

### *1. Асвета.*

Далучаныя да Расійскай дзяржавы па выніках першага падзела 1772 г. землі Рэчы Паспалітай першымі адчулі на сабе ўплыў новай палітычнай сітуацыі на развіццё адукацыі. Большасць школ па-ранейшаму ўтрымлівалі каталіцкія ордэны, аднак з 1780- х гг. у губернскіх і павятовых цэнтрах пачалі ўзнікаць рускія народныя вучылішчы. Мясцовая шляхта не спяшалася аддаваць у вучылішчы сваіх дзяцей – навучанне там вялося на рускай мове, а аб'ём ведаў, якія яны давалі, быў значна ніжэйшым, чым давалі калегіумы і прыкляштарныя школы. Асноўную масу вучняў складалі дзеці рускіх чыноўнікаў, афіцэраў, мясцовых мяшчан. Асаблівасцю вучылішчаў было навучанне разам хлопчыкаў і дзяўчынак.

У 1802 г. у Расійскай Імперыі было створана Міністэрства народнай асветы. Перад ім ставілася задача стварэння сістэмы дзяржаўнай свецкай адукацыі. Краіна была падзелена на шэсць навучальных акруг, на чале кожнай з іх сталі універсітэты. У 1803 г. на базе Галоўнай Літоўскай школы быў створаны Віленскі універсітэт, які ўзначаліў Віленскую навучальную акругу. Дзейнасць універсітэта на працягу ўсяго яго існавання вызначыла характар сістэмы адукацыі ўсяго рэгіёна. Куратарам акругі стаў асабісты сябра імператара Аляксандра I кн. Адам Чартарыйскі. Статут Віленскай навучальнай акругі ўлічваў багаты вопыт сістэмы адукацыі Рэчы Паспалітай і значна адрозніваўся ад агульнарасійскага. Асноўнай мовай навучання заставалася польская.

Прычынай гэтага стала разуменне ўладамі неабходнасці правядзення паступовых рэформ, якія б не сталі прычынай моцнай незадаволенасці шляхты. Кіраўніцтва навучальнай акругі прыступіла да ўвядзення адзіных праграм і патрабаванняў да навучальных устаноў розных тыпаў, сярод якіх былі і прыватныя. Усталявалася трохступенная сістэма народнай адукацыі – ад прыходскіх і павятовых вучылішчаў да гімназіі. Узровень выкладання ў семікласных губернскіх гімназіях быў вельмі высокі – значна перавышаў расійскія чатырохкласныя. Навучальнымі ўстановамі новага тыпу сталі ланкастанскія школы, заснаваныя на традыцыях англійскай адукацыі. Першая з такіх школ была адчынена на сродкі графа М. Румянцава ў 1819 г. у Гомелі. Паступова колькасць такіх школ павялічвалася і пераўзыйшла лічбу 20 ў 1830-я гг.

Рэфармаванне школы адмоўна сустрэлі езуіты, якія доўгі час трымалі найлепшыя ўстановы ў рэгіёне. Езуіты доўга дабіваліся ад улад надання іх установам аўтаноміі. У 1812 г. Полацкі езуіцкі калегіум атрымаў статус акадэміі з правамі універсітэта. Полацкай акадэміі падпарадкоўваліся ўсе езуіцкія школы Расійскай Імперыі. За хуткі час Полацкая езуіцкая акадэмія стала сапраўдным адукацыйным цэнтрам беларускіх земляў. Тут была вельмі багатая бібліятэка, свая друкарня, часопіс "Полацкі месячнік". У акадэміі працавалі факультэт вольных мастацтваў, моўны і тэалагічны. У розныя часы ў Полацку вучыліся многія знакамітыя людзі таго часу – мастак Вяленцій Ваньковіч, скульптар Фёдар Талстой, драматург і гісторык Нікадзім Мусніцкі, пісьменнік Ян Баршчэўскі. Аднак дзейнасць Полацкай езуіцкай акадэміі была перапынена ў 1820 г., калі з Расійскай Імперыі былі выгнаны езуіты, а іх навучальныя ўстановы перадалі іншым ордэнам. Акадэмія была перададзена даўнішнім канкурэнтам езуітаў – піярам і атрымала статус вышэйшага вучылішча.

Найбольшы ўплыў на развіццё адукацыі таго часу аказваў Віленскі універсітэт, які даваў вышэйшую адукацыю еўрапейскага тыпу. Для шляхты ён стаў сімвалам традыцый Рэчы Паспалітай. Па колькасці студэнтаў Віленскі універсітэт перавышаў нават Маскоўскі: у 1808 г. у Вільні навучалася каля 300 студэнтаў, у 1830 г. – каля 1300. Маскоўскі універсітэт налічваў у 1808 г. 160 студэнтаў, у 1830 г. – больш за 800 чалавек. Віленскі універсітэт даваў адукацыю на чатырох факультэтах – маральна-палітычных навук, літаратуры і вольных мастацтваў, фізіка-матэматычным і медыцынскім. Выкладчыкамі універсітэта ў розныя часы былі перадавыя вучоныя ў розных галінах навукі – астраном Я. Снядэцкі, натураліст А. Снядэцкі, медыкі І. Франк і Г. Балнус, мастакі Ф. Смуглевіч і Я. Рустэм, гісторыкі М. Баброўскі, І. Даніловіч, І. Лялевель і многія іншыя. Пасля паражэння паўстання 1830-1831 гг. Віленскі універсітэт, як "рассаднік вальнадумства", быў зачынены ў 1832 г. На беларускіх землях пашырылася палітыка русіфікацыі.

### *2. Літаратура.*

Мастацкая літаратура ў XIX ст. стала вядучай сферай беларускага нацыянальна-культурнага адраджэння. Пачынальнікам беларускай літаратуры ў новых умовах стаў Ян Чачот (1796-1847) – паэт, фалькларыст і драматург. Бацька Чачота быў аканомам у маёнтку графа Тызенгауза, дзе і прайшло дзяцінства будучага паэта. У юнацтве Ян Чачот вучыўся ў Навагрудскай дамініканскай школе, дзе пасябраваў з А. Міцкевічам. Адзін год ён правучыўся ў Віленскім універсітэце, аднак быў вымушаны яго пакінуць з прычыны адсутнасці сродкаў. З 1818 г. Чачот стаў членам таварыства філаматаў. Ужо ў

той час ён пісаў вершы і драматычныя сцэнкі на беларускай мове. Творчасць Чачота зрабіла вялікі ўплыў на А. Міцкевіча. На польскай мове Ян Чачот напісаў шмат твораў – балады "Свіцязь-возера", "Мышанка", "Навагрудскі замак". Асновай для гэтых твораў сталі беларускія паданні, якія аўтар ведаў з дзяцінства. Пасля выкрыцця таемных таварыстваў Чачот быў асуджаны і сасланы ў Сібір, на радзіму вярнуўся толькі праз дзесяць гадоў. У апошнія гады свайго жыцця актыўна займаўся збіральніцтвам фальклора, выдаў шэсць фальклорных зборнікаў у Вільні, дзе, акрамя 1000 песен, размясціў беларускія прыказкі і прымаўкі, невялікі слоўнік беларускай мовы.

Асновай для этнаграфічна-фальклорнай кнігі "Беларусь", якая была надрукавана ў Парыжы ў 1840 г. сталі матэрыялы, сабраныя А. Рыпінскім (1811-1900 гг.). Аўтар зрабіў агляд жанраў беларускага фальклору, прызнаваў за народнай паэзіяй "чароўную сілу". Ва ўласных паэтычных творах А. Рыпінскі таксама выкарыстоўваў беларускі фальклор.

Самым выдатным творам першай паловы XIX ст. стала кніга Яна Баршчэўскага (1794-1851) "Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях". Пры напісанні гэтага празаічнага твора былі шырока выкарыстаны беларускія народныя казкі і паданні. Кніга напісана на польскай мове, аднак на беларускім матэрыяле. Прычына гэтага крыецца ў тым, што адукаваныя людзі таго часу значна лепш размаўлялі на польскай, французскай або рускай мове, чым на беларускай. Твор на польскай мове значна хутчэй знайшоў бы свайго чытага. Аўтар тлумачыць: "Не ўсім чытачам можа быць зразумела беларуская мова, таму мясцовыя апавяданні, якія я пачуў з вуснаў народа, я вырашыў, наколькі змог, перадаць у даслоўным перакладзе па-польску".[1]

Пачынальнікам беларускай нацыянальнай драматургіі лічыцца В. Дунін-Марцінкевіч (1807-1884). У сваіх творах ён адлюстроўваў жыццё розных сацыяльных слаёў – шляхты і сялян. Значную ўвагу ён надае і гістарычнай тэматыцы ў сваіх творах "Славяне ў XIX ст." і "Люцынка, або Шведы на Літве". Аднак галоўным героем твораў становіцца селянін, яго побыт і характар. Найлепшымі творамі драматурга сталі п'есы "Сялянка" і "Пінская шляхта". Драматургія Дуніна-Марцінкевіча і ананімныя паэмы "Энеіда навыварат" і "Тарас на Парнасе" садзейнічалі фарміраванню беларускай літаратурнай мовы на аснове сярэднебеларускіх гаворак.

### *3. Тэатральнае і музычнае жыццё.*

Тэатральнае мастацтва ў XIX ст. вылучаецца ў першую чаргу новым падыходам да арганізацыі яго дзейнасці. Тэатральныя відовішчы атрымлівалі выразны камерцыйны характар. Пастаянныя тэатральныя калектывы ў пачатку XIX ст. дзейнічалі толькі ў Вільні, Гродне (тэатр С. Дзешнер) і Мінску. Аднак гэтыя калектывы вялі актыўную гастрольную дзейнасць, выступалі ў многіх павятовых гарадах і мястэчках. Рэпертуар гэтых тэатраў складаўся з п'ес французскіх (А. Дзюма-бацькі, Л. Мерсье, В. Гюго), нямецкіх (Ф. Шылер), польскіх (А. Фрэдра, Я. Ясінскі) і рускіх (Д. Ленскі, М. Някрасаў) аўтараў.

У 1802–1805 гг. у Мінску працавала трупа Мацея Кажынскага, у склад якой уваходзілі оперныя спевакі і драматычныя акцёры, таму на сцэне тэатра ставіліся самыя папулярныя на той час камедыі Г. Бецке, трагедыі Вальтэра, камічныя оперы А. Сальеры, В. Ф'яраванці, Я. Стэфані і інш. Сам М. Кажынкі меў цудоўны бас, выступаў у операх, аднак у 1805 г. ён выехаў з Мінска, каб узначаліць тэатр у Вільні.

---

[1] Гісторыя Беларусі: У 6 т. Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.) / М. Біч, В. Яноўская, С. Рудовіч і інш. – Мн.: Экаперспектыва, 2005. – Т. 4. – С.152.

У першай трэці XIX ст. спектаклі гастралёраў дэманстраваліся на польскай мове, пазней за вечар ставіліся два спектаклі – адзін на польскай, другі на рускай мовах. Пасля падаўлення паўстання 1863 г. спектаклі гучалі выключна на рускай мове.

У 1846-1847 гг. расійскі ўрад правёў тэатральную рэформу, якая заключалася ў забароне вандроўных труп і заснаванні пастаянных руска-польскіх калектываў у губернскіх гарадах. Рэформа не была даведзена да канца, ужо ў 1850-я гг. дзейнасць "аб'язных" тэатраў аднаўлялася. 9 лютага 1852 г. прэм'ерай камічнай оперы "Сялянка" (лібрэта В. Дуніна-Марцінкевіча, музыка С. Манюшкі і К. Кжыжаноўскага) адкрылася дзейнасць нацыянальнай трупы. Большая частка сцэн оперы выконвалася на беларускай мове. Гэтыю падзею прынята лічыць пачаткам беларускага тэатра.

Музычнае жыццё беларускіх губерній сярэдзіны XIX ст. было надзвычай багатым. З гастролямі тут бывалі многія знакамітыя музыканты і спевакі таго часу, у гарадах існавалі духавыя і струнныя аркестры, якія выступалі на плошчах і ў парках. Пачалі дзейнічаць аматарскія музычныя калектывы. Існавала некалькі прыватных аркестраў, якія выступалі ў Мінску, яны належылі памешчыкам Л. Ракіцкаму і А. Оштарпу.

Прычынай багатага і разнастайнага музычнага жыцця рэгіёнаў Расійскай Імперыі стала добрая музычная адукацыя вышэйшых слаёў грамадства. Музыцы надавалася вялікая ўвага ў хатнім выхаванні, у прыватных пансіёнах, семінарыях і дзяржаўных навучальных установах. У канцэртах актыўна ўдзельнічалі жанчыны са шляхецкіх сем'яў, якія валодалі рознымі інструментамі, найчасцей фартэпіяна. У 1858 г. у Мінску фартэпіяна рабілі на трох фабрыках, і яны добра раскупаліся. Важную ролю ў фарміраванні музычнай культуры Мінска адыгралі таленавітыя музыканты-выкладчыкі: браты Дамінік і Вінцэнт Стафановіч, якія вучылі кампазітараў С. Манюшка і Ф. Міладоўскага.

З Беларуссю звязана творчасць занакамітага польскага кампазітара, родапачынальніка польскай оперы С. Манюшка (1819-1872). У 1830 г. сям'я С. Манюшка пераехала ў Мінск, дзе ён пайшоў у гімназію. Бацькі Станіслава часта наладжвалі музычныя вечарыны, на якіх збіраліся многія таленавітыя музыканты таго часу. У Мінску былі пастаўлены і першыя творы кампазітара – аперэты "Латарэя", "Канторскія служачыя" і інш.

Адным з самых яркіх музыкантаў таго часу быў Напалеон Орда (1807-1883), які нарадзіўся ў в. Варацэвічы сучаснага Іванаўскага раёна. Н. Орда быў удзельнікам паўстання 1830-1831 гг., пасля падаўлення якога ён выехаў у Парыж. У гэтым горадзе таленты маладога чалавека расквітнелі. Орда дасягнуў вялікіх поспехаў у музыцы, пісаў паланэзы, мазуркі, вальсы і рамансы, якія былі ўхвалены С. Манюшкам, Ф. Шапэнам, Ф. Лістам. У сяр. 40-х гг. XIX ст. Н. Орда стаў дырэктарам Італьянскай оперы ў Парыжы. Праявіў сябе Орда і ў літаратурнай дзейнасці, выдаў кнігу "Граматыка музыкі".

### *4. Выяўленчае мастацтва.*

У пер. пал. XIX ст. Вільня стала значным цэнтрам развіцця выяўленчага мастацтва зямель Літвы і Беларусі. У Віленскай школе жывапісу і на аддзяленні прыгожых мастацтваў факультэта літаратуры і мастацтва Віленскага універсітэта адукацыю ў галіне скульптуры і жывапісу атрымлівалі таленавітыя выхадцы з Беларусі – Я. Дамель, М. Кулеша, Н. Орда, В. Ваньковіч і іншыя. Пасля закрыцця універсітэта пачаўся адток мастакоў у Пецярбург і Маскву.

Лепшыя творы беларускага мастацтва таго часу былі створаны ў жанры партрэта. Выдатным партрэтыстам першай паловы XIX ст. быў Іосіф Аляшкевіч (1777-1830), прадстаўнік пануючых у тыя часы накірункаў – класіцызма, акадэмізма і рамантызма. З 1810 г. жыў у Пецярбургу, але часта наведваў Беларусь. Тут ім былі створаны партрэты знакамітых суайчыннікаў – М. Радзівіла, А. Чартарыйскага, А. Міцкевіча. Да гістарычнага жанру адносіцца яго карціна "Развітанне гетмана Хадкевіча з маладой жонкай перад адпраўленнем пад Хоцін".

Валенцій Ваньковіч (1800-1842) таксама пакінуў пасля сябе вялікую колькасць партрэтаў знакамітых дзеячоў культуры таго часу: паэта А. Гарэцкага, скрыпача К. Ліпінскага, піяністкі М. Шымаяоўскай. Мастак захапляўся постаццю Напалеона Банапарта, якому прысвяціў свой твор "Напалеон каля вогнішча". Самай вядомай працай мастака лічыцца карціна "Міцкевіч на скале Аюдаг", створаная ў 1828 г. Доўгі час мастак жыў і працаваў у Мінску, у 1839 г. быў вымушаны эмігрыраваць у Парыж, дзе і памёр. Творы В. Ваньковіча зараз захоўваюцца ў Нацыянальным музеі Беларусі, Нацыянальным музеі Варшавы, музеях Парыжа.

Творчасць мастака Яна Дамеля (1780-1840) ахоплівала розныя жанры. Ён напісаў шмат карцін на гістарычную тэматыку: "Вызваленне Касцюшкі з цямніцы", "Адступленне французаў праз Вільню ў 1812 г.", "Хрышчэнне славян". Вялікіх поспехаў дасягнуў мастак у пейзажы. На яго творах выхоўваліся наступныя пакаленні мастакоў.

Свой любімы жанр жывапісу Н. Орда выбраў яшчэ займаючыся ў французскага майстра архітэктурнага пейзажа П'ера Жэрара. Орда выпрацаваў своеасаблівы мастацкі почарк – яго малюнкі з'яўляюцца не толькі ўвасабленнем помніка архітэктуры, яны становяцца гістарычным дакументам, на якім фіксуюцца нават дробныя дэталі будынка і навакольнага асяроддзя. У 1856 г. была аб'яўлена амністыя ўдзельнікам паўстання, і Н. Орда змог вярнуцца ў родны маёнтак Варацэвічы, жыў у Гродна і Пінску. Яго любімай справай сталі падарожжы па Беларусі, Польшчы і Літве.

Вынікам гэтых вандровак сталі сотні малюнкаў, на якіх занатаваны архітэктурныя помнікі – замкі, палацы, касцёлы і цэрквы, вуліцы гарадоў. У 1873 г. Орда пачаў выдаваць "Альбом гістарычных відаў Польшчы". Пасля смерці мастака ў 1883 г. большасць яго малюнкаў была ахвяравана Нацыянальнаму музею Кракава. Малюнкі Н. Орды з'яўляюцца каштоўнейшай крыніцай для рэстаўратараў, дазваляюць уявіць сабе выгляд архітэктурных помнікаў Беларусі, якія не захаваліся да нашых дзён. У 1997 г. у г. Іванава быў адкрыты помнік знакамітаму кампазітару і мастаку Н. Ордзе, выкананы скульптарам І. Голубевым.

У канцы XIX ст. на Беларусі працавалі асобныя мастакі, аднак ніводнай мастацкай вучэльні не было. У Віцебску працавала прыватная мастацкая школа Ю. Пэна, якую наведваў у юнацтве Марк Шагал (1887-1985). У 1892 г. Ілья Рэпін набыў недалёка ад Віцебска хутар Здраўнёва, дзе штогод праводзіў па некалькі месяцаў. Тут ім былі створаны некаторыя яго вельмі вядомыя карціны: "Асенні букет", "Яблыні цвітуць", "На Заходняй Дзвіне. Усход сонца". Галоўным творам І. Рэпіна, які з'явіўся на Віцебшчыне, стала карціна "Беларус".

### 5. *Развіццё архітэктуры.*

Пасля ўключэння беларускіх земляў у склад Расійскай Імперыі пачалося актыўнае будаўніцтва гарадоў, у якім вызначальную ролю адыгрывала руская архітэктурная школа. Ствараліся планы развіцця больш як 40 беларускіх гарадоў, якія грунтаваліся на прамавугольнай сістэме планіроўкі. Асноўным мастацкім стылям стаў класіцызм, які вызначыў выгляд многіх палацава-паркавых ансамбляў, якія ствараліся ў той час: палаца П. Румянцава і сабора Пятра і Паўла ў Гомелі, палацавага комплекса ў Снове (Нясвіжскі раён), палаца ў Жылічах (Кіраўскі раён) і інш.

Эканамічнае і сацыяльна-палітычнае развіццё беларускіх губерняў патрабавала будаўніцтва вялікай колькасці грамадскіх будынкаў – губернскіх і павятовых праўленняў, судоў, паштовых станцый, гасцінных двароў, гандлёвых радоў, дварцоў губернатараў, жылых шматкватэрных дамоў і інш. Самымі знакамітымі архітэктарамі, якія працавалі на Беларусі ў стылі класіцызм, былі Б. Захарэвіч, А. і П. Макарэвічы.

Амаль цалкам былі перабудаваны гарады Брэст і Бабруйск, дзе расійскі ўрад пабудоваў моцныя крэпасці. Брэсцкая крэпасць была ўзведзена ў 1836–1842 гг. на месцы старога горада, які меў цудоўнае з пункту гледжання абароны палажэнне – на востраве, утвораным рэкамі Буг і Мухавец. Многія будынкі горада былі разабраны, некаторыя прыстасаваны для патрэбаў вайсковага гарнізона. Старажытны, непаўторны горад Брэст перастаў існаваць, яго жыхароў перасялілі на 2 км ва ўсходнім накірунку.

Новы этап перажывала культавае дойлідства. Скарацілася будаўніцтва касцёлаў, уніяцкія храмы часта перабудоўваліся пад праваслаўныя. Культавая архітэктура пачала страчваць сваю мясцовую самабытнасць. У 1780–1798 гг. у Магілёве па праекце архітэктара М. Львова быў пабудаваны сабор св. Іосіфа, які стаў адным з першых і найбольш значных помнікаў класіцызма ў культавым дойлідстве. Сабор павінен быў нагадваць аб сустрэчы імператрыцы Кацярыны II з аўстрыйскім імператарам Іосіфам II, якая адбылася ў Магілёве. Інтэр'ер сабора быў распісаны рускім мастаком У. Баравікоўскім.

Канец XIX – пачатак XX стст. стаў часам распаўсюджання новага мастацкага накірунку – эклектызму, якому быў характэрны зварот да стыляў мінулых эпох. Да лепшых твораў эклектыкі можна аднесці касцёл Сымона і Алены ў Мінску (неаготыка), сядзібу ў г Расоны і в. Краскі (Ваўкавыскі раён). У розных накірунках эклектыкі будаваліся шматлікія грамадскія будынкі – чыгуначныя вакзалы ў г. Слоніме і в. Навае́льня (Дзятлаўскі раён), мужчынская гімназія ў Гомелі і інш.

У XIX – пач. XX стст. на беларускіх землях жылі і працавалі многія вядомыя пісьменнікі, паэты, мастакі і музыканты таго часу. Багатым і разнастайным было культурнае жыццё губернскіх сталіц – Вільні, Мінска і Гродна.

### *Літаратура*


1. Арлоў, У. Таямніцы полацкай гісторыі. – Мн.: Беларусь, 1994. – С.334–374.
2. Беларусь у малюнках Напалеона Орды. Другая палова XIX ст. – Мн.: Ураджай, 2001. – 143 с.
3. Гісторыя Беларусі: У 6 т. Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.) / М. Біч, В. Яноўская, С. Рудовіч [і інш.] – Мн.: Экаперспектыва, 2005. – Т. 4. – С.150-157, 283-300.
4. Карповіч, Т.А. Культурнае жыццё Мінска I паловы XIX ст. – Мн.: Нацыянальны мастацкі музей РБ, 2002. – 2002. – 32 с.
5. Кулагін, А.М. Эклектыка. Архітэктура Беларусі другой паловы XIX – пач. XX ст. – Мн.: Ураджай, 2000. – 304 с.
6. Культурология: теория и история культуры: учеб. пособие / И.Е. Ширшов, К.И. Баландин, В.В. Качановский [и др.]; под общ. ред. И.Е. Ширшова. – Мн.: БГЭУ, 2004. – С. 346–372.
7. Мысліцелі і асветнікі Беларусі: Энцыкл. даведнік. – Мн.: БелЭн, 1995. – С.380– 382.
8. Падліпскі, А.М. Здраўнёва: тут жыў І.Я. Рэпін. – Мн.: Полымя, 1995. – 62 с.

# РАЗДЗЕЛ III. САВЕЦКАЯ МАДЭЛЬ КУЛЬТУРНАГА РАЗВІЦЦЯ

## Тэма 6. Культура БССР (1917 – 1941 гг.).

1. Бальшавісцкі і нацыянальна-дэмакратычны падыходы да культурных працэсаў на Беларусі (1917 – 1922 гг.): параўнальны аналіз.
2. Палітыка беларусізацыі.
3. Культурныя працэсы ў 1930-я – пачатку 1940-х гг. Узмацненне адміністрацыйна-партыйнага кантролю ў сферы культуры. Палітычныя рэпрэсіі ў дачыненні дзеячоў беларускай культуры.

### *1. Бальшавіцкі і нацыянальна-дэмакратычны падыходы да культурных працэсаў на Беларусі (1917 – 1922 гг.): параўнальны аналіз.*

Кастрычніцкі пераварот 1917 г. у Расіі стаў пачаткам савецкага перыяда ў гісторыі Беларусі, які працягваўся да 1991 г. У культурнай палітыцы бальшавікоў, якія маннапольна кіравалі краінай у гэты перыяд, былі як пастаянства, пераемнасць, так і абнаўленне. Пастаянства прасочвалася ў выпустошванні агульначалавечых каштоўнасцяў, у жорсткім акцэнце на класавым падыходзе, ва ўмяшальніцтве ў культурныя працэсы, у ваяўнічым дзяржаўным атэізме.

Да пачатку 1920-х гг. сур'ёзным канкурэнтам бальшавікоў на Беларусі былі нацыянал-дэмакраты. У 1918 г. была створана Беларуская Народная Рэспубліка, якая ажыццяўляла рэальную культурную палітыку ў час германскай і польскай акупацыі.

Прыблізна да 1922 г. антыбеларускай па сваёй сутнасці культурнай палітыцы бальшавікоў супрацьстаяла палітыка нацыянал-дэмакратаў, якая ўсебакова, паслядоўна, прынцыпова ўлічвала культурныя патрэбы беларусаў. Ключавое разыходжанне паміж апанентамі заключалася ва ўспрыманні беларусаў як самастойнага этнаса. Бальшавікі не лічылі беларусаў самастойным этнасам, разглядалі іх як "разнавіднасць рускага народа", заклікалі скасаваць этнічную розніцу, якая існуе паміж рускім і беларускім народамі. Нацыянал-дэмакраты былі глыбока перакананы ў тым, што беларуская нацыя склалася, стала самастойным суб'ектам міжнацыянальных адносін. Зразумела, нацыянал-дэмакраты прызнавалі поўнавартаснае існаванне беларускай культуры, а для бальшавікоў важнейшым быў класавы, а не нацыянальны падыход.

Для паказу плённасці культурнай палітыкі БНР можна спыніцца на падзеях, якія мелі месца ў перыяд паміж жніўнем 1919 г. і ліпенем 1920 г. У гэты час шмат увагі надавалася развіццю адукацыі: працаваў Мінскі педагагічны інстытут, Слуцкая і Віленская беларускія гімназіі, 3 прагімназіі (2 жаночыя) у Мінску, прагімназіі ў Гродне, Дукоры, Заслаўі і Ракаве, больш за 300 пачатковых школ. У перыяд складаных палітычных і ваенных падзей 1919 – 1920 гг. выдавалася "Геаграфія Беларусі" А. Смоліча, "Гісторыя беларускае літаратуры" М.І. Гарэцкага, "Кароткі нарыс гісторыі Беларусі" У.М. Ігнатоўскага, а таксама іншыя падручнікі і навучальныя дапаможнікі на беларускай мове. Значна пашырылася выдавецкая дзейнасць непасрэдна на тэрыторыі Беларусі (Міністэрствам асветы БНР было заснавана Мінскае асветнае выдавецтва), а таксама за яе межамі, у прыватнасці ў Вільні, дзе было заснавана выдавецтва У. Знамяроўскага, аднавіла працу Беларускае выдавецкае таварыства і выдавецкае таварыства "Крыніца". Значны ўздым назіраўся і ў галіне тэатральнага мастацтва: было створана Мінскае таварыства працаўнікоў беларускага мастацтва на аснове трупы Аляховіча і хора

Тэраўскага, якія ўваходзілі ў склад "Беларускай хаткі". Са снежня 1919 г. Беларускі дзяржаўны тэатр у Мінску, перайменаваны ў Беларускі нацыянальны тэатр, аднавіў свае спектаклі. У кастрычніку гэтага ж года Беларуская вучнёўская грамада стварыла сваю драматычную секцыю, якая мела ўласны рэпертуар. Плённа працавалі гурткі мастацкай самадзейнасці. З гэтай нагоды Міністэрства асветы БНР выпусціла зборнікі п'ес для аматарскіх тэатраў.

**2. *Палітыка беларусізацыі.***

Пасля 1921 г. пачынаецца развіццё культуры прадстаўнікоў усіх нацый, якія пражывалі на тэрыторыі Беларусі, што было абумоўлена НЭПам і адносным лібералізмам у сферы культуры. На радзіму вярнуліся прасякнутыя ідэяй развіцця дзяржаўнасці і культуры Беларусі ва ўмовах існавання савецкай улады прадстаўнікі творчай інтэлігенцыі, навукоўцы, палітыкі, дзеячы БНР.

У рэзалюцыі X з'езда РКП(б) (сакавік 1921 г.) асаблівая ўвага надавалася раней прыгнечаным нацыям, падкрэслівалася неабходнасць развіцця на іх роднай мове органаў улады, суда, друку, адкрыцця агульнаадукацыйных і прафесійна-тэхнічных школ і курсаў, культурна-асветніцкіх устаноў. Паколькі нетутэйшыя бальшавіцкія кіраўнікі дэманстратыўна адмаўляліся размаўляць па-беларуску, у кастрычніку–лістападзе 1921 г. ЦК КП(б) Беларусі зацвердзіў і надрукаваў тэзы «Беларускае нацыянальнае пытанне і камуністычная партыя», дзе ставілася задача неабмежаванага ўжывання беларускай мовы і развіцця беларускай нацыянальнай культуры.

У перыяд з 1924 па 1926 гг. плошча Беларусі вырасла да 125 тыс. 854 км$^2$, а насельніцтва да 5 млн. чалавек, паколькі былі вернуты ад РСФСР раней занятыя ёю беларускія тэрыторыі (акрамя Смаленшчыны). У ліпені 1924 г. пленум ЦК КП(б) Беларусі абвясціў шырокую праграму нацыянальна-культурнага адраджэння. У тым жа месяцы ЦВК БССР прыняў пастанову аб правядзенні ў рэспубліцы «нацыянальнай палітыкі», або палітыкі «беларусізацыі».

Пад беларусізацыяй мелася на ўвазе наступнае:

1) развіццё беларускай культуры: стварэнне школ, тэхнікумаў, ВНУ з беларускай мовай навучання, адкрыццё культурна-асветніцкіх устаноў, развіццё беларускай літаратуры, выданне на беларускай мове газет, часопісаў, разгортванне навукова-даследчыцкай працы па ўсебаковаму вывучэнню гісторыі Беларусі;

2) вылучэнне карэнных жыхароў на партыйную, савецкую, прафесійную і грамадскую работу;

3) перавод справаводства партыйнага, дзяржаўнага, прафесійнага апаратаў і частак Чырвонай Арміі на беларускую мову.

Беларусы ў гэты перыяд складалі каля 81% насельніцтва, але асноўнай іх часткай былі сяляне. У мястэчках і буйных гарадах пераважалі новапрыбыўшыя рускія і яўрэі, для якіх беларуская мова не з'яўлялася роднай, а таму разглядалася як неэлітарная і неперспектыўная. Бальшавікі імкнуліся растлумачыць неабходнасць беларусізацыі задачай «прыстасаваць дзяржаўны апарат, школы, мастацтва, літаратуру да абслугоўвання асноўнай масы насельніцтва на яго роднай мове» і ажыццяўлялі гэтую новую палітыку ў асноўным шляхам дырэктыўна-камандных метадаў. Нягледзячы на шэраг складанасцяў, менавіта гэта пэўным чынам спрыяла росквіту асветы і культуры на Беларусі ў 1920-х гг.

Інтэнсіўна развівалася галіна вышэйшай адукацыі. У 1921 г. пачаў працаваць Беларускі дзяржаўны універсітэт. Пазней з БДУ вылучылася некалькі асобных інстытутаў, напрыклад, педагагічны, медыцынскі, сельскагаспадарчы. У 1922 г. быў створаны Інстытут беларускай культуры, на базе якога ў 1929 г. пачала працу Акадэмія навук Беларусі. У 1924 г. быў адкрыты ветэрынарны інстытут у Віцебску і Беларуская сельскагаспадарчая акадэмія ў Горках. Таксама ў гэты час шмат увагі надавалася развіццю сярэдняй спецыяльнай адукацыі, у розных гарадах Беларусі было створана некалькі дзесяткаў тэхнікумаў.

Дэкрэтам 1924 г. было абвешчана раўнапраўе чатырох асноўных моў Беларусі: беларускай, рускай, ідзіш і польскай. Пачалі працаваць школы нацыянальных меншасцяў. У Акадэміі навук адкрываліся нацыянальныя аддзелы, а ў БелАПП (Беларуская Асацыяцыя пралетарскіх пісьменнікаў) – нацыянальныя секцыі.

Асноўнымі вынікамі палітыкі беларусізацыі з'яўлялася тое, што ў 1928 г. выкладанне ў школах вялося на 8 нацыянальных мовах, паколькі да 80 % школ было пераведзена на беларускую мову навучання і адначасова адкрываліся школы і класы з роднай мовай навучання для прадстаўнікоў нацыянальных меншасцяў. На беларускай мове вялося навучанне ў прафесіянальных школах і тэхнікумах. Дзейнічалі таксама яўрэйскі і польскі педтэхнікумы. На рабфаках, у вячэрніх школах для дарослых, школах рабочай і сялянскай моладзі ўводзілася поруч з беларускай мовай і літаратурай абавязковае вывучэнне гісторыі, геаграфіі і эканомікі БССР. Выкладанне гэтых і іншых прадметаў ажыццяўлялася на беларускай мове.

Ужо ў 1928 г. беларуская мова мела доволі шырокае афіцыйнае ўжыванне. Амаль цалкам на беларускую мову было пераведзена справаводства ў дзяржаўных і партыйных органах, прычым першымі і ў найкарацейшы тэрмін гэта зрабілі Кіраўніцтва справамі ЦВК і СНК БССР, Наркамасветы і Наркамзем. Да 1925 г. у цэнтральных дзяржаўных установах беларускай мовай валодала не больш як 20 % супрацоўнікаў, а ў 1927 г. – ужо 80 %. З канца 1925 г. пасяджэнні і пратаколы бюро ЦК і акруговых камітэтаў КП(б)Б вяліся на беларускай мове. Асноўныя дакументы ў БССР друкаваліся на рускай, беларускай, польскай і яўрэйскай мовах.

У рознабаковым развіцці беларускай культуры, разгортванні працэса беларусізацыі важная роля належала нацыянальнай інтэлігенцыі, асабліва тым дзеячам, якія прыехалі служыць Радзіме з эміграцыі, у першую чаргу гэта такія навукоўцы і пісьменнікі, як У. Ігнатоўскі, Я. Лёсік, С. Некрашэвіч, З. Жылуновіч і інш.

Аднак ужо ў 1920-я гг. прадстаўнікі беларускай інтэлігенцыі адчувалі манапольны ўплыў КП(б) Беларусі на працэс адраджэння нацыянальнай культуры як у цэнтры, так і на месцах. Дасягненні былі не толькі ў развіцці вышэйшай школы і навукі. У пачатку 20-х гг. на Беларусі заўважаны яскравы ўздым літаратурнага жыцця, для якога ў гэты час былі характэрнымі свабода творчага пошуку, супярэчнасць думак, з'яўленне розных груп і накірункаў. Толькі з 1920 па 1926 гг. пачалі творчую дзейнасць 500 маладых літаратараў. У іх былі розныя, часта супрацьлеглыя, культурныя і палітычныя погляды, што знаходзіла адлюстраванне і ў літаратуры.

Найбольш моцным літаратурным аб'яднаннем стала таварыства «Маладняк», якое ўзнікла ў 1923 г. на базе аднайменнага часопіса. Заяўленая творчая праграма, як тады і было прынята, павінна была «ажыццяўляць у беларускай мастацкай творчасці ідэі марксізма і ленінізма». Філіялы «Маладняка» былі створаны па ўсёй краіне. На з'ездзе арганізацыі ў лістападзе 1925 г. сакратар ЦК КП(б) Беларусі А. Крыніцкі падкрэсліў неабходнасць працы пісьменнікаў «толькі пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі».

Але ўжо ў гэты час з «Маладняка» пачалі выходзіць некаторыя літаратары, якія не падтрымалі афіцыйную бальшавісцкую ідэалогію, што не прызнавала нацыянальна-культурную спадчыну беларусаў, рабіла ўсё, каб разглядаць як мінулае, так і сучаснасць толькі ў рамках партыйнасці і класавасці, з адкрыта выражаных пазіцый русіфікацыі. У 1926 г. групай пісьменнікаў і паэтаў, сярод якіх былі Уладзімір Дубоўка, Кандрат Крапіва, Тодар Кляшторны, Андрэй Мрый, Змітрок Бядуля і іншыя, было створана новае аб'яднанне «Узвышша». Мэта арганізацыі – фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці народа, пашырэнне беларускага нацыянальна-культурнага руху без партыйнага кіраўніцтва.

Ствараліся і іншыя арганізацыі, якія спрабавалі аб'яднаць пісьменнікаў на агульна-дэмакратычных пазіцыях. Аднак апорай партыі ў літаратурным жыцці заставалася БелАПП.

Разам з вядомымі пісьменнікамі і паэтамі, такімі як Я. Колас, Я. Купала, З. Бядуля, літаратурнай творчасцю пачалі займацца дзесяткі ў будучым вельмі вядомых беларускіх пісьменнікаў і паэтаў – Н. Арсеньева, П. Галавач, М. Лынькоў, К. Чорны, У. Дубоўка, К. Крапіва, А. Астрэйка, П. Броўка, А. Куляшоў, М. Хведаровіч, М. Лужанін, П. Глебка, Т. Кляшторны і інш. Некаторыя з іх затым пайшлі на больш цеснае супрацоўніцтва з уладамі, іншыя былі падвергнуты рэпрэсіям, а некаторыя, як Н. Арсеньева, пасля Другой сусветнай вайны вымушаны былі эміграваць.

Актыўна ў гэтыя гады ішла праца на тэатральнай ніве. У верасні 1920 г. у Мінску адбылося адкрыццё Беларускага дзяржаўнага тэатра, у якім ставіліся спектаклі беларускіх, рускіх, польскіх і яўрэйскіх аўтараў. У 1921–1931 гг. мастацкім кіраўніком БДТ працаваў вядомы беларускі драматург і рэжысёр Яўген Міровіч. Велізарнай папулярнасцю карысталіся яго гістарычныя пастаноўкі па п'есах «Машэка», «Кузнец-ваявода», «Кастусь Каліноўскі» і іншыя. У 1926 г. тэатр стаў называцца Першым Беларускім тэатрам – БДТ-1. Таксама быў створаны беларускі вандроўны тэатр пад кіраўніцтвам Уладзіслава Галубка, які вельмі шмат зрабіў для прапаганды і развіцця беларускай культуры.

У верасні 1921 г. у Маскве была заснавана беларуская драматычная студыя. Яе выпускнікі стварылі ў Віцебску ў 1926 г. Другі Беларускі тэатр – БДТ-2. У яго стварэнні прынялі ўдзел такія вядомыя беларускія акцёры, як Аляксандр Ільінскі, Канстанцін Саннікаў, Стэфанія Станюта і іншыя. Тэатр пачаў актыўна ставіць п'есы беларускіх аўтараў, але менавіта гэта адразу не спадабалася ўладам. У 1926–1927 гг. з рэпертуара тэатра цэнзурай былі зняты п'есы В. Шашалевіча «Апраметная» і Я. Купалы «Тутэйшыя», як утрымліваючыя элементы нацыянал-дэмакратызму. П'еса «Тутэйшыя» была нават абмеркавана і асуджана на пасяджэнні бюро ЦК КП(б)Б 17 снежня 1926 г.

За кароткі час тэатры сталі месцам фарміравання нацыянальнай самасвядомасці. Яны раскрывалі гледачам невядомыя старонкі гісторыі народа, яго звычаі, сучасныя праблемы развіцця грамадства. Тэатр вельмі хутка набываў папулярнасць сярод шырокіх слаёў насельніцтва.

Патрэбна адзначыць, што развівалася тэатральнае мастацтва і нацыянальных меншасцяў, якія насялялі Беларусь. У краіне дзейнічалі польскі, рускі, яўрэйскі тэатры. Аднак ужо 18 жніўня 1927 г. сакратарыят ЦК КП(б)Б прыняў рэзалюцыю «Аб задачах партыі ў галіне тэатральнай палітыкі», дзе падкрэслівалася неабходнасць правядзення рашучай лініі па забароне пастаноўкі п'ес, якія ўтрымліваюць варожую пралетарыяту ідэалогію, элементы нацыянал-дэмакратызму, шавінізму, упадніцтва і антыпралетарскіх настрояў.

Значнымі былі поспехі і ў вывучэнні і развіцці выяўленчага мастацтва. Вывучэнне гісторыі беларускага мастацтва пачалося па ініцыятыве вядомых беларускіх мастацтвазнаўцаў М. Шчакаціхіна і М. Каспяровіча. М. Шчакаціхін стварыў у БДУ кафедру гісторыі беларускага мастацтва, выдаў «Нарысы з гісторыі беларускага мастацтва», у якіх даказаў, што яшчэ ў XII ст., апынуўшыся пад візантыйскім і заходнееўрапейскім уплывам, беларуская архітэктура па-свойму перапрацоўвала замежныя формы і на аснове мясцовых асаблівасцяў стварала своеасаблівы мастацкі стыль.

М. Каспяровіч арганізаваў вывучэнне беларускага мастацтва пры Віцебскім мастацкім тэхнікуме, шмат зрабіў для папулярызацыі дасягненняў культуры Беларусі. Цікава, што пошукі новых накірункаў у выяўленчым мастацтве асабліва яскрава праявілася ў працы Віцебскай мастацкай школы, якая ў 1922 г. была пераўтворана ў Віцебскі мастацка-практычны інстытут. Менавіта тут працавалі такія вядомыя мастакі, як М. Шагал, К. Малевіч. Пазней яны па розных прычынах вымушаны былі пакінуць Віцебск. У той жа час з'явілася група мастакоў, якія плённа працавалі ў акадэмічным стылі: В. Волкаў, Я. Кругер, В. Кудрэвіч, М. Станюта, М. Філіповіч, І. Ахрэмчык. Тут жа ў Віцебскім мастацкім тэхнікуме пачала развівацца беларуская школа скульптараў. У ім вучыліся З. Азгур, А. Глебаў, А. Бембель, А. Арлоў, А. Жораў і інш.

У 1920-х гг. пачынае стварацца беларускае кіно. Па ініцыятыве ўлады была заснавана кінастудыя «Савецкая Беларусь», якая спачатку займалася хранікальнымі здымкамі. Першым беларускім фільмам стала «Лясная быль» Ю. Тарыча, прысвечаная барацьбе беларускіх партызан у 1920-х гг. У 1928 г. выйшаў у свет фільм В. Гардзіна «Кастусь Каліноўскі».

Развіваліся і іншыя галіны культуры, актыўна працавалі навуковыя, музейныя, культурна-асветніцкія і адукацыйныя ўстановы.

У культурнай палітыцы КП(б)Б важнае месца займала ліквідацыя непісьменнасці і малапісьменнасці насельніцтва. Аб вастрыні праблемы сведчыў той факт, што ў канцы 1920 г. на вызваленай ад палякаў тэрыторыі Беларусі непісьменным было 52,6 % насельніцтва ва ўзросце ад 9 да 49 гадоў. Ключавую ролю ў вырашэнні гэтага пытання адыгрываў Наркамат асветы БССР. Спачатку гэтая кампанія вялася без пэўнага планавання. Потым быў створаны пятнаццацігадовы план ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых і падлеткаў у БССР, які затым быў перароблены ў дзесяцігадовы. У 1926 г. пісьменнасць у БССР складала 40,7 % (мужчын – 54,2 %, жанчын – 27,8 %). Самая нізкая пісьменнасць была сярод беларускага насельніцтва – 36 %. Вельмі нізкай

была пісьменнасць сярод жанчын-беларусак – 22 % (сярод жанчын-яўрэяк – 60 %, латышак – 70 %). У 1925 г. пачалі арганізоўваць школы для малапісьменных. Лозунгам дзейнасці органаў народнай асветы пры гэтым быў – "Пісьменны, навучы непісьменнага!"

Такім чынам, пры дапамозе ініцыяванай уладай і падтрыманай нацыянальнай інтэлігенцыяй палітыкі беларусізацыі было шмат зроблена па фарміраванню нацыянальнай самасвядомасці народа, узняццю яго культурнага ўзроўню. Беларусізацыя прабудзіла да свядомага нацыянальнага жыцця шырокія слаі насельніцтва, дала велізарны штуршок развіццю беларускай культуры і ўмацаванню нацыянальнай дзяржаўнасці. Але гэту палітыку праводзілі бальшавікі, яны яе і скасавалі. «З аднаго боку, відаць, культура не заўсёды «атрымлівалася» савецкай, бо ўжо ўвосень 1927 г. XI з'езд КП(б)Б заявіў, што нацыяналістычныя колы інтэлігенцыі падмяняюць пралетарскі змест культуры дробнабуржуазным, адыходзяць ад формулы «культура пралетарская па зместу і нацыянальная па форме». Гэта азначала канчатковую падмену ў культурным развіцці агульначалавечых каштоўнасцяў класавымі. З другога боку, неабходна адзначыць, што і палітыка беларусізацыі, і ўзбуйненне тэрыторыі БССР у 1924 г. і ў 1926 г., іншыя палітычныя і культурныя акцыі ў многім спецыяльна праводзіліся ў супрацьвагу польскай палітыцы ў Заходняй Беларусі. Заўважым таксама, што «узбуйненні» пачаліся толькі пасля ўтварэння ў снежні 1922 г. СССР, часткай якога стала савецкая частка Беларусі".[2]

### *3. Культурныя працэсы ў 1930-я – пачатку 1940-х гг. Узмацненне адміністрацыйна-партыйнага кантролю ў сферы культуры. Палітычныя рэпрэсіі ў дачыненні дзеячоў беларускай культуры.*

Рэзкія змены ў палітычным жыцці Савецкай Беларусі, пачынаючы з канца 1920-х – пачатку 1930-х гг., былі выкліканы незадавальненнем кіраўніцтва СССР наступствамі беларусізацыі. Ва ўмовах усталявання таталітарнага рэжыму недапушчальным было існаванне беларускай своеасаблівасці, таму кіраўніцтва РКП(б) імкнулася уніфікаваць палітычнае, гаспадарчае і культурнае жыццё на тэрыторыі ўсяго СССР.

Напрыканцы 1920-х гг. Беларусь аказалася на пярэднім краі, палітычныя рэпрэсіі тут пачаліся значна раней, чым у іншых рэгіёнах Савецкага Саюза. Быў зроблены абсурдны вывад аб варожасці і контррэвалюцыйнасці нацыянал-дэмакратаў, якія ва ўмовах дыктатуры пралетарыяту быццам бы сталі рэакцыйнай з'явай.

Пачалася адкрытая барацьба супраць нацыянальных здабыткаў беларускай культуры. Замест выразу «беларуская культура» неабходна было ўжываць азначэнне «культура Савецкай Беларусі». Відавочна, што гэтым самым падкрэслівалася розніца паміж новымі рэаліямі і ўсім тым, што было створана на працягу папярэдніх стагоддзяў. Тэатральны рэпертуар першым спазнаў на сабе адкрыты ідэалагічны ўціск. Народным камісарыятам асветы пры Галоўліце (Галоўнае ўпраўленне па справах літаратуры і выдавецкай дзейнасці пры Савеце Міністраў БССР – орган савецкай цэнзуры) была створана спецыяльная структура – Галоўрэперткам, персанальны склад якога зацвярджаўся ЦК КП(б)Б. Пастаноўкі беларускіх аўтараў былі выціснуты перакладзенымі на беларускую мову п'есамі рускіх пісьменнікаў («Мяцеж» Дз. Фурманава, «Разлом» Б. Лаўрэнёва, «Браняносец 14–69» Ус. Іванова).

---

[2] Голубев, В. Культура Беларуси в годы советской власти // http://kamunikat.fontel.net/www/czasopisy/filamaty/07/06.htm

17 снежня 1928 г. ЦК КП(б)Б прыняў пастанову «Аб выніках дыскусіі па тэатральных пытаннях», у якой было ўказана на недапушчэнне «адмежавання беларускай культуры ад культур іншых нацыянальнасцяў СССР і ў першую чаргу ад рускай культуры». Гэта была рэакцыя ўлады на спробы беларускай інтэлігенцыі выказацца за неабходнасць развіцця беларускага тэатра на аснове нацыянальнай літаратуры. Патрабавалася адмовіцца ад пастановак, прысвечаных гісторыі беларускага народа, паколькі гэта адпавядала так званай «тэорыі самабытнасці» беларусаў. Усе творы, складзеныя ў дасавецкі перыяд, лічыліся непатрэбнымі і шкоднымі, паколькі разглядаліся як праявы феадальнага і дробнабуржуазнага ўпадніцтва.

У загане знаходзілася інтэлігенцыя. Яе лепшая, нацыянальна свядомая частка выступала супраць партыйнага дыктата. Нацыянал-дэмакратычныя погляды з'яўляліся падставай для арыштаў або рэпрэсій. Вядомы беларускі тэатральны дзеяч, драматург і пісьменнік Ф. Аляхновіч з'явіўся адной з першых ахвяр бальшавіцкіх рэпрэсій. Пасля вяртання ў БССР у 1926 г. ён працаваў у Віцебску ў БДТ-2, праз некалькі месяцаў быў арыштаваны і сасланы на 10 гадоў на Салавецкія астравы з абвінавачваннем у шпіянажы на карысць Польшчы.

Беларускія гісторыкі зрабілі адназначную выснову аб тым, што з канца 1920-х гг. на Беларусі свядома праводзілася аперацыя па знішчэнню нацыянальнай інтэлігенцыі і разбурэнню нацыянальнай культуры. Быў зняты з пасады старшыня ўрада БССР Іосіф Адамовіч за правядзенне палітыкі беларусізацыі. Абвінавачванням і праследаванню былі падвергнуты прэзідэнт Акадэміі навук БССР Усевалад Ігнатоўскі і першы старшыня Савета народных камісараў БССР Зміцер Жылуновіч. З болей чым 800 удзельнікаў беларускага нацыянальнага руху 1917–1924 гг. былі рэпрэсаваны ўсе, хто засталіся жыць на тэрыторыі СССР. У першую чаргу пацярпелі рээмігранты – тыя, хто паверыў бальшавікам і вярнуўся ў краіну з-за мяжы (Ф. Аляхновіч, В. Ластоўскі, А. Цвікевіч, М. Гарэцкі, В. Жылка і інш.).

Пасля рэпрэсій канца 1920-х гг. прайшлі яшчэ тры рэпрэсіўныя хвалі 1930–1931, 1933–1934 і 1937–1938 гг. Найвышэйшай кропкай барацьбы з нацыянал-дэмакратычнымі поглядамі стала раскрыццё дзейнасці штучна "створанай" спецорганамі арганізацыі «Саюз вызвалення Беларусі» (СВБ). У 1931 г. за прыналежнасць да гэтай арганізацыі былі асуджаны 90 работнікаў навукі, мастацтва, савецка-партыйнага апарата. 80 з іх былі прыгавораны да высылкі з Беларусі тэрмінам на пяць год, а дзесяць чалавек – на дзесяцігадовы тэрмін у канцлагеры. Сярод іх былі наркам асветы Антон Баліцкі, наркам земляробства Зміцер Прышчэпаў, намеснік дырэктара Дзяржвыдавецтва Пётр Ільюшонак, віцэ-прэзідэнт Акадэміі навук Сцяпан Некрашэвіч, акадэмікі Вацлаў Ластоўскі, Язэп Лёсік, Аркадзь Смоліч, Гаўрыла Гарэцкі, яго брат Максім Гарэцкі, Аляксандр Цвікевіч.

Вынікам рэпрэсіўных дзеянняў з'явілася знішчэнне болей чым 100 навуковых супрацоўнікаў Акадэміі навук БССР, большасці выкладчыкаў БДУ, работнікаў Дзяржаўнага акадэмічнага вялікага тэатра і філармоніі. З 238 беларускіх літаратараў жахі рэпрэсій перажылі толькі 20 чалавек, а ў літаратуру вярнуліся толькі трое: Алесь Звонак, Сяргей Грахоўскі і Ларыса Геніюш. Загінулі Максім Гарэцкі, Уладзіслаў Галубок, Міхась Чарот, Алесь Дудар, Платон Галавач, Міхась Зарэцкі і інш. Прэзідэнт Акадэміі навук гісторык Усевалад Ігнатоўскі пакончыў жыццё самагубствам, у Янкі Купалы спроба самагубства не ўдалася. Беларуская нацыя, абсалютную большасць якой па-ранейшаму складала сялянства, у чарговы раз страціла сваю інтэлігенцыю.

У Заходняй Беларусі "мерапрыемствы" па знішчэнню беларускай нацыянанальнай інтэлігенцыі былі праведзены ў 1939–1941 гг. Масавая дэпартацыя жыхароў Заходняй Беларусі праводзілася ў чатыры этапы: ў лютым, красавіку і чэрвені 1940 г., а потым у чэрвені 1941 г. Па афіцыйных звестках, у ходзе гэтай аперацыі пацярпела каля 150 тыс. чалавек, з якіх каля 120 тыс. былі сасланы ў Сібір.

Асаблівую вастрыню набыло пытанне беларускай літаратурнай мовы. З мэтай удасканалення тагачаснага беларускага правапісу 14 – 21 лістапада 1926 г. у Мінску была склікана Акадэмічная канферэнцыя па рэформе беларускага правапісу і азбукі. У ёй бралі ўдзел 69 чалавек, сярод якіх былі і слынныя замежныя навукоцы (П. Растаргуеў, М. Фасмер, М. Біржышка, Ю. Галомбак і інш.). На канферэнцыі ўпершыню былі абагулены дасягненні беларускай філалагічнай навукі, пазначаны галоўныя кірункі яе далейшага развіцця. І хоць прынятыя канферэнцыяй пастановы не мелі кадыфікацыйнага характару, аднак некаторыя з іх потым былі ўлічаны пры падрыхтоўцы праекта новага беларускага правапісу, які быў надрукаваны ў 1930 г. Гэты праект рыхтаваўся правапіснай камісіяй (старшыня С. Некрашэвіч), аднак неўзабаве пяць з васьмі сяброў камісіі былі рэпрэсаваныя. Другі праект, пазбаўлены так званага "нацдэмаўскага ўплыву", быў таксама адхілены з палітычных прычын, паколькі ўхваляў дасягненні Б. Тарашкевіча (ліпень 1933 г.).

Змена палітычнай кан'юнктуры спыніла працэс свабоднага, натуральнага пошуку нормы, што прывяло да паспешлівага прыняцця рэформы «Аб зьменах і спрашчэньні беларускага правапісу» (26 жніўня 1933 г.). Над ёй працавалі ўжо зусім іншыя, менш дасведчаныя ў беларускай мове людзі, некаторыя з іх не былі філолагамі. Гэты новы правапіс ужо цалкам адлюстроўваў тэндэнцыю на збліжэнне беларускай мовы з рускай. Гэта было непасрэдна звязана з палітыкай савецкай дзяржавы. Так, у Канстытуцыі СССР 1927 г. быў артыкул, у якім адзначалася неабходнасць развіцця нацыянальных моваў, а ў наступнай рэдакцыі 1936 г. гэтага артыкула ўжо не было. Усталёўвалася практыка асабістай улады, таталітарны рэжым, была рэпрэсавана лепшая частка беларускіх навукоўцаў, пісьменнікаў, што прывяло да нацыянальна-культурнай дэфармацыі.

У 1930-х гг. была практычна поўнасцю знішчана беларуская акадэмічная навука. Ад рэпрэсій пацярпела 26 акадэмікаў і 6 членаў-карэспандэнтаў АН БССР. У 1938 г. засталося ўсяго 6 аспірантаў з 139, якія былі ў 1934 г. Знішчыўшы беларускіх навукоўцаў, ЦК КП(б)Б у 1933 г. ставіў пытанне аб накіраванні замест іх выхадцаў з Расіі. Дзякуючы такой палітыцы камуністычнай партыі, працэс фарміравання нацыянальнай інтэлігенцыі фактычна быў перарваны.

Непадрыхтаванасць моўнай рэформы адгукнулася ў грамадстве імгненна: ужо ў 1933 – 1934 гг. наўздагон выйшла некалькі дадаткаў і выпраўленняў, а пра патрэбу далейшага ўдасканалення арфаграфіі пачалі настойліва пісаць у друку ў канцы 1930-х гг. Нягледзячы на тое, што сацыяльныя функцыі беларускай мовы пачалі катастрафічна звужацца (асабліва пасля прыняцця ў 1938 г. пастановы "Аб абавязковым вывучэнні рускай мовы ў школе..."), у 1940 г. Камісарыят асветы ўсё ж стварыў правапісную камісію, аднак пачатак вайны спыніў яе дзейнасць.

Такім чынам, практычна поўнасцю былі знішчаны ўсе ўдзельнікі нацыянальна-культурнага адраджэння 1920-х гг., вынікі ажыццяўлення палітыкі нацыянальнага лібералізму праз беларусізацыю ўладамі былі аспрэчаны і адкінуты. На Беларусі, як частцы Савецкага Саюза, быў усталяваны таталітарны рэжым з панаваннем камуністычнай ідэалогіі, у якой месца для дэмакратычнага і нацыянальнага не заставалася.

### *Літаратура*

1. Голубев В. Культура Беларуси в годы советской власти // http://kamunikat.fontel.net/www/czasopisy/filamaty/07/06.htm

2. Парашкоў С.А. Гісторыя культуры Беларусі – Мн.: Бел. навука, 2004. – С. 252 – 253.

3. Сідарэвіч А. Беларуская Народная Рэспубліка // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т. 1: А – Беліца / Беларус. Энцыкл.; рэдкал.: Г. П. Пашкоў (галоўны рэд.)[ і інш.] – Мн.: БелЭн, 1993. – С. 388.

## Тэма 7. Культурныя працэсы ў Заходняй Беларусі (1921 – 1939 гг.).

1. Культурныя патрэбы беларусаў як прадмет унутрыпалітычнай барацьбы. Антыбеларуская культурная палітыка польскіх улад.
2. Культурныя здабыткі беларускага этнаса.
3. Культура іншых народаў на землях Заходняй Беларусі.

### *1. Культурныя патрэбы беларусаў як прадмет унутрыпалітычнай барацьбы. Антыбеларуская культурная палітыка польскіх улад.*

Эканамічная, палітычная і культурная сітуацыя Заходняй Беларусі, якая ўвайшла ў склад Польшчы ў 1921 г., была яшчэ горшай. Нягледзячы на палажэнні Рыжскага дагавору, Польскі ўрад заявіў аб «вяртанні» спрадвечных польскіх зямель, адмовіўся дазволіць для Заходняй Беларусі нават абмежаваны статус культурна-нацыянальнай аўтаноміі. Аднак многія прадстаўнікі творчай інтэлігенцыі, якія апынуліся на тэрыторыі Заходняй Беларусі, актыўна ўключыліся ў культурнае жыццё рэгіёна. Улады стваралі на гэтых землях польскамоўныя школы, якія мелі на мэце садзейнічаць паланізацыі беларускага насельніцтва. У 1921 г. прадстаўнікі беларускай інтэлігенцыі стварылі Таварыства беларускай школы (ТБШ) пад кіраўніцтвам Браніслава Тарашкевіча (1892–1938). Пастулова ТБШ стала масавай культурна-асветніцкай арганізацыяй, адкрывала беларускія школы, гімназіі, клубы, бібліятэкі, ладзіла канцэрты.

З боку польскіх улад назіраўся прыгнёт беларусаў практычна ва ўсіх сферах жыцця, закрываліся беларускія школы, каталіцызм прызнаваўся адзінай афіцыйнай рэлігіяй, нават існавала праграма асіміляцыі беларускай меншасці ў Польшчы. 13 верасня 1935 г. Польшча анулявала трактат Лігі нацый аб этнічных меншасцях, а ў снежні 1935 г. у Бярозе-Картузскай быў створаны канцлагер для апазіцыі і «сацыяльна недарэчных элементаў». У кастрычніку 1936 г. Міністэрства ўнутраных спраў падрыхтавала праект паскарэння нацыянальнай асіміляцыі беларусаў, а ў пачатку снежня была забаронена дзейнасць Таварыства беларускай школы (ТБШ). Указ 1938 г. «Аб адносінах дзяржавы да польскай аўтакефальнай праваслаўнай царквы» абмяжоўваў правы праваслаўных грамадзян, ім нават было забаронена набываць зямлю. Аб'ектамі неспрыяльнага стаўлення ўлад былі таксама Інстытут народнай гаспадаркі і культуры, «Беларуская газета», многія структуры мастацкай самадзейнасці. Афіцыйная Варшава поўнасцю ігнаравала справядлівыя культурныя патрабаванні беларускіх палітычных партый.

### *2. Культурныя здабыткі беларускага этнаса.*

Вялікі ўплыў на развіццё нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі аказала творчасць беларускіх пісьменнікаў М. Танка (Я.І. Скурко), П. Пестрака, В. Таўлая, Л. Родзевіча, М. Васілька, А. Салагуба, М. Засіма, Н. Арсеньевай, Х. Ільяшэвіча, П. Карузы, М. Краўцова, А. Стаповіча, М. Машары, У. Самойлы. Значны ўклад у выяўленчае мастацтва Заходняй Беларусі зрабілі мастакі Я. Горыд, Я. Драздовіч, П. Сергіевіч, М. Сеўрук, у музычную культуру – К. Галкоўскі, Л. Рагоўскі, М. Забэйда-Суміцкі. А. Грыневіч, Р. Шырма, Г. Цітовіч увайшлі ў гісторыю беларускай культуры як стваральнікі народных хораў і збіральнікі беларускіх народных песень.

Шырокую культурна-асветніцкую работу сярод насельніцтва вялі ТБШ, БСРГ і "Змаганне", якія пры сваіх клубах і бібліятэках-чытальнях стваралі гурткі мастацкай самадзейнасці, хоры. У рэпертуары гэтых творчых калектываў пераважалі беларускія народныя песні, п'есы "Паўлінка" і "Прымакі" Я. Купалы, "Антон Лата" Я. Коласа, "Модны шляхцюк" К. Каганца, "Атрута" М. Гарэцкага, "Збянтэжаны Саўка" Л. Родзевіча, "Суд" У. Галубка, "Мікітаў лапаць" М. Чарота, "Міхалка" Далецкіх, "У зімовы вечар" Э. Ажэшкі, а таксама шматлікія інсцэніроўкі. Сапраўднымі святамі беларускай культуры станавіліся вечары з выступленнямі мастацкіх калектываў, яны былі своеасаблівым пратэстам супраць палітыкі польскіх улад.

У навукова-асветніцкай галіне было шмат зроблена па лініі Беларускага навуковага таварыства (БНТ), якое мела на мэце пашырэнне ведаў, развіццё цікавасці сваіх членаў да навуковых даследванняў. Паводле статута, БНТ мела права ствараць і ўтрымліваць музеі, бібліятэкі, навуковыя ўстановы, наладжваць выставы, экскурсіі, лекцыі, курсы, сходы, праводзіць конкурсы, займацца выдавецкай працай. У 1921 г. пры БНТ быў адкрыты Віленскі беларускі гісторыка-этнаграфічны музей імя І. Луцкевіча. Існавала чатыры секцыі БНТ: музейная рада, гістарычная, літаратурна-мастацкая, мовазнаўчая секцыі. Да дзейнасці БНТ актыўнае дачыненне мелі А. Луцкевіч, Б. Тарашкевіч, А. Неканда-Трэпка, І. Дварчанін, І. Савіцкі, С. Паўловіч, С. Рак-Міхайлоўскі, Я. Станкевіч, В. Грышкевіч, М. Ільяшэвіч.

Актыўная выдавецкая дзейнасць некаторых устаноў спрыяла таму, што свет убачылі "Хрэстаматыя беларускае літаратуры. XI век – 1905 г." М. Гарэцкага (1922), "Хрэстаматыя новай беларускай літаратуры" (ад 1905 г.)" І. Дварчаніна (1927), зборнікі вершаў Л. Радзевіча ("На панявоненых гонях", 1928), М. Танка ("На этапах", 1936; "Жураўліны цвет", 1937; "Пад мачтай", 1938; паэма "Нарач", 1937) і інш. Значны ўклад у развіццё беларускай культуры ўнеслі Беларускае выдавецкае таварыства, Выдавецтва ТБШ, Выдавецтва Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры, Выдавецтва Беларускага сялянска-работніцкага клуба, Выдавецтва У. Знамяроўскага, Выдавецтва Б.А. Клецкіна.

### *3. Культура іншых народаў на землях Заходняй Беларусі.*

Істотнае месца ў структуры насельніцтва Заходняй Беларусі ў міжваенны час займалі палякі, яўрэі, украінцы, рускія, ішныя нацыянальнасці. Таму іх культурная спадчына абавязкова павінна ўлічвацца.

Польскі этнас быў тытульным у маштабах усёй польскай дзяржавы, але, строга кажучы, ніяк не мог быць тытульным у заходнебеларускім і заходнеукраінскім рэгіёнах. У названых рэгіёнах у структуры насельніцтва рашуча пераважалі аднайменныя этнасы. На тэрыторыі Заходняй Беларусі дзейнічала шмат польскіх арганізацый, якія мелі розныя задачы. Культурнае жыццё польскага этнаса наладжвалася мясцовымі ўладамі і грамадскімі аб'яднаннямі, важнейшай мэтай дзейнасці якіх было пашырэнне каштоўнасцей польскай культуры ў межах заходнебеларускіх зямель, нацыянальная ці дзяржаўная асіміляцыі мясцовага насельніцтва.

Большую частку гарадскога насельніцтва складалі яўрэі. У 1920–1930-я гг. Вызначальнае месца ў грамадскім і сямейным жыцці яўрэяў займалі каштоўнасці іудаізму, якія паранейшаму заставаліся фундаментам яўрэйскай культуры. У гэты час на тэрыторыі Заходняй Беларусі знаходзілася адна з самых вядомых і грунтоўных устаноў свету, дзе рыхтавалі равінаў – Мірская ешыва, якая прываблівала дзесяткі студэнтаў з Еўропы і Амерыкі.

Вялікая колькасць яўрэйскіх арганізацый, якія вылучаліся складанай структурай і рознай ідэалагічнай накіраванасцю, прадстаўляла сабой своеасаблівы, складаны свет, дзе вырашаліся вельмі важныя задачы культуры гэтага народа. Існавалі значныя супярэчнасці паміж рознымі яўрэйскімі ідэалагічнымі і палітычнымі лагерамі, сацыяльнымі групамі. Важную ролю у гэтым процістаянні адыгравала моўнае пытанне – падтрымка ідзіш ці іўрыта. Сіяніскія і сацыялістычныя партыі па-рознаму прадстаўлялі сабе будучыню яўрэйскага народа, што стала камянём раздора.

Адкрыццём і ўтрыманнем адукацыйных устаноў, бібліятэк, правядзеннем асветніцкай работы, культурна-масавых мерапрыемстваў, падтрымкай аматарскага мастацтва на тэрыторыі Заходняй Беларусі займаліся такія арганізацыі, як “Тарбут”, ЦЯША і іншыя. Гэта спрыяла захаванню этнічнай самабытнасці яўрэяў.

Руская нацыянальная меншасць не была шматлікай, аднак многія яе прадстаўнікі займалі надзвычай актыўную грамадскую пазіцыю, актыўна ўдзельнічалі ў культурным жыцці. Мясцовыя аддзелы рускіх арганізацый займаліся як грамадска-палітычнай, так і дабрачыннай працай, падтрымлівалі рускія навучальныя ўстановы і бібліятэкі. Вызна-чальным у захаванні свецкіх і рэлігійных каштоўнасцей рускай меншасці быў кансер-ватыўна-традыцыяналісцкі напрамак. Некаторая частка рускіх паддалася асіміляцыі, найбольшы адпор якой аказалі старабраднікі, якія змаглі захаваць сваё веравызнанне, мову і ўклад жыцця.

На беларуска-ўкраінскім памежжы разгортвалася дзейнасць украінскіх арганізацый: культурна-асветніцкага таварыства “Просвіта” – “Просвіта Палесся”, якое ажыццяўляла культурна-асветніцкую працу праз бібліятэкі-чытальні і народныя дамы, утрымлівала ўкраінскія школы, клапацілася пра захаванне гісторыка-культурнай спадчыны. У пачатку 1930-х гг. пад уплывам мэтанакіраванай палітыкі польскіх улад таварыства “Просвіта” на Палессі прыйшло ў заняпад. Заходнеўкраінскія нацыянальна-дэмакратычныя партыі і культурна-асветніцкія арганізацыі разглядалі Палессе, як частку ўкраінскай этнічнай тэрыторыі.

Развівалася і культура літоўскай нацыянальнай меншасці. Літоўская інтэлігенцыя і каталіцкае духавенства праводзілі грамадска-культурную дзейнасць, якой аказвалася матэрыяльная і маральная падтрымка з боку Літвы. Такія літоўскія арганізацыі, як “Рытас” і Св. Казіміра спрыялі адраджэнню нацыянальнай самасвядомасці літоўцаў на памежжы, хоць яна там заставалася слабай.

На тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1920–1930-я гг. пражывала невялікая група татараў, якія таксама мелі свае нешматлікія культурна-асветніцкія, навуковыя арганізацыі і ўстановы, сярод якіх выдзяляўся Культурна-асветніцкі саюз татараў Польшчы (КАСТП). Асноўнымі членамі такіх арганізацый былі нешматлікая свецкая інтэлігенцыя і татарская моладзь. Большая частка татарскай этнічнай меншасці імкнулася захаваць культуру, традыцыі татараў, іслама. Аднак у тыя часы назіраліся і некаторыя асіміляцыйныя працэсы, паланізацыя татарскай інтэлігенцыі.

Культурнае жыццё на землях Заходняй Беларусі ў складзе Польскай дзяржавы было вельмі разнастайным, у ім назіраліся шматлікія непаўторныя тэндэнцыі. Важную ролю ў культуры рэгіёна адыгрывалі нацыянальныя беларускія, польскія, рускія, яўрэйскія, татарскія і літоўскія арганізацыі.

### *Літаратура*

1. Вабішчэвіч, А.М. Нацыянальна-культурнае жыццё Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.): манаграфія. – Брэст: БрДУ, 2008.

2. Вабішчэвіч, А.М. Культура Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) Вучэбна-метадыч-ны матэрыял для настаўнікаў гісторыі. – Брэст: Выдавецтва С. Лаўрова, 1996. – 30 с.

3. Голубев В. Культура Беларуси в годы советской власти // http://kamunikat.fontel.net/www/czasopisy/filamaty/07/06.htm

4. Хаўратовіч, І. Заходняя Беларусь // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. / Рэдкал.: Г.П. Пашкоў (галоўны рэд.) [і інш.] – Мн.: БелЭн, 1996. – Т. 3 – С. 425.

**Тэма 8. Культура Беларусі ў часы Вялікай Айчыннай вайны.**

1. Культурныя працэсы на акупаванай тэрыторыі Беларусі.
2. Культурная праца беларусаў ва ўмовах эвакуацыі.

***1. Культурныя працэсы на акупаванай тэрыторыі Беларусі.***

У час акупацыі Беларусі нямецкімі войскамі беларуская культура развівалася ў рамках акупацыйнага рэжыму. З восені 1941 г. працягвалася школьнае навучанне. Былі адкрыты сярэднія адукацыйныя і прафесіянальныя школы ў Мінску, Маладзечне, Нясвіжы, Навагрудку, Браславе, Івянцы і інш. У кастрычніку 1941 г. генеральны камісар Беларусі загадаў адкрыць на яе тэрыторыі яслі, дзіцячыя садкі і школы для фольксдойчэ (этнічныя немцы, якія пражывалі на акупаванай тэрыторыі), якіх тут было вельмі мала. У некаторых раёнах існавалі толькі школы для фольксдойчэ (напрыклад, на Беласточчыне). Такія ўстановы працавалі ў Мінску, Драздах, Смалявічах, Гродна.

Аднак паступова пачалі аднаўляцца іншыя школы, настаўнікамі ў якіх, асабліва ў Заходняй Беларусі, часта працавалі палякі. Спачатку немцы ставіліся да іх станоўча, як да тых, каго праследавалі савецкія ўлады. З мая 1942 г. да восені 1943 г. на тэрыторыі Беларусі акупацыйнымі ўладамі праводзілася антыпольская кампанія, якая была накіравана супраць каталіцкага духавенства, інтэлігенцыі, работнікаў адміністрацыі. Паколькі вайна зацягвалася, немцы пайшлі на некаторыя саступкі мясцоваму насельніцтву – дазволілі друк, тэатр і школы на беларускай мове. Працаваў Мінскі гарадскі тэатр, дзе выступалі як прафесійныя акцёры, так і аматары.

Гэты тэатр існаваў на ўмовах самаакупальнасці, таму рэпертуар выбіраўся адпаведна густу гледача – п'есы дасавецкіх і савецкіх беларускіх аўтараў. Творы нямецкіх і італьянскіх класікаў ставіліся з улікам рэжыма акупацыі. Тэатры актыўна гастралявалі, у іх праграмах было шмат беларускіх народных песен і танцаў. Па сведчанні гісторыка Т.А. Дубоўскай, якая даследавала тэатральнае мастацтва на акупаванай тэрыторыі, не знойдзена ніводнага сведчання аб тым, што ставіліся п'есы, якія б неслі нацысцкія ідэі. Былі пастаўлены оперы "Лясное возера" і "Усяслаў Чарадзей" М. Шчаглова, створаны музычныя творы А. Туранкава, М. Равенскага.

У партызанскіх атрадах працавалі "лясныя школы", існавалі агітбрыгады, ансамблі, нават аркестры, якія выконвалі патрыятычныя савецкія творы.

У Беларусі, Германіі, Польшчы і Літве выдаваліся шматлікія перыядычныя выданні на беларускай мове: 27 газет, 14 часопісаў, 4 зборнікі нарматыўных і метадычных матэрыялаў і іншыя. У 1939 – 1945 гг. выйшлі 233 нумары штотыднёвіка "Раніца" на грошы спачатку вайсковага міністэрства Германіі, а потым Міністэрства акупаваных усходніх тэрыторый. Наклад гэтага выдання налічваў каля 12 тысяч асобнікаў. Галоўнай мэтай гэтага выдання была прапаганда фашысцкага рэжыма, выдаваліся таксама артыкулы пра беларускую літаратуру і культуру, біяграфіі беларускіх паэтаў і пісьменнікаў.

У Берліне друкавалася газета "Беларускі работнік", якая была разлічана на остарбайтэраў, апісвала іх "шчаслівае" жыццё ў Германіі, была сродкам прапаганды нямецкіх улад. Выходзілі такія беларускія перыядычныя выданні, як часопіс "Новы шлях", газеты "Беларуская газета", "Minsker Zeitung", вучэбныя дапаможнікі "Беларусь учора і сёння" Я. Найдзюка, "Беларускі правапіс" Я. Лёсіка, "Беларуская граматыка" Б. Тарашкевіча, паэтычныя зборнікі "Песняры Случчыны" і інш.

**_2. Культурная праца беларусаў ва ўмовах эвакуацыі._**

Плённая праца дзеля перамогі працягвалася і ва ўмовах эвакуацыі. Каля 100 эвакуіраваных з Беларусі акадэмікаў, членаў-карэспандэнтаў АН БССР, дактароў і кандыдатаў навук, звыш 400 артыстаў, каля 50 мастакоў, 22 кампазітары, вялікая колькасць работнікаў друку, асветы, аховы здароўя аддавалі сваю працу ўмацаванню савецкага тылу.

Супрацоўнікі і ўстановы Акадэміі навук Беларусі знаходзіліся ў эвакуацыі ў Ташкенце, Самаркандзе, Казані, Маскве. Шляхам пераадолення цяжкасцей, наладжвання сувязей з мясцовымі ўладамі і вышэйшымі дзяржаўнымі структурамі працягвалася плённая праца беларускіх навукоўцаў. У сакавіку 1942 г. у Казані і ў лістападзе 1942 г. у Ташкенце былі праведзены сесіі АН БССР, на якіх былі вызначаны прыярытэты ў працы ў ваенных умовах. У студзені 1944 г. у Маскве адбылася юбілейная сесія Акадэміі навук Беларусі, прысвечаная 25-годдзю БССР.

Усе свае намаганні навукоўцы сканцэнтравалі на даследваннях, вынікі якіх маглі быць скарыстаны для патрэб фронту, народнай гаспадаркі. Члены-карэспандэнты АН БССР Б.В. Ерафееў і А.М. Розін правялі важнае для абароннай прамысловасці даследаванне па вызначэнню знаходжання рэдкіх элементаў ванадыя і ліція ў горных пародах Урала-Волжскага рэгіёна. Працуючы начальнікам лабараторыі ва Усесаюзным інстытуце авіяцыйных матэрыялаў, Б.В. Ерафееў удзельнічаў таксама ў распрацоўцы і арганізацыі вытворчасці празрыстай брані з арганічнага шкла для самалётаў. Па выніках гэтай працы ён стаў лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі СССР.

Пад кіраўніцтвам акадэміка А.Я. Пракапчука у г. Сталінабадзе (Узбекістан) была арганізавана лабараторыя па вытворчасці стафілацыду, сульфатсульфідзіну, акрыхіну і іншых вельмі каштоўных медпрэпаратаў, якія паспяхова выкарыстоўваліся пры лячэнні гноевых захворванняў. Прафесар С.М. Мелкіх абгрунтаваў новы метад лячэння крупознага запалення лёгкіх, які шырока выкарыстоўваўся ў шпіталях.

Беларускія вучоныя-медыкі і практыкуючыя ўрачы ўносілі свой уклад у разгром ворага, працуючы таксама ў лячэбна-прафілактычных установах. Шмат хто з эвакуіраваных працаваў у ваенных шпіталях у тыле, рыхтаваў маладыя кадры ў мясцовых медыцынскіх інстытутах і вучылішчах.

У 1943 г. на станцыі Сходня пад Масквой аднавіў сваю дзейнасць Белдзяржуніверсітэт (каля 60 % залічаных на вучобу складала моладзь, эвакуіраваная з Беларусі), а ў Яраслаўлі — Мінскі медыцынскі інстытут. У савецкім тыле працавалі таксама калектывы шэрагу сярэдніх спецыяльных і іншых навучальных устаноў Беларусі (чыгуначныя, рамесныя вучылішчы, школы працоўных рэзерваў).

У той час інтэлігенцыя ўнесла значны ўклад ў ажыццяўленне агітацыйна-масавай, прапагандысцкай, культурна-асветніцкай работы. Творчая дзейнасць журналістаў, літаратараў, акцёраў, мастакоў была прасякнута сталінісцкімі ідэалагічнымі штампамі, аднак ва ўмовах таго часу антыфашысцкая накіраванасць перыядычных выданняў, мастацкіх твораў, бясспрэчна, мела станоўчы характар.

Ва ўмовах савецкага тылу, у Арле, Казані, Маскве, выходзіла газета «Савецкая Беларусь», друкаваліся агітплакаты «Раздавім фашысцкую гадзіну» і «Партызанская дубінка», амаль увесь тыраж якіх рознымі сродкамі дастўляўся ў акупіраваную Беларусь.

Актыўна ўдзельнічалі ў выдавецкай працы савецкіх выданняў ваеннага часу і літаратары, што выехалі з Беларусі на ўсход. Публіцыстычныя творы сталі галоўнымі ў іх літаратурнай дзейнасці ваеннага часу. Артыкулы і вершы Я. Купалы друкаваліся ў розных эвакуацыйных выданнях, выдаваліся ў адноўленым у Маскве дзяржаўным выдавецтве БССР, рабіліся лістоўкамі ў сотні тысяч экзэмпляраў («Не будзе беларус рабом нямецкіх баронаў», «Кліч да беларускага народа», «Беларускім партызанам» і інш.). Актыўна супрацоўнічаў з шэрагам сярэднеазіяцкіх выданняў Я. Колас: «Правда Востока», «Кзыл Узбекистан», «Фрунзевец» і інш. Толькі ў згаданых газетах ён надрукаваў каля сотні артыкулаў, адозваў, заклікаў, вершаў, апавяданняў. Прыкладна столькі ж адных толькі нарысаў змясціў у перыядычным друку ваеннага часу М. Лынькоў. Да паўсотні артыкулаў і антыфашысцкіх памфлетаў напісаў К. Чорны.

Аднак па-сапраўднаму буйных мастацкіх твораў гэтага часу адзначыць нельга. У чэрвені 1942 г. трагічна загінуў Я. Купала. На літаратурны працэс жудасны адбітак наклалі таксама страшэнныя сталінскія рэпрэсіі. Пільны партыйны нагляд за літаратурнай дзейнасцю не спрыяў плённаму развіццю гэтага віду мастацтва. Так, у красавіку 1943 г. вядучыя беларускія пісьменнікі, якія знаходзіліся ў Маскве, былі выкліканы ў ЦК КП(б)Б, дзе перад імі ў чарговы раз «былі пастаўлены задачы ў іх творчай рабоце» (як гаварылася ў паведамленні сродкаў масавай інфармацыі).

З Масквы вяліся перадачы радыёстанцыі «Савецкая Беларусь».

Плённа працавалі ў савецкім тыле эвакуіраваныя тэатры: тэатр імя Я. Купалы — у Томску, Віцебскі драмтэатр імя Я. Коласа — ва Уральску (Казахстан) і ў Арэхаве-Зуеве, Беларускі дзяржаўны тэатр оперы і балета — у Горкім, Дзяржаўны яўрэйскі драмтэатр БССР — у Навасібірску, Рускі драмтэатр БССР — у Маскве.

Драмтэатр імя Я. Купалы адкрыў першы ваенны сезон у Томску 2 верасня 1941 г. За кароткі тэрмін былі зроблены дэкарацыі, пашыты касцюмы, перакладзены тэксты на рускую мову, адроджаны ўсе лепшыя спектаклі, падрыхтаваны новыя. Усяго за час знаходжання ў эвакуацыі калектыў тэатра здзейсніў пастаноўку 25 спектакляў. У садружнасці з Горкаўскім оперным тэатрам імя Пушкіна Беларускі тэатр оперы і балета паставіў класічныя творы опернага мастацтва — «Яўген Анегін», «Кармэн», «Севільскі цырульнік», распачаў працу над новай операй «Алеся» — аб гераічнай барацьбе беларускіх партызан.

Не спынялася ў час вайны і дзейнасць беларускіх кампазітараў. У 1941—1943 гг. Я. Цікоцкі, А. Багатыроў, М. Аладаў, Р. Пукст, І. Любан і іншыя дзеячы музычнага мастацтва напісалі больш за 200 твораў розных жанраў. Беларускія кампазітары садзейнічалі развіццю музычнай культуры рэспублік Савецкага Саюза, якія далі ім прытулак у ваенны час. М.Чуркін зрабіў каля 100 апрацовак таджыкскіх народных песняў, Я. Цікоцкі апрацаваў шэраг башкірскіх народных песняў, А. Клумаў удзельнічаў у стварэнні музычнай драмы «Меч Узбекістана».

Распаўсюджанай з'явай былі канцэрты беларускай музыкі, выступленні беларускіх ансамбляў. Двойчы ў Маскве, у маі 1942 г. і студзені 1943 г., адбыліся паказы беларускага мастацтва. Гледачы з вялікім энтузіязмам сустрэлі выступленні вядомых артыстаў рэспублікі, новыя творы беларускіх кампазітараў.

Плённай была творчасць мастакоў і скульптараў. Дзеячы беларускага выяўленчага мастацтва сталі майстрамі палітычнага плаката, графічнай антыфашысцкай сатыры, актыўна ўдзельнічалі ў выпуску такіх ілюстраваных выданняў, як «Раздавім фашысцкую гадзіну» і «Партызанская дубінка». У 1943 г. на выстаўцы ў Маскве экспаніравалася звыш 300 карцін беларускіх мастакоў. У 1944 г. была арганізавана выстава ў Навасібірску, прысвечаная 25-годдзю БССР. Адбыліся таксама выставы ў Куйбышаве, Свярдлоўску, Самаркандзе.

Шырокую вядомасць і прызнанне сваімі скульптурнымі партрэтамі герояў Айчыннай вайны набыў у гэты час З. Азгур.

Дзеячы беларускага кіно, кінагрупы, што працавалі ў Алма-Аце і Маскве, стварылі ў 1942-1943 гг. два фільмы, прысвечаныя роднай зямлі, змаганню свайго народа супраць фашызму, а таксама 14 гукавых кіначасопісаў «Савецкая Беларусь».

Беларуская інтэлігенцыя прымала ўдзел у грамадска-палітычных мерапрыемствах, што праводзіліся ў тыле. Скіраванасць гэтых мерапрыемстваў была найперш антыфашысцкай, і таму ўдзел вучоных, пісьменнікаў, журналістаў, іншых інтэлігентаў у сходах, мітынгах, іншых грамадскіх дзеях, іх выступленні, прамовы былі шчырымі і ўзнёслымі. Інтэлігенцыя была арганізатарам антыфашысцкіх мітынгаў прадстаўнікоў беларускага народа, што адбыліся ў 1942 г. у Маскве. У пачатку 1943 г. у Маскве быў таксама праведзены спецыяльны сход прадстаўнікоў інтэлігенцыі Беларусі (сабралася каля 500 вядомых вучоных, літаратараў, артыстаў, кампазітараў, мастакоў, архітэктараў, інжынераў, грамадскіх дзеячоў БССР). Даклады, прамовы, што прагучалі, завяршыліся зваротам сходу да беларускага народа. Зварот быў аператыўна данесены да людзей праз сродкі масавай інфармацыі.

Беларускія пісьменнікі актыўна ўдзельнічалі ў літаратурных вечарынах, акцёры выступалі на прадпрыемствах і ў калгасах. Інтэлігенцыя актыўна садзейнічала збору сродкаў у фонд Чырвонай Арміі, рэалізацыі ваенных займаў.

У гэты ж час тысячы інтэлігентаў з Беларусі, якія безпадстаўна адбывалі пакаранне ў сталінскім ГУЛАГу, на Поўначы, у Сібіры і Казахстане, на Далёкім Усходзе, сваёй працай таксама набліжалі Перамогу. Беларускаму літаратару А. Звонаку цудам пашчасціла выжыць, выйсці пасля вайны з сталінскіх лагераў, аднак горшая доля напаткала тысячы іншых сыноў і дачок Беларусі. Несучы на сабе кляймо неабгрунтаваных палітычных рэпрэсій, яны знясільваюча працавалі на патрэбы вайны, фронту на лесапавалах і рудніках, на пракладцы чыгунак, у іншых месцах, выносілі нястачы, голад і холад. Аднак атрымлівалі новыя тэрміны зняволення, здзекі і жорсткасць, бесчалавечае абыходжанне варты, заўчасна адыходзілі ў нябыт.

Вялікі ўклад ва ўздым гаспадаркі, гарадскога жыцця ўносілі сваей працай тэхнічныя спецыялісты: будаўнікі, дойліды. Летам 1942 г. СНК БССР стварыў у Маскве з спецыялістаў групу па будаўніцтву. У яе функцыі ўваходзіла падрыхтоўчая праца, улік архітэктурных і інжынерна-будаўнічых кадраў. У канцы 1942 г. у Маскве адбылося пашыранае пасяджэнне праўлення Саюза архітэктараў Беларусі. Абмяркоўваліся даклады «Аб задачах архітэктараў Беларусі ў дні Айчыннай вайны», «Аб вопыце аднаўлення гарадоў і населеных пунктаў, разбураных нямецка-фашысцкімі акупантамі». Патра-

авалася распрацоўка новых генеральных планаў забудовы пацярпелых паселішчаў. З ;тай мэтай пры СНК БССР у маі 1943 г. была створана архітэктурна-планіровачная айстэрня, якую ўзначаліў прафесар І. Лангбард.

***Літаратура***

1. Дубоўская, Т.А. Тэатральная дзейнасць як адзін з кірункаў сацыяльна-культурнай алітыкі падчас нямецка-фашысцкай акупацыі Беларусі // Беларусь в годы Великой )течественной войны: уроки истории и современность: Материалы междунар. науч. энф., посвящённой 60-й годовщине освобождения Беларуси от немецко-фашистских ахватчиков. Минск, 29 – 30 июня 2004 г. – Мн.: Институт истории НАН Беларуси, 2004. – :. 198–201.

2. Коваль, В.У. Беларускамоўныя выданні ў Германіі перыяду Другой сусветнай вайы: агляд тэматыкі // Беларусь в годы Великой Отечественной войны: уроки истории и эвременность: Материалы междунар. науч. конф., посвящённой 60-й годовщине освобождения Беларуси от немецко-фашистских захватчиков. Минск, 29 – 30 июня 2004 г. – Лн.: Институт истории НАН Беларуси, 2004. – С. 201–203.

3. Конан, У. Культура // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. / Беларус. Энцыкл.; эдкал.: Г. П. Пашкоў (галоўны рэд.) [і інш.] – Мн.: БелЭн, 1997. – Т. 4 – С. 300.

4. Крывашэй, Д.А. Нацыянальныя супольнасці Беларусі ў перыяд германскай купацыі (чэрвень 1941 – ліпень 1944 г.). – Мн.: Бел. Навука, 2009. – 198 с.

5. Парашкоў, С.А. Гісторыя культуры Беларусі. – Мн.: Бел. навука, 2004. – С. 294–303.

**Тэма 9. Культурнае жыццё ў БССР (сярэдзіна 1940-х – сярэдзіна 1960-х гг.)**

1. Айчынная культура ў час агоніі сталінскага рэжыма.
2. Культурныя працэсы ў час хрушчоўскай адлігі.

***1. Айчынная культура ў час агоніі сталінскага рэжыма.***

Пасляваенная беларуская культура, як і культура іншых народаў СССР, была пастаўлена на службу таталітарызму, зацвярджэнню культа асобы Сталіна. Дзяржаўныя выдаткі на культуру і прапаганду ў той час былі вельмі высокімі. Практычна ў кожным населеным пункце меліся бібліятэкі, клубы, дамы культуры. Аднак літаратура, кінафільмы, спектаклі даходзілі толькі тыя, якія былі дазволены цэнзурай.

Да 1949 г. 96 % газет і кніг на Беларусі друкаваліся на беларускай мове. Аднак ужо з 1950 г. пачалося змяншэнне колькасці друкаванай прадукцыі, якая выдавалася па-беларуску. У 1955 г. ужо больш за 30 % кніг і 20 % газет выдаваліся на рускай мове і працэс гэты пастаянна паскараўся.

Паводле дырэктывы ЦК КП(б)Б 1947 г., асноўнымі тэмамі беларускай літаратуры павінны былі стаць барацьба беларускага народа з фашысцкімі акупантамі і прапаганда дасягненняў партыі па ўздыму дабрабыту савецкіх людзей. Дзейнасць цэнзуры была накіравана на тое, каб не прапусціць у друк творы, у якіх утрымлівалася інфармацыя аб існаванні беларускай дзяржаўнасці і дасавецкай улады, у якіх усхвалялася любоў да роднай зямлі і народа, падкрэслівалася своеасаблівасць беларускай нацыянальнай культуры, традыцый і г. д. Ставілася задача на ўсхваленне тагачаснай рэчаіснасці і ролі кампартыі ў паляпшэнні жыцця людзей.

Яскравае імкненне ўвекавечыць перамогу савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне прасочвалася ў архітэктуры Беларусі канца 1940-х – пачатку 1950-х гг. Таму невыпадковым было выкарыстанне архітэктурнай спадчыны ў стылі класіцызму з яе веліччу і трыумфальнасцю. У адзіным стылі вытрымана кампазіцыя Ленінскага праспекта ў Мінску (зараз праспект Незалежнасці). Бясспрэчным дасягненнем беларускіх архітэктараў стаў ансамбль плошчы Перамогі ў Мінску. Найбольш велічныя пабудовы стварылі архітэктары А. Воінаў, У. Кароль, М. Паруснікаў.

У першае пасляваеннае дзесяцігоддзе беларускія жывапісцы імкнуліся перадаць настроі чалавека-пераможцы, паказаць стваральную працу людзей у мірны час. У рэалістычных традыцыях напісаны палотны І. Ахрэмчыка "Абарона Брэсцкай крэпасці", Я. Зайцава "Парад беларускіх партызан у 1944 годзе ў Мінску", В. Волкава "Мінск. 3 ліпеня 1944 г."

Адразу пасля вызвалення Беларусі прыкладаецца шмат намаганняў, скіраваных на культурнае аднаўленне БССР. Ужо ў 1944 г. распачаліся будаўніцтва і рамонт школ, аднавіліся заняткі. У 1946/47 навучальным годзе на Беларусі працавала 11 тыс. 300 школ. Важнай праблемай стала атрыманне адукацыі тымі падлеткамі, якія ўжо працавалі на вытворчасці. З гэтай мэтай з 1944 г. праводзілася работа па стварэнню школ рабочай моладзі і вячэрніх школ сельскай моладзі. Колькасць такіх навучальных устаноў няўхільна павялічвалася: у 1945/46 навучальным годзе ў БССР працавалі 73 школы рабочай моладзі (7 тыс. 167 вучняў) і 366 школ сельскай моладзі (14 тыс. 113 вучняў). У 1950/51 навучальным годзе колькасць школ рабочай моладзі вырасла да 230 (30 тыс. 764 чалавекі), школ сельскай моладзі – да 714 (22 тыс. 401 чалавек). Галоўнае пытанне ў станаўленні адукацыі заходніх абласцей БССР – барацьба з непісьменнасць і мала-

пісьменнасцю. Да 1950 г. грамаце было навучана больш за 370 тыс. непісьменных і каля 534 тыс. малапісьменных жыхароў Заходняй Беларусі. Першая пасляваенная пяцігодка (1946 – 1950 гг.) паставіла перад галіной народнай адукацыі Беларусі задачу ажыццяўлення абавязковага пачатковага навучання і пераход да ўсеагульнага 7-гадовага навучання.

Развіццё беларускай культуры пасля перамогі вызначаецца супярэчлівасцю. З аднаго боку, актыўна аднаўлялася сістэма адукацыі, з руін падымаліся гарады, ствараліся помнікі, прысвечаныя героям Вялікай Айчыннай вайны. З іншага боку, звужалася сфера выкарыстання беларускай мовы, абмежаванай была тэматыка мастацкіх твораў.

### *2. Культурныя працэсы ў час хрушчоўскай адлігі.*

Адносная лібералізацыя грамадскага жыцця пасля смерці Сталіна аказала значны ўплыў на дзейнасць пісьменнікаў і паэтаў. У аповесці «На Быстрынцы» (1954 г.) Я. Брыль паказаў усю складанасць жыцця простых людзей у пасляваеннай беларускай вёсцы. Аднак гэты твор адразу ж быў раскрытыкаваны афіцыйнай крытыкай «за ачарненне савецкай рэчаіснасці». Значнай доляй праўдзівасці (з улікам сітуацыі таго часу) адрозніваліся раманы П. Пестрака «Сустрэнемся на барыкадах» і М. Лынькова «Векапомныя дні». У гэты час у беларускай драматургіі з'яўляюцца творы А. Макаёнка, п'есу якога «Выбачайце, калі ласка!» ставілі лепшыя тэатры краіны. Аднак адразу ж пачалася барацьба партыі «за чысціню рэпертуара» беларускіх тэатраў, выкрэсліваліся не толькі творы нацыянальнай тэматыкі, але і творы заходнееўрапейскай класікі, як «нізкапробныя і пошлыя п'есы замежных драматургаў». Асаблівай крытыцы падвяргаўся Дзяржаўны яўрэйскі тэатр, які абвінавачваўся ў ідэалізацыі мінулага і прапагандзе нізкапаклонства перад Захадам. Справа скончылася тым, што тэатр закрылі, а многія акцёры і рэжысёры былі рэпрэсіраваны.

Неабходна адзначыць, што, нягледзячы на велізарны ідэалагічны, маральны і сілавы ціск на беларускую інтэлігенцыю, культурнае жыццё ніколі поўнасцю не замірала і ніколі поўнасцю не падпарадкоўвалася дыктату. Маладыя дзеячы культуры часта вярталіся да забароненых раней нацыянальных тэм і твораў. Так, кампазітар Д. Лукас напісаў оперу «Кастусь Каліноўскі», Г. Пукст оперу «Машэка», у якіх паказаны вобразы барацьбітоў за нацыянальную ідэю.

Значныя змены адбыліся ў развіцці беларускай культуры ў перыяд хрушчоўскай «адлігі» 1960-х гг. На радзіму ў масавым парадку вярталіся дзеячы культуры — вязні ГУЛАГа. Пачаўся частковы працэс пасмяротнай рэабілітацыі дзеячоў культуры Беларусі, якія загінулі ў гады сталінскага тэрора. Былі рэабілітаваны Сымон Баранавых, Васіль Шашалевіч, Міхась Чарот, Платон Галавач, Міхась Зарэцкі, Уладзіслаў Галубок, Тодар Кляшторны, Юлій Таўбін і іншыя прадстаўнікі творчай інтэлігенцыі.

Разам з тым, з прыходам да ўлады М.С. Хрушчова, рэзка ўзраслі русіфікатарскія тэндэнцыі ў культуры, што прывяло да звужэння сферы выкарыстання беларускай мовы. Рэзка зменьшылася колькасць выданняў на беларускай мове, да 1960 г. наклады беларускамоўных і рускамоўных газет амаль зраўняліся. У маі 1957 г. была прынята пастанова Савета Міністраў БССР «Аб удакладненні і частковым змяненні існуючага правапісу», якая яшчэ больш уніфікавала беларускую мову, скасаваўшы некаторыя яе

характэрныя рысы для яшчэ большага збліжэння з рускай. Гэта тлумачылася тым, што ў пасляваенны перыяд на Беларусь прыехалі будаўнікі з іншых рэспублік, была абвешчана палітыка інтэрнацыяналізацыі, што прывяло да пашырэння рускай мовы і размывання нацыянальнай самасвядомасці.

Аднак сярод літаратараў адбываліся значныя змены. З сталінскіх канцлагераў вярнуліся вядомыя пісьменнікі: Андрэй Александровіч, Рыгор Бярозкін, Сяргей Грахоўскі, Уладзімір Дубоўка, Алесь Звонак, Язэп Пушча, Мікола Хведаровіч, Станіслаў Шушкевіч і іншыя. Яны актыўна ўключыліся ў беларускі літаратурны працэс.

У гэты час пачынаюць сваю творчую дзейнасць паэты Рыгор Барадулін, Анатоль Вярцінскі, Алег Лойка, Генадзь Бураўкін, Васіль Зуёнак, паэтэсы Данута Бічэль-Загнетава, Раіса Баравікова, Ніна Мацяш, Таіса Бондар, Яўгенія Янішчыц, Галіна Каржанеўская. У 1950-х гг. таленавіты пісьменнік і паэт Уладзімір Караткевіч звярнуўся да фактычна забароненай тэмы гістарычнай прозы. Яго раманы «Каласы пад сярпом тваім», «Хрыстос прызямліўся ў Гародні», «Чорны замак Альшанскі» знайшлі шырокі водгук і падтрымку сярод насельніцтва.

Павялічвалася колькасць дзяржаўных сродкаў, выдаткаваных на развіццё куль-туры, што спрыяла значным дасягненням у яе развіцці. У канцы 1950-х – пачатку 1960-х гг. у Беларускай ССР была завершана работа па ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці дарослага насельніцтва. БССР стала рэспублікай суцэльнай пісьменнасці. У СССР і БССР праводзіліся шматлікія рэформы і рэарганізацыі сістэмы школьнай адукацыі, рамантаваліся і будаваліся новыя школы, наладжваўся выпуск вучэбнай літаратуры, вырашалася праблема настаўніцкіх кадраў.

У 1958 – 1964 гг. ажыццяўлялася школьная рэформа з мэтай набліжэння школы да патрэб вытворчасці. З гэтай нагоды ўводзілася абавязковае 8-гадовае навучанне. Сярэдняя адукацыя працягвалася 11 гадоў і суправаджалася вытворчым навучаннем, якое насіла, аднак, фармальны характар. Пашыралася сетка вячэрніх школ. Хутка стала відавочным, што рэформа не дасягнула сваёй мэты: прафесійная падрыхтоўка школьнікаў была недастатковай, выпускнікі школ не ішлі працаваць у сферу вытворчасці, а імкнуліся працягваць адукацыю ў вышэйшых навучальных установах. З 1964 г. адбыўся пераход да 10-гадовай сярэдняй адукацыі, прафесійная падрыхтоўка стала неабавязковай.

З сярэдзіны 1950-х гг. беларускія мастакі паступова адмаўляюцца ад пафасу і апісальнасці, для іх твораў становяцца характэрнымі лаканічнасць і прастата. Выпрацоўваецца своеасаблівы суровы стыль, для якога характэрны ўмоўнасць, стылізацыя, уласцівыя манументальнаму жывапісу. У такім стылі выкананы творы народнага мастака СССР М. Савіцкага. Яго першыя работы з'яўляюцца ў канцы 1950-х гг. Галоўная тэма творчасці – тэма Вялікай Айчыннай вайны. Вядомасць набылі работы М. Савіцкага "Партызаны", "Віцебскія вароты", "Аршанскія партызаны", "Партызаны. Блакада", "Пакаранне смерцю", "Партызанская мадонна", цыкл "Лічбы на сэрцы", дзе паказаны асабіста перажытыя мастаком жахі фашысцкіх канцлагераў.

Тэме вайны і партызанскай барацьбы прысвечаны палотны А. Шыбнёва, П. Гаўрыленкі, Я. Зайцава, В. Волкава і іншых беларускіх мастакоў. Гераічная тэма праходзіць праз творчасць скульптара З. Азгура, які стварыў серыю партрэтаў герояў вайны і партызан, дзяржаўных і партыйных дзеячоў, Герояў Сацыялістычнай Працы.

З сярэдзіны 1950-х гг. архітэктары адмовіліся ад класіцызму, архітэктура становіцца ольш стрыманай і функцыянальнай. На аснове тыпавых праектаў вялося жыллёвае удаўніцтва. Цэнтры гарадоў забудоўваліся ансамблямі, распрацаванымі паводле інды-ідуальных праектаў. Некаторыя з іх сталі значнымі помнікамі беларускай архітэктуры: алацы мастацтва і спорту, павільён ВДНГ, Тэатр музычнай камедыі, будынак цырка ў омелі, кінатэатр "Кастрычнік", новы корпус БНТУ ў Мінску, драматычны тэатр у Гродна. выглядзе ансамбляў праектаваліся цэнтральныя вуліцы і праспекты ў Мінску і аб-асных гарадах.

Беларускае мастацтва гэтага перыяду дасягнула высокага ўзроўню развіцця, зорчасць маладых таленавітых мастакоў, кампазітараў, пісьменнікаў і паэтаў спрыяла яўленню шматлікіх твораў у розных відах мастацтва.

***Літаратура***


1. Голубев В. кандидат исторических наук. Культура Беларуси в годы советской власти // ttp://kamunikat.fontel.net/www/czasopisy/filamaty/07/06.htm
2. Лыч Л. Гісторыя культуры Беларусі / Л. Лыч, У. Навіцкі. — Мінск: Экаперспектыва, 996. - С. 326 – 463.
3. Парашкоў, С.А. Гісторыя культуры Беларусі. - Мн.: Бел. навука, 2004. - С. 304 – 305.
4. Кузьменка, У. Інтэлігенцыя Беларусі ў эвакуацыі на вызваленай тэрыторыі эспублікі (1943-1945 гг.) // www.homoliber.org/.../xx010111.html
5. gistbel.ru/.../75-kultura-belaruskaj-ssr-u-1950-ya-pershaj-palove.html

## Тэма 10. Супярэчлівыя працэсы ў культурнай сферы БССР (сярэдзіна 1960-х – першая палова 1980-х гг.).

1. Дасягненні ў галіне культуры.
2. Нарастанне крызісу ідэалагічнай сістэмы.

### *1. Дасягненні ў галіне культуры.*

У сярэдзіне 1960-х гг. – першай палове 1980-х гг. можна адзначыць істотныя здабыткі ў галіне айчыннай літаратуры. У 1960-х гг. у беларускай літературы з'явілася яшчэ адно імя сусветнага маштаба – пісьменнік Васіль Быкаў. Ён пісаў аб падзеях Вялікай Айчыннай вайны так, як бачыў яе сам, апісваў тое, што сам перажыў. Яго першыя аповесці «Трэцяя ракета», «Жураўліны крык», «Мёртвым не баліць» – сведчанне не толькі творчага таленту пісьменніка, але яшчэ і паказчык мужнасці і сумленнасці чалавека. Адразу ж В. Быкава пачалі абвінавачваць у «скажэнні праўды вайны», імкненні адцягнуць увагу чытача ад адзіна правільных арыенціраў у разуменні жыцця краіны ў цяжэйшы для яе час. У сваіх творах В. Быкаў таксама звяртае ўвагу на партызанскую тэматыку. Яго аповесці «Круглянскі мост», «Сотнікаў», «Абеліск», «Воўчая зграя», «Пайсці і не вярнуцца», «Знак бяды» ўзнялі даследаванне праблемы «чалавек і вайна» з чыста ваеннага на жыццёва-чалавечы узровень, разглядаючы многія праблемы (у прыватнасці праблему выбару) з пазіцыі дабра і зла, сумлення, чалавечнасці ў любой сітуацыі.

Патрэбна таксама адзначыць імёны народных паэтаў Беларусі П. Броўкі і М. Танка, цікавейшых літаратараў К. Крапівы, І. Шамякіна, А. Адамовіча, драматурга А. Макаёнка, які з'яўляецца аўтарам вядомых п'ес «Лявоніха на арбіце», «Зацюканы апостал», «Трыбунал», «Таблетку пад язык», «Дыхайце ашчадна» і інш.

У пачатку 1980-х гг. смела ўвайшоў у драматургію яшчэ адзін малады беларускі аўтар – Аляксей Дудараў. Яго п'есы "Выбар", "Парог", "Апошні ўзлёт", "Вечар", "Радавыя" з поспехам ставіліся не толькі ў беларускіх тэатрах, але і ў многіх тэатрах Савецкага Саюза.

У 1970–1980 гг. толькі тры тэатральныя калектывы краіны працавалі на беларускай мове. Аднак, нягледзячы на гэта, пашыралася прапаганда нацыянальнага мастацтва. Гэта адбылося дзякуючы з'яўленню новых твораў маладых беларускіх драматургаў. Акрамя названых твораў А. Макаёнка і А. Дударава, у гэты час убачылі свет п'есы "Адкуль грэх?" і "Напісанае застанецца" А. Петрашкевіча, "Плач перапёлкі" І. Чыгрынава, "Званы Віцебска" У. Караткевіча, "Апошні шанц" В. Быкава, "Амністыя" М. Матукоўскага і інш. У беларускіх театрах у гэты час працавалі такія таленавітыя майстры сцэны, як Здзіслаў Стома, Стэфанія Станюта, Марыя Захарэвіч, Павел Кармунін, Мікалай Яроменка, Лілія Давідовіч і інш.

Вельмі шмат для адраджэння гістарычнай памяці беларускага народа, прапаганды беларускай нацыянальнай культуры не толькі ў сваёй краіне, але і ва ўсім свеце зрабілі такія мастакі, як Леанід Шчамялёў, Май Данцыг, Міхаіл Савіцкі, Анатоль Анікейчык, Аляксей Марачкін, Фелікс Янушкевіч, Мікола Купава, Уладзімір Тоўсцік, Алесь Шатэрнік, Яўген Кулік, Уладзімір і Міхаіл Басалыгі.

Пэўная ўвага надаецца аднаўленню гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі. Распрацоўваюцца дзяржаўныя праграмы па рэстаўрацыі помнікаў архітэктуры і горадабудаўніцтва. У Мінску была праведзена рэстаўрацыя Траецкага і Ракаўскага прадмесцяў. Верхні горад у Мінску быў уключаны ў спіс помнікаў усесаюзнага значэння.

У 1960 – 1970-я гг. інтэнсіўна развівалася манументальнае мастацтва Беларусі. На дзяржаўным узроўні вырашаюцца пытанні аб узвядзенні велічных мемарыяльных комплексаў, найбольш значныя з іх "Хатынь", Курган Славы Савецкай Арміі, "Брэсцкая крэпасць-герой" і інш.

Мемарыяльны комплекс "Хатынь" быў адкрыты ў 1969 г. у дні святкавання 25-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Яго аўтары – скульптар С. Селіханаў, архітэктары Ю. Градаў, В. Занковіч, Л. Левін. Асноўную сэнсавую нагрузку ў мемарыяле нясе скульптура С. Селіханава "Няскораны чалавек" – выява старога з забітым хлопчыкам на руках. У 1970 г. праца аўтарскага калектыву была адзначана Ленінскай прэміяй.

Мемарыяльны комплекс "Брэсцкая крэпасць-герой" быў адкрыты ў 1971 г. Над яго будаўніцтвам працаваў вялікі аўтарскі калектыў на чале са скульптарам А. Кібальнікавым. У склад калектыву ўваходзілі скульптары А. Бембель, У. Бабыль, архітэктары У. Кароль, В. Волчак, В. Занковіч, Ю. Казакоў, А. Стаховіч, Г. Сысоеў. "Брэсцкая крэпасць-герой" – маштабны скульптурна-архітэктурны комплекс, які арганічна спалучае элементы ландшафту, руіны былой крэпасці і скульптурныя групы.

У канцы 1970-х гг. быў завершаны пераход да ўсеагульнай сярэдняй адукацыі моладзі. Гэта з'явілася яшчэ адным важным дасягненнем беларускага народа. Аднак знізіліся выдаткі на патрэбы агульнаадукацыйнай школы. Так, калі ў сярэдзіне 1960-х гг. яны складалі 6 7 % валавога нацыянальнага даходу, то ў пачатку 1980-х – толькі 4,2 %. Звужалася сфера выкарыстання беларускай мовы ў сістэме адукацыі. У сярэдзіне 1980х гг. толькі 21,3 % школ і 19,3 % дашкольных устаноў працавалі на беларускай мове. Падобнае становішча тлумачылася некалькімі прычынамі. Па-першае, гістарычнай і марфалагічнай блізкасцю беларускай і рускай моў; па-другое, статусам рускай мовы як мовы міжнацыянальных зносін; і, нарэшце, наяўнасцю для бацькоў права вырашаць пытанне аб мове навучання сваіх дзяцей і вызваляць іх ад вывучэння беларускай мовы.

Далёка за межамі Беларусі становяцца вядомымі кінематаграфічныя творы. Ваенная тэма зрабіла славу беларускаму кіно, хаця кінематограф не абмяжоўваўся толькі ёю. В. Тураў экранізаваў раман-эпапею І. Мележа "Людзі на балоце". Таксама на кінастудыі "Беларусьфільм" здымаюцца кінастужкі па творах рускай літаратурнай класікі і ствараюцца дзіцячыя фільмы-казкі. Штогод кінастудыя "Беларусьфільм" выпускала на экраны да 70 мастацкіх, дакументальных і навукова-папулярных фільмаў.

У 1960-я – 1980-я гг. стваралася вялікая колькасць музычных твораў. Беларускія кампазітары не толькі звярталі ўвагу на падзеі нацыянальнай гісторыі, але і выкарыстоўвалі сюжэты з гісторыі іншых народаў, напрыклад, опера "Джардана Бруна" С. Картэса, балеты "Тыль Уленшпігель", "Маленькі прынц" Я. Глебава і інш. У бе-ларускай музыцы раскрыліся творчыя здольнасці кампазітараў А. Багатырова, Д. Смольскага, А. Мдзівані.

Вядомыя беларускія кампазітары І. Лучанок і Э. Ханок шмат рабілі для папулярызацыі беларускай музыкі далёка за межамі нашай рэспублікі. Гэтаму садзейнічала і творчасць вакальна-інструментальных ансамбляў "Песняры" пад кіраўніцтвам У. Мулявіна, "Верасы" пад кіраўніцтвам В. Раінчыка, "Сябры" пад кіраўніцтвам А. Ярмоленкі і інш.

***2. Нарастанне крызісу ідэалагічнай сістэмы.***

Праблемныя палі ў культурным развіцці Беларусі ў сярэдзіне 1960-х – першай палове 1980-х гг. былі вызначаны нарастаннем крызісу ідэалагічнай сістэмы ў СССР. Афіцыйная дзяржаўная ідэалогія ўсё больш разыходзілася з савецкімі рэаліямі. Саратнікі Л. Брэжнева спачатку пахавалі касыгінскую рэформу, затым ніяк не адрэагавалі на новыя выклікі, звязаныя з пераходам Захаду да стадыі постіндустрыяльнай цывілізацыі. Усё гэта вяло да сістэмнага крызісу савецкага грамадства. Каб адцягнуць увагу грамадства ад дадзенай надзвычай трывожнай тэндэнцыі, яны прыдумала міф аб пабудове ў краіне развітога сацыялізму. КПСС строга патрабавала ад дзеячоў культуры будаваць творчую дзейнасць у рэчышчы гэтага міфа. Ідэолагі развітога сацыялізму груба ігнаравалі беларускую культуру. Іх беларускія аднадумцы ў перыяд распрацоўкі Канстытуцыі БССР 1977 г. нават не ставілі пытанне аб дзяржаўным статусе беларускай мовы.

З кожным годам усё больш адчувалася заганасць астатковага прынцыпу выдаткаў на культуру. Затое камуністычная наменклатура вельмі захапілася гонкай узбраенняў, што яшчэ больш абмяжоўвала фінансаванне для культурных новабудоўляў, фінансавую падтрымку для творчых работнікаў.

Такім чынам, на хвалі хрушчоўскай "адлігі", у 1970–1980-я гг. у беларускую культуру прыйшлі новыя пакаленні літаратараў, мастакоў, рэжысёраў і акцёраў, якія шмат увагі надавалі развіццю і прапагандзе беларускага нацыянальнага мастацтва і культуры. Іх працы можна было разглядаць як праявы аўтарскай незалежнасці. У першую чаргу патрэбна адзначыць імёны вядомых усяму свету А. Адамовіча, В. Быкава, У. Караткевіча, С. Алексіевіч. Менавіта ў беларускай літаратуры пазначыліся новыя падыходы да праблем вайны ("Я з вогненнай вёскі..."А. Адамовіча, Я. Брыля, У. Калесніка і "У вайны не жаночы твар" С. Алексіевіч). Працягвалася пачатае У. Караткевічам адраджэнне беларускай гістарычнай аповесці такімі літаратарамі, як А. Лойка, К. Тарасаў, Л. Дайнека, У. Арлоў. Відавочна, што, нягледзячы на палітычныя ўплывы, беларуская культура не знікла, не страціла свой твар, таму магчымым стала новае беларускае адраджэнне, якое пачалося ў 1990-х гг.

***Літаратура***


1. Голубев, Валентин. кандидат исторических наук. Культура Беларуси в годы советской власти // http://kamunikat.fontel.net/www/czasopisy/filamaty/07/06.htm

2. Лыч Л. Гісторыя культуры Беларусі / Л. Лыч, У. Навіцкі. — Мінск: Экаперспектыва, 1996. – С. 364 – 400.

3. Парашкоў, С.А. Гісторыя культуры Беларусі. – Мн.: Бел. навука, 2004. – С. 320 – 334.

4. gistbel.ru/.../75-kultura-belaruskaj-ssr-u-1950-ya-pershaj-palove.html

## Тэма 11. Беларуская культура ў часы перабудовы (1985 – 1991 гг.)

1. Перадумовы змен у духоўным жыцці беларускага народа.
2. Пачатак беларусізацыі.
3. Беларускае мастацтва ва ўмовах перабудовы.

***Перабудова*** – курс на рэфармаванне сацыяльна-эканамічнай і палітычнай сістэмы ў СССР у 1985–1991 гг., асноўным зместам якога стала дэмакратызацыя грамадскага жыцця, галоснаць. Вынікам перабудовы стаў распад СССР на незалежныя дзяржавы.

### *1. Перадумовы змен у духоўным жыцці беларускага народа.*

У сакавіку 1985 г. генеральным сакратаром КП СССР стаў М.С. Гарбачоў, які разумеў, што краіна знаходзіцца ва ўмовах сістэмнага крызісу, адной з праяў якога была напружнасць ва ўзаемаадносінах паміж цэнтрам і саюзнымі рэспублікамі. Ва ўмовах галоснасці і публічнасці, якія сталі рэальнасцю дзякуючы М.С. Гарбачову, у рэспубліках СССР сталі няўхільна набіраць палітычную вагу сілы, якія адкрыта выказвалі незадаволенасць станам культур тытульных этнасаў. Частка гэтых сіл бачыла адзінае рашэнне гэтых праблем у абвяшчэнні дзяржаўнай незалежнасці. У даперабудоўчыя часы нямала дзеячоў культуры дэманстравалі незалежнасць думак, меркаванняў. Гэтыя людзі сталі кадравым патэнцыялам для стварэння інстытутаў грамадзянскай супольнасці, якія выступалі за кардынальныя змены ў духоўным жыцці народаў СССР.

Нягледзячы на тое, што дзяржаўнае і партыйнае кіраўніцтва ў другой палове 1980-х гг. па-ранейшаму трымалася камандна-адміністрацыйных падыходаў у дачыненні да сферы культуры, працэсы агульнай дэмакратызацыі грамадства не маглі не паўплываць на яе змест. Асноўная канфрантацыя творчых работнікаў і дзяржаўных структур адлюстравалася ў гэты час у абвастрэнні «моўнага пытання». Фактычна існавала вострая неабходнасць выратавання беларускай мовы як універсальнага сродка адлюстравання нацыянальнай культуры.

Творчая і нацыянальная інтэлігенцыя рэспублікі ў другой палове 80-х гг. XX ст. актыўна абмяркоўвала становішча беларускай мовы і шляхі павышэння яе статусу. 15 снежня 1986 г. на імя Генеральнага сакратара ЦК КПСС М. Гарбачова быў дасланы адкрыты ліст, падпісаны 28 пісьменнікамі, паэтамі, гісторыкамі і іншымі прадстаўнікамі інтэлігенцыі. У гэтым дакуменце звярталася ўвага на цяжкае становішча беларускай мовы, якое было названа «культурным Чарнобылем». Сцвярджалася, што ў далейшым гэта можа прывесці да «духоўнага затухання» беларускай нацыі. У лісце выказвалася прапанова ўвядзення беларускай мовы ў карыстанне ва ўсіх сферах жыцця рэспублікі: у рэспубліканскім і мясцовым кіраўніцтве, адукацыі, сродках масавай інфармацыі і г.д. Аднак гэты ліст не сустрэў належнага водгуку ў вышэйшых партыйных структурах БССР.

У сакавіку 1987 г. адбыўся чарговы пленум ЦК КПБ, на якім першы сакратар ЦК КПБ Я. Сакалоў растлумачыў некаторае звужэнне сфер ужывання беларускай мовы вынікам волевыяўлення працоўных. Пункт гледжання некаторых прадстаўнікоў беларускай інтэлігенцыі на гэтае пытанне ён палічыў памылковым. Гэтае выказванне стала повадам з'яўлення новага ліста, адрасаванага М. Гарбачову, падпісанага 134 выкладчыкамі ВНУ і школ, творчых працаўнікоў і іншых. Нацыянальная палітыка савецкіх улад у дачыненні да Беларусі ў гэтым лісце трактуецца як русіфікацыя.

Па ініцыятыве пісьменнікаў 27 чэрвеня 1989 г. у Беларусі адбыўся з'езд, на якім было створана Таварыства беларускай мовы (ТБМ) імя Ф. Скарыны. Рэспубліканскую Раду ТБМ узначаліў паэт Н. Гілевіч, з 1990 г. таварыства пачало выдаваць газету "Наша слова".

Актыўнае абмеркаванне моўнага пытання садзейнічала павышэнню цікавасці да беларускай мовы, павышэнню яе ролі ў працэсе нацыянальна-культурнага развіцця. Паступова думка аб неабходнасці павышэння статуса мовы ўкаранілася і на ўзроўні вышэйшага кіраўніцтва рэспублікі. У першую чаргу гэта стала магчыма дзякуючы аслабленню ролі саюзнага цэнтра ў правядзенні ўнутранай палітыкі. Сепаратысцкія памкненні нацыянальных рэспублік выражаліся ў тым ліку і ў спробе правядзення новай нацыянальнай палітыкі, якая павінна была падкрэсліць адметнасці культуры і мовы народа. Аб змене арыентацый у моўным пытанні гаворыць пастанова калегіі Міністэрства культуры БССР «Аб павышэнні ролі беларускай мовы ў развіцці нацыянальнай культуры», прынятая 28 чэрвеня 1989 г.

На адзінаццатай сесіі Вярхоўнага Савета БССР у ліпень 1989 г. была ўтворана камісія па падрыхтоўцы прапаноў аб заканадаўчым урэгуляванні статуса беларускай, рускай і іншых моў, якімі карыстаецца насельніцтва рэспублікі. Камісія падрыхтавала праект Закона "Аб мовах у Беларускай ССР", пры распрацоўцы якога выкарысталі вопыт беларусізацыі 1920-х гг., адпаведныя заканадаўчыя акты іншых рэспублік, міжнародную моўную практыку. Настаў час для фінальнага акорда заканадаўчага афармлення беларусізацыі пачатку 1990-х гг.

***2. Пачатак беларусізацыі.***

Далейшым крокам стала прыняцце ў 1990 г. закона Рэспублікі Беларусь «Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь». Дзяржаўнай мовай стала беларуская, планавалася перавесці на гэтую мову ўсё справаводства, адукацыю, навуку і г. д. Пры гэтым закон не абмяжоўваў выкарыстанне рускай мовы як мовы міжнацыянальных зносін. Мовам нацыянальных меншасцей гарантавалася права на свабоднае развіццё. 1990 год шмат па якіх паказчыках стаў пераломным у гісторыі дзяржаўнасці беларускай мовы. 20 верасня 1990 г. Саветам Міністраў БССР была прынята «Дзяржаўная праграма развіцця беларускай мовы і іншых нацыянальных моў Беларускай ССР». На беларускую мову планавалі перавесці службовае справаводства органаў упраўлення, павялічылася колькасць беларускамоўных школ і класаў.

У адпаведнасці з законам аб мовах і дзяржаўнай праграмай пашыралася сфера ўжывання беларускай мовы ў справаводстве рэспубліканскіх і мясцовых органаў улады, на прадпрыемствах і навучальных установах. Для паказу першых канкрэтных вынікаў палітыкі беларусізацыі прывядзём некалькі прыкладаў. Адным з першых міністэрстваў, справаводства якога перайшло на беларускую мову, стала Міністэрства культуры БССР. Значна павялічвалася колькасць дзіцячых устаноў, якія працавалі на беларускай мове: у 1987 г. іх налічвалася 905 (18,3 % ад агульнай колькасці), ў 1991 г. – 2441 (46,8 %). Ішоў актыўны працэс стварэння нацыянальнай сістэмы адукацыі. У верасні 1990 г. у Мінску адкрылася першая беларуская нацыянальная гімназія. На пачатак 1991/1992 навучальнага года ўжо працавалі 2 каледжы, 12 ліцэяў, 33 гімназіі.

Напрыканцы 1980-х гг. – пачатку 1990-х гг. стала істотна паляпшацца становішча культуры нацыянальных меньшасцяў: павялічылася колькасць класаў, дзе навучанне вялося на мовах нацыянальных меншасцей – польскай, літоўскай і інш. У 1991 г. пачалася дзейнасць Саюза беларускіх яўрэйскіх грамадскіх арганізацый і абшчын (да 1999 г. пад назвай "Беларускае аб'яднанне яўрэйскіх арганізацый і абшчын"), на чале якога стаў заслужаны архітэктар РБ, лаурэат Ленінскай прэміі Л.М. Левін. У тым жа годзе ўзнікалі адпаведныя структуры ў палякаў і татар. Усе гэтыя арганізацыі разгарнулі актыўную культурна-асветніцкую дзейнасць.

### *3. Беларускае мастацтва ва ўмовах перабудовы.*

У сяр. 80-х гг. XX ст. дзяржава ўспрымала сферу культуры як адну з галін гаспадаркі БССР, таму ў кіраванні ёю дабівалася планавання дзейнасці прафесійных устаноў культуры. Партыйныя органы БССР поўнасцю кантралявалі развіццё прафесійнага беларускага мастацтва. Савецкая сістэма ўпраўлення гэтай сферай не спрыяла развіццю нацыянальных асаблівасцей мастацтва, стрымлівала натуральныя працэсы ў культуры. Нагляд за зместам і формай твораў мастацтва пазбаўляў творчых асобаў права на свабоднае выражэнне сваіх замыслаў. Кантроль з'яўляўся адной з галоўных функцый у дзейнасці мастацкіх саветаў, якія ажыццяўлялі нагляд за рэпертуарам творчых калектываў, сачылі за тым, каб прафесійнае мастацтва адлюстроўвала прынцыпы камуністычнай ідэалогіі. Вызначальную ролю ў падборы музычных і драматычных твораў для творчых калектываў адыгрывала Міністэрства культуры. Своеасаблівую манаполію на стварэнне музычных твораў мелі члены Саюза кампазітараў. Аднак фінансаванне прафесійнага мастацтва знаходзілася на высокім узроўні, праводзіліся шматлікія гастролі, выставы і ішныя мерапрыемствы.

У гады перабудовы дзяржаўная культурная палітыка вызначалася з агульнасавецкага цэнтра і кантралявалася партыйнымі органамі. Нягледзячы на працэсы дэмакратызацыі, гэтая палітыка была заснавана на савецкай ідэалогіі і дакладна вызначана. На хвалі агульнай дэмакратызацыі ўсіх сфер жыцця СССР пачалася ломка сістэмы ідэалагічнага ўціску на установы культуры і творчых работнікаў. Эканамічныя цяжкасці прывялі да скарачэння ўстаноў культуры. Пагоршылася матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне сферы прафесійнага мастацтва. Перыяд перабудовы стаў пераломным момантам у развіцці беларускай культуры, значна ўзрасла яе роля ў грамадскім і палітычным жыцці рэспублікі. Дэмакратыя стварала магчымасць свабоднага карыстання беларускай культурнай спадчынай, ужывання і павышэння статуса беларускай мовы.

Савецкае манументальнае мастацтва з 30-х гг. XX ст. афіцыйна развівалася ў рэчышчы сацыялістычнага рэалізма, што наклала свой адбітак на развіццё ўсіх відаў мастацтва. Гэта значна звузіла разнастайнасць формаў у творах, абмяжоўвала творцаў. У скульптуры гэта прывяло да панавання невялікай колькасці дазволеных тэмаў. Часцей за ўсё помнікі ўвасаблялі дзеячоў рэвалюцыйнага руху, герояў Вялікай Айчыннай вайны, перадавікоў вытворчасці. Амаль не было на Беларусі да к. 80-х гг. XX ст. помнікаў, якія б былі прысвечаны іншым падзеям гісторыі.

Склаўся стандартны падыход фарміравання гарадской прасторы. У цэнтры кожнага горада — ад сталіцы рэспублікі да раённага цэнтра – размяшчалася плошча Леніна, на якой абавязкова стаяў помнік Леніну. Іншыя помнікі і бюсты не адрозніваліся разнастайнасцю. У скульптурным аздабленні гарадоў амаль не падкрэслівалася мясцовая спецыфіка, рэгіянальная гісторыя. Такое скульптурнае аздабленне нівеліравала самабытнасць гарадоў, вяло да страты іх асабістага твару. З канца 80-х гг. XX ст. аблічча беларускіх гарадоў пачало актыўна змяняцца.

Асабліва важная роля дзяржаўных улад у развіцці манументальнай скульптуры, якая патрабуе ўкладання вялікіх сродкаў, дазволу мясцовых улад на ўстаноўку помнікаў. Новым у дзейнасці дзяржаўных устаноў была падтрымка твораў гістарычнай тэматыкі, прысвечаных дакастрычніцкаму перыяду беларускай гісторыі, але большасць твораў па-ранейшаму складалі тыя, што ўздымалі тэму Вялікай Айчыннай вайны.

Стварэнне і ўстаноўка твораў скульптуры знаходзілася пад пільнай увагай з боку ЦК КПБ. У сярэдзіне 1980-х гг. у абласцях праходзіў працэс аднаўлення і рэстаўрацыі скульптурных помнікаў і манументаў. Савет Міністраў БССР прыняў 1 кастрычніка 1984 г. пастанову "Аб фактах грубых парушэнняў заканадаўства аб ахове помнікаў гісторыі і культуры". Планавалася замяніць 23 помнікі, якія лічыліся нізкамастацкімі (напрыклад, абеліск на брацкай магіле савецкіх воінаў у г.п. Шарашова Пружанскага раёна).

У гэты перыяд працягвалася абмеркаванне пытанняў, звязаных з ленініянай і стварэннем праектаў помнікаў В.І. Леніну, можна нават заўважыць некаторую актывізацыю дзейнасці мясцовых улад у гэтым накірунку. Працэдура ўзгаднення рашэння аб устаноўцы ці рэканструкцыі помніка адбывалася наступным чынам. Абласны камітэт КПБ звяртаўся ў Міністэрства культуры, а потым у ЦК КПБ накіроўвалася прапанова аб узвядзенні ці рэстаўрацыі помніка ад імя абкома КПБ і Міністэрства культуры. Вызначальнае рашэнне прымалася на бюро ЦК КПБ, які прызначаў і адказных за ўзвядзенне помніка ў адпаведных структурах (абкомах КПБ, міністэрстве, Саюзе мастакоў і Саюзе архітэктараў).

Само Міністэрства культуры адказвала толькі за мастацкі бок помніка, абірала выканаўцаў праекта. У 1985-1987 гг. узводзілася значна менш помнікаў Леніну, чым, напрыклад, у 60-70 гг. XX ст. У 1985 г. іх устанавілі ў Маларыце і Чэрыкаве, у 1986 г. – у Барысаве, у 1987 г. – у гг. Беразіно, Гродна, Оршы, Драгічыне, Мядзелі. Для параўнання, у 1970 г. на Беларусі былі ўстаноўлены 34 помнікі і бюсты В.І. Леніна. З 1991 г. у прэсе ішлі актыўныя дыскусіі аб далейшым лёсе твораў «ленініяны». Было падлічана, што ў 1989 г. на тэрыторыі Беларусі існавала 369 помнікаў і 173 бюсты У.І. Леніну.

Сярод твораў, якія ўзгадваюцца ў пратаколах за 1987 г., усё часцей сустракаюцца назвы, якія сведчаць аб з'яўленні цікавасці мастакоў да гістарычнай тэматыкі, постацей беларускай гісторыі. Сярод іх – трохфігурная кампазіцыя "Дунін-Марцінкевіч, Манюшка, Сыракомля" А. Шатэрніка, конная фігура "Кастусь Каліноўскі" С. Бандарэнкі і некаторыя іншыя. Але большасць твораў складаюць па-ранейшаму тыя, што прысвечаны Вялікай Айчыннай вайне, партызанам, пейзажы і бытавы жанр.

Абмеркаванне пытанняў, звязаных з ленініянай і стварэннем праектаў помнікаў Леніну, працягвалася і ў другой палове 80-х гг. У 1988 г. Дзяржаўны мастацка-экспертны савет разглядаў праекты помнікаў Леніну для гарадоў Наваполацка, Кармы, Ляхавічаў і Астраўца. Але разам з тым абмяркоўвалася і была прынята бронзавая фігура "Дзяўчынка з птушкай" скульптара А.Фінскага, якая павінна была быць устаноўлена каля Малога канцэртнага зала. Гэты твор – прыклад не вельмі папулярнай у 80-я гг. паркавай скульптуры, пазбаўленай хоць якога-небудзь ідэалагічнага зместу.

У к. 80-х гг. XX ст. пачалася замена экспазіцый музеяў, што пацягнула за сабой больш актыўны заказ твораў гістарычнай і краязнаўчай тэматыкі. Савет разглядаў гэтыя заяўкі музеяў і рабіў ацэнку твораў, зробленых па іх. Так, у 1989 г. былі ўхвалены і закуплены наступныя творы: скульптура "Еўфрасіння Полацкая" Г. Гаравой, серыя літаграфій "Мінск гістарычны"("Дом Ваньковіча", "Базіліянскія муры", "Куток Верхняга горада") і іншыя па заяўцы Дзяржаўнага мастацкага музея, партрэт К.Тураўскага І. Пратасені (заяўка Дзяржмузея БССР) і г.д.

Зусім іншай накіраванасцю працы адрозніваліся паседжанні дзяржаўнага мастацка-экспертнага савета міністэрства па манументальнаму мастацтву. У 1985 г. асноўным пытаннем, якое абмяркоўвалася на паседжаннях савета была рабочая мадэль абеліска "Мінск – горад–герой" скульптара В. Занковіча. Гэтае пытанне разглядалася на некалькіх паседжаннях. Другая тэма працы савета – мадэлі помніка У. Леніна для г. Маларыта Брэсцкага р-на, распрацаваная скульптарам Н. Кандрацевым і архітэктарам Ю. Шпітам, і мадэль помніка Леніну для г. Барысава (скульптар А. Анікейчык, архітэктары Л. Левін і Ю. Градаў). Як мы бачым з гэтага дакумента, большасць твораў у гэты час была прысвечана ленінскай тэматыцы і ваеннай.

Адной з новых тэндэнцый, якая ўзнікла ў беларускім мастацтве сярэдзіны 1980-х гг. была пранікненне ідэй сюрэалізму. Зразумела, гэта не сюрэалізм у чыстым выглядзе, але творы са стылістыкай і мовай гэтага кірунку з'яўляюцца ў творчасці М. Селешчука, Г. Скрыпнічэнкі і некаторых іншых мастакоў. Вобразы гэтых аўтараў нібыта нарадзіліся ў беларускім фальклоры, прыйшлі да нас з гісторыі, міфаў і легенд, старадаўніх казак.

Аднак ужо было немагчыма сілавымі метадамі спыніць з'яўленне ў беларускім мастацтве новых тэндэнцый. Разам са звычайнымі ўжо выставамі, прысвечанымі якім-небудзь юбілеям партыі або рэвалюцыі, суседнічалі тыя, што адлюстроўвалі цікавасць беларускіх творцаў да гісторыі краіны, чалавечых каштоўнасцей. У студзені 1990 г. у Мінску ў памяшканні Беларускага навукова-даследчага інстытута навукова-тэхнічнай інфармацыі праходзіла дабрачынная выстава прац 9-ці скульптараў, членаў Саюза мастакоў. Большасць твораў, якія былі прадстаўлены на гэтай выставе, адносілася да пачатку 80-х гг. і да гэтага часу не выстаўлялася, знаходзілася ў майстэрнях скульптараў. Прычына гэтага – тэматыка гэтых твораў і не зусім «сацрэалістычная» манера іх выканання. Сярод выстаўленых прац былі «Вялікі кумір» і партрэт Ф. Скарыны А. Кузняцова, «Цішыня» А. Мятліцкага, медаль А. Фінскага, прысвечаны К. Каліноўскаму, і шмат іншых.

Менавіта ў гэты час у манументальнай скульптуры Беларусі сталі звяртацца і да вобразаў асабіста беларускай гісторыі. У 1989 г. святкавалася 500-годдзе са дня нараджэння Францыска Скарыны. У рамках падрыхтоўкі да юбілею ў аргкамітэце ўзнікла

ідэя стварэння помніка беларускаму першадрукару і надання яго імя адной з мінскіх вуліц. У лютым 1989 г. быў абвешчаны рэспубліканскі конкурс на стварэнне эскізнага праекта помніка Ф. Скарыне ў Мінску, вынікі якога падводзіліся ў красавіку 1991 г. На першы тур конкурсу было прапанавана 22 праекты, а перамог эскіз помніка маладога скульптара А. Дранца. Аднак увесь гэты час у прэсе, грамадстве і органах улады ішлі шырокія дыскусіі наконт месца ўстаноўкі гэтага помніка. Помнік быў устаноўлены толькі ў 2005 г. перад новым будынкам Нацыянальнай бібліятэкі.

У той самы 1989 г. святкавалася і 360-годдзе са дня нараджэння выдатнага культурнага і грамадскага дзеяча, пісьменніка-асветніка Сімяона Полацкага. У гонар гэтай падзеі і з мэтай ушанавання яго памяці бюро ЦК КПБ прыняло рашэнне ўстанавіць яму помнік у г. Полацку. Цікава, што рашэнне аб устаноўцы помнікаў С. Полацкаму і У.І. Леніну прымалася на адным пасяджэнні бюро ЦК КПБ 23 чэрвеня 1989 г. Гэты факт можна лічыць падцвярджэннем супярэчлівасці культурнага жыцця Беларусі часоў перабудовы. З аднаго боку, яшчэ трывалымі былі савецкія традыцыі ў кіраўніцтве сферай культуры, а з іншага боку, адчувалася тэндэнцыя нацыянальна-культурнага адраджэння. Доказам гэтай думкі служыла пастанова, прынятая бюро ЦК КПБ 21 красавіка 1989 г. "Аб увекавечванні памяці Кастуся Каліноўскага, Кірылы Тураўскага, Васіля Вашчылы", якая абвясціла рашэнне ўстанавіць помнікі гэтым дзеячам.

У сярэдзіне 1980-х гг. сфарміраваліся перадумовы, якія сталі падмуркам далейшага адраджэння беларускай культуры. У канцы гэтага перыяду беларуская мова афіцыйна атрымала статус дзяржаўнай, а БССР стала незалежнай краінай і атрымала назву Рэспубліка Беларусь.

***Літаратура***

1. Лыч Л. Гісторыя культуры Беларусі / Л. Лыч, У. Навіцкі. — Мінск: Экаперспектыва, 1996. – С. 400 – 437.

2. Нарысы гісторыі Беларусі: У 2 ч. / М. П. Касцюк, І. М. Ігнаценка, У. І. Вышынскі [і інш.]; Інстытут гісторыі НАНБ. – М: Беларусь, 1995. – Ч. 2 – С. 468 – 469.

3. Папко, В.М. Развіццё выяўленчага мастацтва на Беларусі і роля дзяржавы ў гэтых працэсах у 1985–2000 гг. // Вестник БрГТУ. – 2002. – № 6. – С.45–47.

4. Папко, В. Стварэнне заканадаўчай базы сферы культуры як аспект культурнай палітыкі Рэспублікі Беларусь (1991-2005 гг.) // Славянские страны в условиях системной трансформации и европейской интеграции: сборник научных трудов кафедр социально-гуманитарных наук. – Брест, 2005. – Вып. 2. – С. 251–254.

5. Папко, В.М. Трансфармацыя культурнай палітыкі БССР ва ўмовах перабудовы (др. пал. 80-х гг. XX ст.) // Славянскія краіны ў эпоху глабалізацыі: зб. навук. прац кафедр сацыяльна-гуманітарных навук. – Брэст. – 2004. – Вып. 1. – С. 86–93.

6. Парашкоў, С.А. Гісторыя культуры Беларусі. — Мн.: Бел. навука, 2003. — С. 335–339.

7. www.souz.co.il/.../read.html?article.– 27 октября 2009 года.

## РАДЗЕЛ IV. СУВЕРЭННАЯ РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ ВА ЎМОВАХ ГЛАБАЛІЗАЦЫІ

**Тэма 12. Айчынная культура ва ўмовах станаўлення незалежнай дзяржавы.**

1. Фарміраванне беларускай нацыянальнай ідэі: асноўныя накірункі сучасных канцэптуальных пошукаў.
2. Асаблівасці развіцця беларускай навукі і працэс мадэрнізацыі нацыянальнай сістэмы адукацыі.
3. Стварэнне заканадаўчай базы ў галіне культуры (1991-2009 гг.)

### *1. Фарміраванне беларускай нацыянальнай ідэі: асноўныя накірункі сучасных канцэптуальных пошукаў.*

У навуковай літаратуры існуюць два падыходы да зместу паняцця "нацыя". Першы з іх знаходзіцца ў рэчышчы марксісцка-ленінскай традыцыі. Яго прыхільнікі разумеюць пад нацыяй сукупнасць людзей, якіх аб'ядноўвае агульнасць тэрыторыі, эканамічнага жыцця, культуры, псіхічнага складу. На наш погляд, гэта – вызначэнне нацыі ў вузкім сэнсе слова.

Другі падыход атаясамляе з нацыяй сукупнасць грамадзян усёй канкрэтнай дзяржавы. У дадзеным выпадку размова ідзе аб нацыі ў шырокім сэнсе слова. Зыходзячы з гэтага накірунку, нацыянальныя інтарэсы можна вызначыць як агульную пазіцыю ўсіх этнасаў і сацыяльных груп, якія насяляюць канкрэтную дзяржаву.

Карані беларускай нацыянальнай ідэі трэба шукаць у адраджэнскіх рухах новага і найноўшага часу. Развал Савецкага Саюзу і атрыманне незалежнасці стварылі новыя ўмовы для развіцця Беларусі. Нягледзячы на тое, што незалежнасць прынесла шмат каштоўнага, па шматлікіх паказчыках беларускае грамадства не было падрыхтавана для ўспрыняцця і асэнсавання гэтага факта. Адной з галоўных праблем стаў нізкі ўзровень нацыянальнай самасвядомасці беларусаў і вузкая сфера выкарыстання беларускай мовы. Па дадзеных беларускіх даследчыкаў, у 1991 г. 69 % жыхароў БССР успрыймалі сябе ў першую чаргу савецкімі людзьмі, а 24 % на першае месца ставілі грамадзянства сваёй рэспублікі. Гэтыя паказчыкі былі самімі высокімі сярод савецкіх рэспублік. Адлюстраванне гэтай рэаліі знайшлося ў статусе беларускай мовы ў грамадстве.

Развіццё беларускага мастацтва садзейнічае павышэнню статуса беларускай мовы, уплывае на фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці грамадзян. У беларускім мастацтве падкрэсліваецца вылучэнне з-пад уплыву рускай культуры ў большай ступені, чым з-пад уплыву рускай мовы. Прыкладам можа служыць указ, які патрабуе ад радыёстанцый ў сваім вяшчанні выкарыстоўваць 75 % твораў беларускай музыкі. Аднак, большасць з іх на рускай мове – творы беларускіх аўтараў, або творцаў, якія паходзяць з тэрыторыі Беларусі, аднак жывуць і працуюць па-за яе межамі (у асноўным у Расіі і Украіне). Гэтае новаўвядзенне мела шмат праціўнікаў, але ў рэшце рэшт павысіла статус беларускай (рускамоўнай) эстрады ў вачах звычайных аматараў музыкі.

Значную ролю ў развіцці прафесійнага мастацтва Беларусі адыгрываў нацыянальны аспект. На пераломе дзесяцігоддзяў афіцыйным прынцыпам культурнай палітыкі стала падтрымка развіцця нацыянальных адметнасцей у мастацтве. Паказчыкам гэтага з'явілася наданне беларускай мове статуса дзяржаўнай, аднак гэтую дзейнасць нельга

лічыць паслядоўнай. Дзяржава садзейнічала развіццю гістарычнага жанру ва ўсіх відах мастацтва, прапагандзе мінулага краіны. Гэта адлюстравалася ва ўстаноўцы помнікаў гістарычным асобам і падзеям у Беларусі, адкрыцці новых музеяў, пераарыентацыі старых экспазіцый, рэстаўрацыі помнікаў старажытнай архітэктуры, пастаноўцы нацыянальных п'ес на сцэнах беларускіх тэатраў.

На дадзеным этапе працягваецца працэс фарміравання нацыянальнай ідэі, не згасаюць дыскусіі аб тым, якой яна павінна быць. Існуе неабходнасць глыбока асэнсаваць пазіцыю і погляды канкрэтных дзеячоў беларускага нацыянальнага руху, вывучыць і прааналізаваць іх тэарэтычную спадчыну, на базе якой магчыма фармуляванне зместу нацыянальнай ідэі. Базай яе павінна стаць задача замацавання дзяржаўнага суверэнітэта, фарміраванне грамадзянскай супольнасці і дэмакратычнай прававой дзяржавы, забеспячэнне правоў і свабод сваіх грамадзян, дастойнага ўзроўня іх жыцця. Менавіта такі кірунак адпаведных канцэптуальных пошукаў уяўляецца, на наш погляд, найбольш слушным. Менавіта ў ім трэба шукаць ключ да разумення адпаведнасці сучаснага стану культуры нацыянальным інтарэсам нашай дзяржавы. Выпрацоўка нацыянальнай ідэі з'яўляецца актуальнай праблемай.

### *2. Асаблівасці развіцця беларускай навукі і нацыянальнай сістэмы адукацыі.*

Пасля распаду СССР назіраўся працэс разбурэння гаспадарчых і навуковых сувязей, які негатыўна адбіўся на стане беларускай навукі. Скарачалася яе фінансаванне, пагаршалася матэрыяльна-тэхнічная база. Вынікі навуковых даследаванняў мала ўкараняліся ў народнай гаспадарцы. Гэта ўсё стала прычынамі зніжэння колькасці маладых спецыялістаў, адбылося так званае старэнне навукі. Аднак нават ў гэтых складаных умовах працягваліся навуковыя даследаванні. У 1993 г. быў прыняты Закон "Аб асновах дзяржаўнай навукова-тэхнічнай палітыкі", адпаведна якога адказнасць за развіццё фундаментальных навуковых даследаванняў ускладзена на Акадэмію навук Беларусі.

Паступова гэтая сітуацыя пачала папраўляцца. Намаганнямі беларускіх вучоных былі ажыццяўлены важныя даследаванні ў многіх галінах ведаў, аднаўляліся страчаныя раней сувязі з вучонымі Расіі, краінамі былога СССР, Еўропы, іншых кантынентаў. У 2000 г. у Рэспубліцы Беларусь працавала амаль 300 навукова-тэхнічных устаноў: 136 навукова-даследчых інстытутаў, 21 праектны, 54 канструктарскія, 42 ВНУ і многія іншыя.

Значныя змены адбыліся ў нацыянальнай сістэме адукацыі. У 1990-я гг. у Рэспубліцы Беларусь пачала праводзіцца школьная рэформа, адпаведна якой адбываўся пераход на 12-гадовы тэрмін навучання, абавязковую 10-гадовую базавую школу. У апошніх класах вучні мелі магчымасць атрымаць спецыялізаваную падрыхтоўку па розных накірунках (прыродазнаўча-матэматычным, гуманітарным, тэхналагічным). У 2008 г. рэалізацыя гэтай рэформы была прыпынена, сярэдняя адукацыя моладзі ажыццяўляецца ў 11-гадовай школе.

Значна змянілася структура падрыхтоўкі рабочых кадраў, якая ўлічвае сучасныя патрэбы грамадства ў спецыялістах у галіне радыёэлектронікі, камп'ютэрнай тэхнікі, сферы паслуг і гандлю. Сучасная сістэма ПТВ складаецца з навучальных устаноў двух

новых тыпаў: ліцэяў і прафесійна-тэхнічных каледжаў. Штогод з'яўляюцца дзесяткі новых спецыяльнасцей у ВНУ, звязаных з навукова-тэхнічным прагрэсам – па оптаэлектроніцы, біятэхналогіях і інш. У 1996 г. статус вядучай вышэйшай вучэбнай установы ў нацыянальнай сістэме адукацыі набыў Беларускі дзяржаўны універсітэт, які адыгрывае важную ролю ў падрыхтоўцы высокакваліфікаваных кадраў. Працягваўся працэс адкрыцця новых універсітэтаў у раённых цэнтрах. У Брэсцкай вобласці з'явіліся Баранавіцкі дзяржаўны універсітэт і Палескі дзяржаўны універсітэт.

### *3. Стварэнне заканадаўчай базы ў галіне культуры (1991-2009 гг.)*

З атрыманнем незалежнасці пачаўся працэс рэарганізацыі сістэмы ўпраўлення культурай. Культурная палітыка беларускай дзяржавы пачала змяняцца, што садзейнічала захаванню і распаўсюджванню нацыянальных традыцый і культурнай спадчыны. Адбываўся актыўны працэс стварэння і знікнення прафесійных творчых калектываў, некаторыя з іх атрымалі статус дзяржаўных, іншыя існавалі з падтрымкай спонсарскіх сродкаў. Творчыя саюзы аддзяліліся ад дзяржавы, паступова яны станавіліся незалежнымі партнёрамі дзяржаўнай улады. Прафесійныя калектывы сталі актыўнымі ініцыятарамі і арганізатарамі правядзення культурных акцый: фестываляў, пленэраў і г.д. Палітыка характарызавалася нявызначанасцю і адлюстроўвала стан агульнай разгубленасці ў грамадстве. Фінансавы крызіс адсунуў праблемы падтрымкі прафесійнай мастацкай культуры на другі план. Палажэнне закона "Аб культуры", згодна якому фінансаванне гэтай сферы павінна было складаць 3% бюджэтных сродкаў дзяржавы, не выконвалася. Значна ўзрасло значэнне мясцовых улад і прадпрыемстваў у фінансаванні галіны, што спрыяла ажыўленню культурнага жыцця правінцыі.

Гэтая сітуацыя пачала яскрава змяняцца ў сяр. 90-х гг. XX ст., калі на дзяржаўным узроўні была асэнсавана неабходнасць паслядоўнай падтрымкі мастацтва і вылучэння прыярытэтных накірункаў развіцця сферы прафесійнага мастацтва. Дзяржава распрацоўвала і ажыццяўляла шматлікія праграмы па культурнаму развіццю рэгіёнаў і краіны ў цэлым. Фарміравалася юрыдычная база для рэгламентацыі ўзаемаадносін паміж дзяржавай і сферай культуры. Другая палова 90-х гг. XX ст. стала перыядам актывізацыі дзейнасці беларускай дзяржавы ў дачыненні культуры, палепшыўся стан фінансавання прафесійнага мастацтва. Аднак у гэты перыяд не сфарміраваўся механізм садзейнічання спонсарскай дзейнасці прадпрыемстваў і арганізацый, які б спрыяў укладанню недзяржаўных сродкаў у развіццё мастацкай сферы.

Дзяржаўныя органы кіравання сферай культуры і мастацтва змянілі свае адносіны да нацыянальных элементаў у прафесійнай мастацкай культуры. Дзейнасць Міністэрства культуры была скіравана на развіццё гістарычнага жанру ва ўсіх відах мастацтва, прапаганду мінулага краіны. Гэта адлюстравалася ва ўстаноўцы помнікаў гістарычным асобам і падзеям на Беларусі, адкрыцці новых музеяў, пераарыентацыі старых экспазіцый, рэстаўрацыі помнікаў старажытнай архітэктуры, пастаноўцы нацыянальных п'ес на сцэнах беларускіх тэатраў. Дзяржава стымулявала стварэнне высокамастацкіх твораў праз арганізацыю дзяржзаказу, конкурсаў, фестываляў і інш., папулярызавала творы беларускіх аўтараў сярод насельніцтва і за межамі Беларусі. Станаўленне незалежнасці стала стымулам для развіцця беларускага мастацтва, якое

атрымала моцны духоўны штуршок, пачало засвойваць новыя тэмы, звярнулася да хрысціянскіх і нацыянальных каштоўнасцей. Павялічылася доля беларускамоўных спектакляў, некаторыя з тэатраў працавалі выключна на беларускай мове.

За перыяд існавання незалежнай Беларусі дзяржавай было прынята некалькі законаў і нарматыўных актаў у галіне культуры і мастацтва. Сярод іх самыя важныя законы "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны" (1992), "Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь" (1995), "Аб аўтарскім праве і сумежных правах" (1996), "Аб музеях і музейных фондах Рэспублікі Беларусь" (1996), "Аб далучэнні Рэспублікі Беларусь да Бернскай канвенцыі аб ахове дзяржаўных і мастацкіх твораў" (1997), "Аб народным мастацтве, народных промыслах (рамёствах) у Рэспубліцы Беларусь" (1999), "Аб творчых саюзах і творчых работніках" (1999) і інш. Гэтыя законы рэгламентавалі адносіны паміж дзяржавай і творчымі работнікамі, якія аб'яднаны ў творчыя саюзы.

Супрацоўніцтва з творчымі саюзамі і арганізацыямі з'яўлялася адным з важнейшых накірункаў дзяржаўнай палітыкі ў галіне прафесійнага мастацтва. У 1994 г. на тэрыторыі Беларусі дзейнічалі наступныя творчыя грамадскія арганізацыі: Канфедэрацыя творчых саюзаў, Саюз тэатральных дзеячаў, Саюз мастакоў, Саюз кампазітараў, Саюз музычных дзеячаў, Саюз кінематаграфістаў, Саюз архітэктараў, Саюз дызайнераў. У пачатку XXI ст. на тэрыторыі Беларусі дзейнічала 13 творчых саюзаў, членамі якіх з'яўлялася каля 8 тыс. чалавек.

Вельмі мала на Беларусі існуе прыватных устаноў культуры. Сярод найбольш жыццяздольных можна лічыць прыватны тэатр у Гомелі. Яўныя недахопы ў заканадаўстве не даюць магчымасці існаваць такой форме тэатра, ня гледзячы на тое, што праблема існуе даўно і патрабуе свайго вырашэння. Асабліва адчуваюць цяжкасці тыя установы, якія дзейнічаюць на грані мастацтва і камерцыі. У першую чаргу гэта мастацкія галерэі і недзяржаўныя тэатральна-канцэртныя ўстановы.

Фарміраванне мастацкага рынка на Беларусі праходзіць вельмі павольна і марудна. Гэта можна растлумачыць невялікім попытам твораў мастацтва ў насельніцтва, нават пры ўмовах, што яны каштуюць у некалькі разоў танней, чым у краінах Еўропы. Аднак мастацкі рынык развіваўся б інтэнсіўней у выпадку развіцця турызму на Беларусі. Для замежных турыстаў творы мастацтва могуць стаць добрым сувенірам.

У 1996 г. Міністэрства культуры распрацавала пералік дзяржаўнай культурнай палітыкі і механізмы іх фінансавання. Было вырашана акрэсліць канкрэтныя аб'екты, фінансаванне якіх будзе весціся ў поўным аб'ёме і ў першую чаргу. Прычынай гэтага стаў недахоп сродкаў і неабходнасць іх размеркавання паміж шматлікімі дзяржаўнымі аб'ектамі культуры і мастацтва. У галіне прафесійнага мастацтва гэты дакумент назваў прыярытэтамі стварэнне твораў мастацтва па дзяржаўным заказе, пастаноўку не менш, чым 50 новых спектакляў у тэатрах краіны, правядзенне музычных фестываляў і конкурсаў, арганізацыю выстаў, праектаванне помнікаў дзеячам культуры, гісторыі і навукі Беларусі. У асобным спісе знаходзілася 13 архітэктурных помнікаў, якія на перыяд з 1997 па 2000 гг. павінны былі атрымаць прыярытэты ў рэстаўрацыі і аднаўленні. Сярод іх Каложская царква ў г. Гродна, Сафійскі сабор у г. Полацку, замкі ў г. Гродна, Міры, Нясвіжы і г.д. Рэстаўрацыя гэтых будынкаў патрабавала ўкладання каласальных

сродкаў, што немагчыма зрабіць за кароткі адрэзак часу (палац Радзівілаў у Нясвіжы па падліках спецыялістаў патрабуе каля 30 млн. долараў). Рэстаўрацыя многіх з гэтых аб'ектаў працягваецца.

Адраджэнне нацыянальнай культурнай спадчыны адлюстравалася ў стварэнні новых музеяў, рэстаўрацыі архітэктурных помнікаў. У савецкія часы многія шэдэўры беларускай архітэктуры, асабліва замкі і храмы, выкарыстоўваліся як гаспадарчыя аб'екты, знаходзіліся ў руінах. Да 2001 г. у памяшканні Нясвіжскага палаца князёў Радзівілаў знаходзіўся санаторый. Прычынай такой сітуацыі неабходна лічыць палітыку ваяўнічага атэізма, якую праводзіла дзяржава ў СССР, у рамках ажыццяўлення якой руйнаваліся храмы ўсіх канфесій. У сяр. 80-90-х гг. большасць храмаў перадалі ў рукі рэлігійных канфесій, праводзілася іх рэстаўрацыя.

### *Літаратура*


1. Карзенка Г.У. Навука // Беларусь на мяжы тысячагоддзяў. – Мн.: БелЭн, 2000. – С. 287 – 304.
2. Новік, Я.К. Гісторыя Беларусі. Ад старажытных – па 2008 г.: вучэб. дапам. / Я.К. Новік, І.Л. Качалаў, Н.Я. Новік; пад рэд. Я.К. Новіка. – Мінск: Выш. шк., 2009. – С. 493.
3. Парашкоў, С.А. Гісторыя культуры Беларусі / С.А. Парашкоў. – 2-е выд. – Мн.: Бел. навука, 2004. – С. 348 – 350.
4. Титаренко, Л.Г. Постсоветская трансформация социокультурной идентичности белорусов: смена теоретических моделей // Славянские страны в условиях системной трансформации и европейской интеграции. Сборник научных трудов кафедр социально-гуманитарных наук. – Вып. 2. – Брест: БрГТУ, 2005. – С. 65.
5. id.atiso.ru/node/71
6. www.data.minsk.by/opensociety/1.99/2.html

## Тэма 13. Беларускае мастацтва на рубяжы XX-XXI стст.

1. Беларускі жывапіс на рубяжы стагоддзяў.
2. Развіццё беларускай скульптуры.
3. Тэатральнае мастацтва.
4. Музычнае мастацтва Беларусі.
5. Фестывальны рух на Беларусі.

### *1. Беларускі жывапіс на рубяжы стагоддзяў.*

У 90-я гг. XX ст. у беларускім выяўленчым мастацтве адбываліся значныя змены, абумоўленыя стварэннем незалежнай дзяржавы. Беларусь уступіла ў перыяд глабальнай трансфармацыі ўсіх сфер жыцця, якая на мастацтве наогул адбілася станоўчым чынам. Вялікая колькасць інфармацыі аб мастацкім жыцці іншых краін прывяла да больш разнастайных творчых ідэй і зрабіла багацейшымі міжнародныя сувязі. Беларускі мастак атрымаў тое, без чаго немагчыма яго нармальнае існаванне – свабоду творчасці, нічым не абмежаваны выбар тэм, жанраў, тэхнік жывапісу. Важным патрэбна лічыць і той факт, што беларускае мастацтва паступова ўключаецца ў агульнаеўрапейскія і сусветныя працэсы, атрымліваючы звонку новыя імпульсы для свайго развіцця.

У гэты час сюрэалістычнае гледжанне на свет праяўляецца ў творах В. Альшэўскага, А. Ісачанкава і С. Кухто. Вельмі складана вызначыць і акрэсліць тыя напрамкі, якія суіснуюць зараз у сучасным мастацтве. На думку Алеся Тарановіча, беларускае мастацтва «некаторым ... здаецца падобным да першабытнага акіяна, у якім хаатычна змешваюцца калісьці строга раскладзеныя пласты і слаі. З бурлівага хаосу выплёскваюцца абрыўкі акадэмізму, абстракцыянізму, сац-арта, канцэптуалізму і яшчэ не аднаго дзесятка не зусім распазнаных арт-напрамкаў. Апошнім часам усё болей становіцца твораў у выглядзе перфоменсу, інсталяцый, бодзі-арта, камп'ютэрнай графікі і г.д. Карацей, усяго таго, што даўно ўжо існуе на Захадзе...».[3] Большасць мастакоў і мастацтвазнаўцаў называюць такую сітуацыю ў мастацтве постмадэрнізмам, як гэта прынята ў свеце. Постмадэрнізм – нармальная і нават станоўчая з'ява ў беларускім мастацтве, ён не дыктуе ніякіх правілаў. Галоўная ідэя ў постмадэрнізме – адсутнасць усялякіх абмежаванняў і поўная свабода самавыражэння. Яшчэ адна з асаблівасцей постмадэрнізму – працэс сінтэзу мастацтваў, а таксама больш цесная інтэграцыя і ўзаемнае ўзбагачэнне культур.

Адна з асаблівасцей сучаснага мастацкага жыцця – пашырэнне спектра сумесных акцый разам з замежнымі мастакамі і арганізацыямі. Цікавыя акцыі на Беларусі ладзіў француз Іў Прудом, выхадзец з сям'і парыжскіх калекцыянераў і галерэйшчыкаў, якія збіралі і выстаўлялі галоўным чынам графіку. У верасні 2002 г. у Мінскай галерэі "Зямля людзей" праходзіў вернісаж "Дом Прутэ", на якім экспанаваліся старажытныя французскія гравюры побач з творамі сучасных беларускіх графікаў – выкладчыкаў, выпускнікоў і навучэнцаў Беларускай Акадэміі мастацтваў. Гэтая выстава – адзін з прыкладаў новых прынцыпаў супрацоўніцтва.

---

[3] Тарановіч А. «10 гадоў пасля, альбо беларускае мастацтва сярэдзіны 90-х гадоў» // Культура. – 1996. – 24-30 студзеня. – С.6.

Вяртанне імёнаў мастакоў, якія жылі і працавалі на беларускай зямлі, таксама пацягнула за сабой традыцыю правядзення пленэраў у іх гонар. Прыкладам таму могуць служыць пленэры ў гонар Фердынанда Рушчыца ў Валожынскім раёне ці Шагалаўскія пленэры на Віцебшчыне.

На Беларусі пачалі з'яўляцца прыватныя і грамадскія галерэі. Беларускае выяўленчае мастацтва ў апошнія паўтара дзесяцігоддзя ўзбагацілася мноствам новых твораў, тэм і вобразаў. Выхавалася новае пакаленне мастакоў і скульптараў, якія іначай глядзяць на навакольны свет і іначай увасабляюць яго ў сваіх працах.

У наш час можна гаварыць аб адметных, непаўторных працэсах, якія назіраюцца ў беларускім выяўленчым мастацтве:

1. З'яўленне вялікай колькасці новых тэм, накірункаў і тэхнік.
2. Стварэнне мастацкіх аб'яднанняў (напрыклад, «Пагоня» і «Няміга»).
3. Фарміраванне новых мастацкіх цэнтраў, нават тэрытарыяльных школ (Віцебск, Полацк, Брэст).
4. Актывізацыя выставачнай дзейнасці, з'яўленне твораў беларускіх мастакоў на сусветных выставах.
5. Вяртанне і даследаванне творчасці мастакоў, скульптараў, архітэктараў і кампазітараў, якія жылі і працавалі на тэрыторыі Беларусі, але іх дзейнасць у савецкія часы не вывучалася.

***2. Развіццё беларускай скульптуры.***

Па тэматыцы твораў манументальнае мастацтва Беларусі 90-х гг. ХХ.ст. значна адрозніваецца ад савецкага. У ім з'явіліся новыя тэмы, вобразы, новае стаўленне да гледача. Адной з такіх тэндэнцый з'яўляецца стварэнне твораў паркавай скульптуры (у асноўным у Мінску). Напрыклад, скульптуры "Дама на лаўцы", "Прахожы", "Дзяўчынка з парасонам" У. Жбанава. Цікавасць да падобных твораў з боку ўлады сведчыць аб паслабленні ідэалагічнага зместу ў скульптуры ў сучасным грамадстве. Стварэннем паркавай скульптуры па дзяржаўным заказе ў гэты час займаліся скульптары А. Фінскі, В. Слабодчыкаў, А. Чыгрын і інш. Неабходнасць з'яўлення паркавай скульптуры зразумелі ўлады некаторых беларускіх litгарадоў, асабліва сталічныя.

Традыцыя праводзіць скульптурныя пленэры нарадзілася таксама ў др. пал. 1980-х гг., пачатак яе паклаў Мінскі пленэр-сімпозіум па скульптуры. Правядзенне скульптурных пленэраў таксама часцей за ўсё мела на мэце ўпрыгожанне гарадоў. Працы, створаныя падчас іх, застаюцца ў горадзе, які праводзіў пленэр. Сумесная творчасць дазваляе скульптарам абмяняцца вопытам, ідэямі. Звычайна для пленэра выбіраецца якая-небудзь тэма і матэрыял, з якім працуе скульптар. У 1999 г. падчас I рэспубліканскага пленэра па скульптуры ім быў абраны вапняк, у 2001 г. – дрэва. Тэма II пленэра, які праходзіў у Гомелі, – "У свеце казак". Працы, створаныя дзесяццю беларускімі скульптарамі і Янам Кісліцкім (Швецыя) упрыгожылі Гомель. Скульптура паступова губляла пампезнасць, якая падаўляе чалавека, стварала ўтульную для чалавека жылую прастору.

Новым накірункам творчасці для беларускіх скульптараў стала рэлігійная тэматыка. Адной з самых таленавітых і значных прац стала бронзавая скульптурная кампазіцыя

«Архангел Міхаіл перамагае змея», устаноўленая ў 1996 г. каля касцёла святых Сымона і Алены ў Мінску (скульптар І. Голубеў). Узвядзенне гэтага манумента звязана з ростам ролі рэлігійных аб'яднанняў на Беларусі і паказвала значэнне хрысціянства ў духоўным адраджэнні краіны. Асноўным заказчыкам твораў на хрысціянскія тэмы з'яўлялася каталіцкая царква. Такія творы як «Іаан Хрысціцель», «Архангел Міхаіл», «Зняцце з крыжа», «Распяцце» і іншыя скульптара А. Шомава, «Пакаянне», «Галгофа», «Жонкі-міраносіцы» Н. Апіёк, творы У. Ламейкі, У. Панцялеева, У. Слабодчыкава, А. Мятліцкага, А. Фінскага носяць рысы адраджэння старажытных традыцый увасаблення біблейскіх сюжэтаў. Да старажытных, фальклорных і міфалагічных вобразаў з гэтага часу звяртаюцца многія скульптары.

Скульптар Генадзь Буралкін нездарма звяртаецца да такога матэрыялу, як дрэва, якое вельмі актыўна выкарыстоўвалася ў старажытныя часы. Кампазіцыя “Ярыла”, “Язычніцкі бог”, “Вяртанне беларускага анёла” – гэта спроба па-новаму ўбачыць спрадвечных герояў беларускіх легенд, якія быццам бы паўстаюць з былога. Звяртаецца скульптар і да гістарычнай тэмы. Твор “1863 год” прысвечаны паўстанню, якім кіраваў К. Каліноўскі, “Давыд Гарадзенскі” – нагадвае аб дзейнасці знакамітага ваяра – гродзенскага старасты.

У 1996 г. Міністэрства культуры распрацавала «Прыярытэтныя напрамкі дзяржаўнай культурнай палітыкі на 1997 – 2000 гг.», дзе вылучаліся сферы культуры для першачарговага фінансавання. Важная роля адводзілася праектаванню помнікаў дзеячам гісторыі, культуры, навукі і значным гістарычным падзеям. З'яўленне гэтага дакумента спрыяла больш асэнсаванаму планаванню дзейнасці дзяржавы ў накірунку стварэння помнікаў, мэтанакіраванаму выдзяленню сродкаў з агульнадзяржаўных і мясцовых крыніц фінансавання. Планавалася за гэты час спраектаваць помнікі Ф. Скарыне (г.Мінск), Ф. Багушэвічу (г. Смаргонь), С. Полацкаму (г. Полацк), К. Каліноўскаму (г. Гродна), Н. Ордзе (г. Іванава), дзецям–ахвярам вайны (г. Жлобін), Барацьбітам партызанскага руху на Палессі (г. Пінск). У большасці выпадкаў крыніцай фінансавання вызначаўся мясцовы бюджэт.

Важную ролю ў рашэнні праблемы ўзвядзення помнікаў адыгрывалі мясцовыя раённыя і абласныя ўлады. З 1991 г. былі ўзведзены наступныя помнікі: Н. Ордзе (г. Іванава, Брэсцкай вобласці), бюсты мастакоў П. Масленікава (Магілёў, 1997) і А. Астаповіча (Мінск, 1997), бюст А. Багдановіча (в. Халопенічы, Крупскі раён, 1997), бюст А. Міцкевіча (Гродна, 1998), помнікі М. Доўнар-Запольскаму (Рэчыца, 1997) і М.Танку (Мядзельскі раён, 1997). Некалькі помнікаў знакамітым асветнікам Беларусі было ўстаноўлена ва ўнутраным дворыку БДУ, сярод іх помнікі Ф. Скарыне (1998), М. Гусоўскаму (1998), Е. Полацкай (1998), С. Буднаму і В. Цяпінскаму (2000).

Яшчэ адзін помнік Е. Полацкай (скульптар І. Голубеў) быў адкрыты на яе радзіме ў г. Полацку ў верасні 2000 г. Ініцыятарамі ўстаноўкі помніка ў другой палове 90-х гг. часта былі грамадскія арганізацыі, фінансавую дапамогу аказвалі і пасольствы розных краін. Напрыклад, скульптуры Ф. Скарыны і М. Гусоўскага, устаноўленыя ў дворыку БДУ, падараваны універсітэту Мінскім грамадска-асветніцкім клубам “Спадчына”, а помнік-храм воінам-інтэрнацыяналістам ў Траецкім прадмесці ўзводзіўся пры актыўным удзеле арганізацыі былых удзельнікаў вайны ў Афганістане. Яшчэ адным прыкладам можа служыць адкрыццё мемарыяла ахвярам Халакосту ў Мінску на месцы былога яўрэйскага

гета (2000). Стварэнне гэтага помніка фінансавалася пры дапамозе Федэрацыі яўрэйскіх абшчын СНД і пасольства Ізраіля ў Беларусі. Сустракаюцца прыклады фінансавання помнікаў з крыніц прыватнага капіталу, як было з помнікам Рагнедзе ў Заслаўі (скульпар А. Арцімовіч, архітэктар І. Марозаў).

У 1990-я гг. XX ст. кардынальным чынам змяніліся падыходы да фінансавання ўстаноўкі твора манументальнай скульптуры. Як станоўчую тэндэнцыю можна адзначыць рост цікавасці да манументальнай скульптуры мясцовых уладаў, якія імкнуліся падкрэсліць гістарычныя і культурныя асаблівасці свайго горада ўстаноўкай помніка знакамітаму земляку. Помнік звычайна ставіўся ў гістарычным цэнтры горада і надаваў яму новы духоўны сэнс: помнік князю Давыду ў Давыд-Гарадку (2000 г., скульптар А. Дранец, архітэктар Л. Левін), помнік святой Сафіі Слуцкай у Слуцку (2000 г., скульптар М. Інькоў, архітэктар М. Лук'янчык), помнік Пятру Мсціслаўцу ў г. Мсціслаўлі (скульптары А. Батвінёнка і А. Чыгрын, архітэктар Ю. Казакова, 2001 г.), помнік Афанасію Філіповічу ў Брэсце (2005 г., скульптары А. Гушчанкова і П. Герасіменка).

У другой палове 90-х гг. значна аслабеў дзяржаўны кантроль у справе ўстаноўкі манументальнай скульптуры, што часам прыводзіла да з'яўлення ў гарадах твораў, якія мелі недастаткова высокі мастацкі ўзровень. Дарэчы, гэта часта практыкавалася ў савецкія часы, калі гарады і вёскі былі "ўпрыгожаны" вялікай колькасцю зробленых быццам бы па адным не вельмі ўдалым узоры помнікаў Леніна і іншых правадыроў. Мясцовыя ўлады і грамадскія арганізацыі мелі больш магчымасцей фінансаваць устаноўку помнікаў, чым цэнтральныя ўлады. Таму часам яны дзейнічалі ў абыход Міністэрства культуры і Саюза мастакоў, працуючы напрамую са скульптрам. 6 верасня 2000 г. Савет Міністраў РБ зацвердзіў "Палажэнне аб парадку праектавання, стварэння (будаўніцтва), рэканструкцыі і прыёмкі твораў манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь", якое было распрацавана Міністэрствам культуры. Кантроль за ўзвядзеннем помнікаў быў ускладзены на прафесіяналаў.

Дэмакратызацыя жыцця і атрыманне краінай незалежнасці спрыяльна паўплывала на скульптуру. Менавіта сродкамі манументальнага мастацтва вялося патрыятычнае выхаванне, падкрэслівалася нацыянальная самабытнасць беларускай культуры і гісторыі, чаго не было не толькі ў савецкія часы, але нават і ў перыяд перабудовы. Устаноўка некаторых помнікаў гадамі суправаджалася незгасальнымі спрэчкамі на старонках газет. Гэты факт гаворыць аб вялікай значнасці мемарыяльнага мастацтва і скульптуры наогул, яго асобнай ролі ў фарміраванні нацыянальнай годнасці і самасвядомасці. Шмат новых помнікаў з'явілася на вуліцах беларускіх гарадоў, большасць з іх прысвечана знакамітым асобам гісторыі і культуры, дзейнасць якіх у рэшце рэшт атрымала належную адзнаку.

### *3. Тэатральнае мастацтва.*

Развіццё беларускага тэатра ў 90-я гг. XX ст. характэрызавалася некалькімі супярэчлівымі тэндэнцыямі. Зніжэнне цікавасці да тэатральнага мастацтва з боку гледача працягвалася яшчэ з часоў перабудовы. Калі ў 1990 г. беларускія тэатры наведала 2 млн. 513 тыс. гледачоў, то ў 1995 іх было 1 млн. 780 тыс. Самі тэатры перажывалі шматлікія ўнутраныя канфлікты, існаваў востры недахоп акцёрскіх і

рэжысёрскіх кадраў. Выйсце з гэтай сітуацыі тэатры бачылі ў пастаноўцы п'ес так званага камерцыйнага характару: з невялікай колькасцю акцёраў, з малым коштам пры пракаце. Часта яны былі невысокага мастацкага ўзроўню, але пазней гэтая тэндэнцыя паступова аслабевала. Змяняўся рэпертуар тэатраў. Нягледзячы на ўсю складанасць сітуацыі, гэты перыяд стаў вызначальным для беларускай нацыянальнай драматургіі. Былі ажыццёўлены знакавыя пастаноўкі беларускай класікі ("Тутэйшыя" Я. Купалы і "Ідылія" В. Дуніна-Марцінкевіча ў Купалаўскім тэатры), актыўна ставіліся творы сучасных драматургаў (А. Дударава, Р. Баравіковай, С. Кавалёва), прысвечаныя нацыянальнай гісторыі і надзённым праблемам нашага часу.

Адной з галоўных стала праблема атрымання сродкаў на капітальны рамонт будынкаў музеяў, тэатраў і іншых устаноў культуры. Недахоп матэрыяльных сродкаў яскрава адлюстраваўся на звужэнні гастрольнай дзейнасці тэатраў і творчых калектываў. У 1994 г. Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны і камерны аркестры Беларусі не змаглі правесці канцэрты ў абласцях краіны. У першай палове 1990-х гг. ніводнага знакамітага калектыву з Масквы, Санкт-Пецярбурга, Кіева не было ў Мінску з гастролямі. Фінансаване галіны культуры ў 1995 г. знаходзілася ў такім становішчы, што многія запланаваныя традыцыйныя мерапрыемствы апынуліся па-за бюджэтным фінансаваннем.

Адна з яскравых рыс перамен у беларускім тэатры 90-х гг. – змена рэпертуару, якая праявілася ў існаванні некалькіх агульных тэндэнцый. У першую чаргу гэта амаль поўнае адмаўленне ад былога савецкага рэпертуару. Існавала выразная неабходнасць стварэння свайго ўласнага нацыянальнага рэпертуару, які б адлюстроўваў надзённыя праблемы сучаснасці і слаўныя старонкі гісторыі. Калі ўважліва паглядзець, то за гэты час было створана няшмат драматычных твораў, прысвечаных гістарычнай тэматыцы. Але гэтаму ёсць дакладнае тлумачэнне: прафесія драматурга вельмі рэдкая, напісанне п'есы звязана са шматлікімі цяжкасцямі. Міністэрства культуры і Саюз тэатральных дзеячаў у 90-я гг. сумесна праводзілі некалькі творчых конкурсаў, якія стымулявалі стварэнне п'ес беларускімі драматургамі. У 1994–1995 гг. праводзіўся конкурс на стварэнне п'ес для драматычнага, дзіцячага і лялечнага тэатраў пад дэвізам "Гісторыя і сучаснасць". Яго мэтай было павышэнне ролі тэатральнага мастацтва ў адраджэнні і развіцці нацыянальнай культуры, узбагачэнне рэпертуару тэатраў новымі арыгінальнымі творамі драматургіі на беларускай мове. Новыя п'есы павінны былі ў высокамастацкай форме адлюстроўваць падзеі гісторыі Беларусі, яе сучаснасць, традыцыі, абрады і фальклорнае багацце народаў.

Большасць гістарычных твораў беларускай драматургіі 90-х гг. прысвячалася пераломным момантам у беларускай гісторыі і знакамітым яе асобам. Творчае пераасэнсаванне падзей старажытнасці дало штуршок для развіцця нацыянальнага тэатра. З 1991 па 2001 гг. на сцэнах беларускіх тэатраў было пастаўлена 7 аўтарскіх п'ес, прысвечаных гісторыі Беларусі, дзве інсцэніроўкі, адна опера і адзін балет. Больш за ўсё драматургаў і рэжысёраў цікавяць вобразы Рагнеды (спектаклі паводле п'ес "Звон – не малітва" І. Чыгрынава, "Уладзімір і Рагнеда" А. Дударава, балет "Страсці" А. Мдзівані), Ягайлы і Вітаўта ("Купала" А. Дударава і інсцэніроўка паэмы "Песня пра зубра"

М. Гусоўскага), Барбары Радзівіл ("Барбара Радзівіл" Р. Баравіковай і "Чорная панна Нясвіжа" А. Дударава). Цэлыя тры пастаноўкі перажыла п'еса С. Кавалёва "Саламея". Можна таксама заўважыць, што сярод драматургаў на ніве гістырычнай драмы найбольш плённа працуе А. Дудараў. Большасць узгаданых вышэй спектакляў была створана з дапамогай мэтавай падтрымкі Міністэрства культуры або па дзяржаўным заказе.

У 1991 г. на Беларусі існаваў 21 прафесійны дзяржаўны тэатр (з іх 2 музычныя, 7 лялечных, 1 дзіцячы і 11 драматычных). У гэты час паступова больш актыўна пачалі ў рамках дзяржзаказу ажыццяўляць пастаноўку беларускамоўных спектакляў. У 1994 г. такім чынам было падрыхтавана 19 спектакляў. На момант атрымання незалежнасці ў Беларусі дзейнічалі тры беларускамоўныя тэатры: Беларускі дзяржаўны акадэмічны тэатр імя Я. Купалы, Беларускі дзяржаўны акадэмічны тэатр імя Я. Коласа і Беларускі рэспубліканскі тэатр юнага гледача. Усе астатнія тэатры хаця і мелі ў сваім рэпертуары спектаклі на беларускай мове, але іх мастацкі ўзровень быў не вельмі высокі, да таго ж з ростам цікавасці да беларускай драматургіі стала відаць, што катастрафічна не хапала беларускіх п'ес сучаснай і гістарычнай тэматыкі. Тады нарадзілася ідэя стварыць тэатр, на сцэне якога маглі б здзяйсняцца пастаноўкі твораў маладых аўтараў, якія не маглі прэтэндаваць на акадэмічныя падмосткі, дзе значна цяжэй эксперыментаваць. Такім тэатрам стаў Дзяржаўны тэатр-лабараторыя нацыянальнай драматургіі "Вольная сцэна" пад кіраўніцтвам рэжысёра В. Мазынскага, які адкрыўся ў Мінску ў 1992 г.

Падрыхтоўка спектакля ў гэтым тэатры адбывалася нетрадыцыйным чынам. Малады драматург, твор якога абраны для пастаноўкі, на некалькі месяцаў залічваўся ў склад трупы і быў удзельнікам пастановачнага працэсу. Гэта дазваляла яму атрымліваць практычны вопыт вырашэння сцэнічных праблем. Адной з самых галоўных мэт дзейнасці тэатра было адкрыццё новых імёнаў у беларускай драматургіі, праца з маладымі драматургамі і распрацоўка новых напрамкаў і мастацкіх сродкаў у тэатры. Таму спектаклі Тэатра-лабараторыі так не падобны адзін да аднаго, як і іх аўтары. За гэты час былі пастаўлены п'есы І. Сідарука "Галава", Р. Баравіковай "Барбара Радзівіл", У. Рудава "Брат мой, Сымоне", С. Кавалёва "Заложніца кахання", М. Адамчыка і М. Клімковіча "Віта брэвіс, або Нагавіцы святога Георгія" і іншыя.

У 90-я гг. працэс з'яўлення новых прафесійных дзяржаўных калектываў адбываўся не так актыўна, як у папярэдні перыяд. 30 студзеня 1993 г. прэм'ерай спектакля "Зямля" па творах Я. Коласа адкрыўся Мінскі абласны драматычны тэатр (г. Маладзечна). Тэатр працуе ў будынку былога гарадскога Дома культуры, у глядзельнай зале якога змяшчаецца 150 месцаў.

У 1990-я гг. на Беларусі пачалі працаваць антрэпрызы – адна з форм прафесійнай тэатральнай творчасці. Антрэпрызы не з'яўляліся дзяржаўнымі, а працавалі на прынцыпах самаакупнасці і былі накіраваны на камерцыйны поспех. Напрыклад, такая вядомая прыватная антрэпрыза, як "Віртуозы сцэны", створаная прадзюсерам У. Ушаковым у 1997 г., запрашала для пастаноўкі спектакляў самых знакамітых беларускіх рэжысёраў, акцёраў тэатра і кіно, арганізоўвала выступленні на Беларусі расійскіх антрэпрыз. Выбар спектакляў не абмяжоўваўся якім-небудзь адным накірункам. Аднак заканадаўства прымушала арганізатараў антрэпрыз плаціць даволі высокі падатак, што зніжала іх

камерцыйны поспех, хаця іх падтрымлівалі і спонсары. З'яўленне антрэпрыз на Беларусі можна палічыць паказчыкам перaймання заходніх традыцый у арганізацыі культурнага жыцця, уключэння ў сусветныя працэсы развіцця мастацтва. Нейкім чынам антрэпрыза стала канкурэнтам дзяржаўнаму рэпертуарнаму тэатру, новай формай арганізацыі дзейнасці мастацкіх устаноў.

Рэдкім прыкладам арганізацыі дзяржаўнага тэатра на базе тэатра-студыі служыць гісторыя Мінскага муніцыпальнага тэатра драмы «Дзе-Я?», які вырас з тэатра-студыі пад кіраўніцтвам рэжысёра М. Трухана, адкрытага ў 1986 г. Атрыманне звання муніцыпальнага тэатра ў 1992 г. дазволіла вырашыць праблему з пастаянным памяшканнем. Мінскі гарвыканкам перадаў у арэнду тэатру залу, якая належыла кінатэатру «Радзіма». Ад пачатку свайго існавання гэты тэатр актыўна працаваў над нацыянальным рэпертуарам, імкнуўшыся ўвасобіць праблемы духоўнага адраджэння ў спектаклях.

Аб тым, што тэатральнае жыццё губляе выключна дзяржаўны падыход да яго арганізацыі сведчыць з'яўленне розных недзяржаўных арганізацый, якія часта мелі дачыненне да якіх-небудзь сусветных устаноў. У лістападзе 1992 г. у Мінску быў створаны Беларускі нацыянальны цэнтр Міжнароднага інстытута тэатра ЮНЕСКО, у структуры якога знаходзілася некалькі камітэтаў: драматургічных і музычных тэатраў; драматургіі; камунікацыі; тэатральнай адукацыі; культурнага самаразвіцця нацыі і інш.

Такім чынам, развал СССР, атрыманне Беларуссю незалежнасці і эканамічны крызіс значна паўплывалі на развіццё беларускага тэатра. Сярод гэтых фактараў можна вызначыць як станоўчыя, так і адмоўныя. З аднаго боку, тэатры атрымалі нічым не абмежаваную творчую свабоду. Аднак значна пагоршылася фінансаванне тэатра - скараціліся выдаткі на новыя пастаноўкі, замерла гастрольнае жыццё краіны. У такіх эканамічных умовах тэатры пачалі актыўна займацца пошукамі спонсараў, якія б дапамаглі ў арганізацыі і правядзенні тэатральных мерапрыемстваў.

У 90-я гг. на Беларусі ўзнікла некалькі дзяржаўных і прыватных прафесійных тэатраў, з'явіліся традыцыйныя фестывалі. Дзейнасць Міністэрства культуры была скіравана на падтрымку развіцця гістарычнай тэматыкі ў беларускай драматургіі. Значна змяніўся рэпертуар усіх беларускіх тэатраў. Павялічылася колькасць пастановак, прысвечаных беларускай гісторыі і сучаснасці. Больш устойлівым стала становішча тэатраў, некаторыя з іх змаглі ажыццявіць капітальны рамонт сваіх будынкаў (напрыклад, Брэсцкі тэатр драмы і музыкі).

Можна заўважыць наступныя тэндэнцыі ў развіцці недзяржаўных тэатраў ў разглядаемы перыяд. У канцы 80 – першай палове 90-х гг. актыўна ствараліся і дзейнічалі эксперыментальныя тэатры-студыі, якія сталі пляцоўкамі для ажыццяўлення вопытаў па ўкараненні новых падыходаў да арганізацыі і фінансавання творчых праектаў. Большасць з гэтых тэатраў-студый знікла, але з другой паловы 1990-х гг. папулярнасць атрымала пастаноўка спектакляў па прынцыпе антрэпрызы, калі акцёры і рэжысёры з розных тэатраў запрашаюцца на адзін канкрэтны спектакль (вядомыя мінскія антрэпрызы «Бульвар смеху», «Віртуозы сцэны», «Тэатральныя зоркі» і інш.) За рэдкім выключэннем, на Беларусі амаль усе тэатры ў 90-я гг. XX ст. з'яўляліся дзяржаўнымі. Асноўныя

сродкі на ўтрыманне тэатральных калектываў, правядзенне тэатральных фестываляў і конкурсаў даваў дзяржаўны бюджэт рэспубліканскага і рэгіянальнага ўзроўняў. Дзяржава праводзіла сваю палітыку ў галіне прафесійнага тэатральнага мастацтва, садзейнічала яго развіццю.

### *4. Музычнае мастацтва Беларусі.*

Музычнае жыццё сучаснай Беларусі ўяўляе сабой стракатую палітру, дзе пераплятаюцца розныя плыні, накірункі, стылі і імпрэзы. У 90-я гг. назіраюцца некаторыя новыя тэндэнцыі развіцця музычнага мастацтва, якія характэрны беларускай культуры ў цэлым. У першую чаргу неабходна назваць стварэнне новых музычных арганізыцый і творчых калектываў, з'яўленне новых музычных фестываляў, цікавыя пастаноўкі ў тэатрах.

У 1991 – 2000 гг. у Рэспубліцы Беларусь існавала два творчых аб'яднання прафесіяналаў у сферы музычнага мастацтва: Саюз кампазітараў і Саюз музычных дзеячаў Беларусі. Гэтыя арганізацыі перажылі перыяд ломкі старой структуры, змяніўся характар іх адносін з Міністэрствам культуры. У складзе Саюза кампазітараў на 1998 г. было 111 чалавек, 9 з якіх жылі за межамі Беларусі. У 90-я гг. XX ст. у складзе Саюза кампазітараў з'явілася Асацыяцыя сучаснай музыкі. Замацаваў свае пазіцыі створаны ў 1991 г. Саюз музычных дзеячоў Беларусі, які пачаў стала падтрымліваць правядзенне многіх музычных фестываляў.

Развіццю беларускага музычнага мастацтва садзейнічала стварэнне новых твораў буйной формы, значна ўзрасла папулярнасць сімфанічных жанраў. У пер. пал. 90-х гг. XX ст. былі напісаны 8-я сімфонія Д. Смольскага з вершамі І. Бродскага, камерная сімфонія для сапрана, барытона і камернага ансамбля "Апошняя восень паэта" В. Войціка на вершы П. Верлена ў перакладзе М. Багдановіча, 2-я сімфонія У. Дамарацкага, сімфонія "Гравюры" С. Бельцюкова для хора і аркестра, сімфонія "Плач перапёлкі" для хора і аркестра У. Кандрусевіча, 4-я сімфонія А. Соніна "Музыка для Мандэльштама" для фартэпіяна сола. У гэты перыяд Міністэрства культуры абвясціла конкурс на стварэнне лепшага твора да юбілею Ф. Скарыны, які пацягнуў за сабой напісанне 3-й сімфоніі У. Дарохіна "Францыск Скарына: жыццё і бессмяротнасць", сімфоніі "Lux aeterna" ("Вечнае святло") Я. Паплаўскага, містэрыі "Францыск" для баса і аркестра А. Літвіноўскага і інш.

Зразумела, што кампазітараў хвалююць тыя ж самыя тэмы, што і пісьменнікаў, мастакоў, дзеячоў тэатральнага мастацтва – асэнсаванне сталінскіх рэпрэсій (8-я сімфонія "Памяці ахвяраў сталінізму" Ф. Пыталева, 4-я сімфонія "Курапаты" К. Цесакова), чарнобыльская трагедыя (10-я сімфонія "Чорная быль" Ф. Пыталева, "Цэзій-137" В. Кузняцова), перапрацоўка авангардысцкіх уплываў ("Супрэматызм" Н. Голубевай) і інш. Сярод вакальна-сімфанічных твораў 1990-х гг. можна адзначыць кантаты "Куранты" В. Капыцькі, "Тысяча гадоў надзеі" і "У гонар сусветнага пажару" Г. Гарэлавай.

У 1991 г. на Беларусі працавала два музычных тэатры, але тэатр оперы і балета знаходзіўся ў стане распаду на дзве трупы. У 1992 г. балетнай трупе ДАВТа Рэспублікі Беларусь была прадстаўлена эканамічная і творчая самастойнасць. Мастацкім кіраўніком новага калектыва, які атрымаў назву Акадэмічны Вялікі тэатр балета Рэспублікі Беларусь, быў прызначаны В.М. Елізар'еў. Першапачаткова пасля падзела было створана "Творчае аб'яднанне Нацыянальны акадэмічны тэатр оперы і балета Рэспублікі

Беларусь", у склад якога ўваходзілі два калектыва, якія мелі поўную аўтаномію. Мастацкім кіраўніком тэатра оперы стаў кампазітар С. Картэс. Раздзяленне тэатра адбылося па ініцыятыве балетнай яго часткі. Прычына такой ініцыятывы – на той час опера стала цяжарам для балетнай трупы, якая атрымала значную папулярнасць, шмат гастралявала ў свеце і была вымушана матэрыяльна падтрымліваць оперную трупу. Неабходна прызнаць, што гэтая акцыя прынясла стоноўчыя вынікі, стымулявала самастойнае развіццё тэатра оперы, які да канца 1990-х гг. таксама дасягнуў некаторых поспехаў, пачаў больш гастраляваць у Еўропе.

У 90-я гг. XX ст. працягваўся працэс стварэння і пастаноўкі оперных твораў сучасных беларускіх кампазітараў: Я. Глебава "Майстар і Маргарыта", А. Бандарэнкі "Князь Наваградскі", С. Картэса "Візіт дамы". Опера "Князь Наваградскі" была напісана кампазітарам А. Бандарэнкай у 1991 г. на лібрэта В. Іпатавай па п'есе Л. Пракопчыка. Сюжэт оперы абапіраецца на рэальныя падзеі, звязаныя са стварэннем ВКЛ, распаўсюджаннем хрысціянства на беларускіх і літоўскіх землях. Прэм'ера оперы адбылася у снежні 1992 г. Нягледзячы на некаторыя недахопы оперы, "Князь Наваградскі" – адлюстраванне новай тэндэнцыі ў сучаснай музыцы – пранікненне нацыянальнай тэматыкі і гістарычных вобразаў у творы вялікай музычна-драматургічнай формы.

У 90-я гг. XX ст. у беларускім оперным тэатры з'явілася яшчэ адна традыцыя, якая існуе ва ўсім свеце – пастаноўка опер на мове арыгінала, сярод якіх былі пастаноўкі "Тоскі" Дж. Пучыні, "Лючыі ды Ламермур" Г. Даніцэці на італьянскай мове і некаторыя інш. З прычыны таго, што пастаноўка оперных спектакляў патрабуе ўкладання вялікіх сродкаў, оперны тэатр актывізаваў пастаноўку твораў у канцэртна-сцэнічным выкананні. Сярод такіх пастановык былі оперы "Моцарт і Сальеры" М. Рымскага-Корсакава, "Барыс Гадуноў" М. Мусаргскага, "Паяцы" Р. Леанкавала, "Набука" Дж. Вердзі, "Фауст" А. Радзівіла. Неабходна прызнаць, што выкананне оперы ў канцэртным варыянце (калі адсутнічаюць дэкарацыі, абмежавана драматычнае дзейства) значна прайграе традыцыйнаму. Аднак такі варыянт падрыхтоўкі спектакляў дазваляе хутчэй узбагачаць рэпертуар, лягчэй вывозіць спектаклі на міжнародныя фестывалі.

Сярод музычных тэатраў у самым лепшым фінансавым становішчы знаходзіцца Нацыянальны акадэмічны тэатр балета. Акрамя таго, што ён самы запатрабаваны на захадзе і вядзе самую актыўную на сённяшні дзень гастрольную дзейнасць, з 1999 г. яго трупа карыстаецца асобнай фінансавай падтрымкай дзяржавы. Адметнай з'явай у развіцці беларускай музыкі і танца стала пастаноўка балета "Страсці (Рагнеда)" кампазітара А. Мдзівані. Музычныя тэатры ў 90-я гг. XX ст. трымалі планку самых папулярных у гледача: у 1998 г. самы высокі паказчык сярэдняй запаўняльнасці глядзельнай залы быў у тэатра балета (97 %) і тэатра музкамедыі (92 %).

У гэты перыяд значна вырасла колькасць прафесійных музычных калектываў: 17 калектываў у 1985 г., 25 – у 1993 г., 77 – у 2001 г. Самую вялікую колькасць з іх утрымлівалі: Дзяржаўнае аб'яднанне "Белканцэрт" (24 калектывы), Беларуская дзяржаўная філармонія (13), Магілёўская абласная філармонія (11). Аднак у пер. пал. 90-х гг. праходзіў працэс скарачэння колькасці канцэртаў і слухачоў на іх, што адбывалася па эканамічных прычынах. За перыяд з 1991 г. па 1995 г. больш чым у два разы скарацілася колькасць наведванняў тэатраў і канцэртных устаноў краіны.

Самым актыўным сярод творчых калектываў Беларусі з'яўляецца створаны ў 1987 г. Дзяржаўны канцэртны аркестр Беларусі, які ўзначальвае М. Фінберг. Гэты творчы калектыў вельмі актыўна папулярызуе беларускае старадаўняе і сучаснае мастацтва, сам з'яўляецца ініцыятарам, арганізатарам і актыўным удзельнікам многіх музычных фестываляў і імпрэз. Менавіта ў выкананні гэтага калектыву ўпершыню прагучалі многія новыя творы беларускіх кампазітараў. Другі напрамак творчасці гэтага аркестра – выкананне джазавай музыкі. Трэцім накірункам стала арганізацыя ўласных фестываляў. Чацвёрты накірунак дзейнасці аркестра – выкананне твораў беларускіх кампазітараў буйных формаў, як класікаў, так і сучасных кампазітараў. У структуру аркестра Беларусі ўваходзяць Біг-бэнд, ансамбль трубачоў "Інтрада", Камерны аркестр, Актэт драўляных духавых інструментаў.

Працэс стварэння новых музычных калектываў ідзе па двух шляхах: непасрэднае ўтварэнне калектыва праз набор прафесійных музыкантаў, другі – наданне афіцыйнага прафесійнага статусу аматарскаму калектыву, які мае высокія творчыя дасягненні. Прыкладам другога варыянта стварэння калектыва можа служыць Камерны канцэртны аркестр народных інструментаў Рэспублікі Беларусь. Гэты калектыў пад назвай "Менск" з'явіўся на пачатку 90-х гг. на базе самадзейнага аркестра народных інструментаў Беларускай політэхнічнай акадэміі, куды ўліліся прафесійныя музыканты. Паступова калектыў набыў папулярнасць, шмат гастраляваў. 7 мая 1998 г. канцэртам у зале Белдзяржфілармоніі адбылася прэзентацыя калектыва ўжо ў новым статусе. Па сваёй структуры аркестр не з'яўляецца тыповым: асновай яго з'яўляюцца народныя струнныя інструменты – домбры і балалайкі, з групай духавых інструментаў сімфанічнага аркестра. Такая пабудова дазваляе калектыву выконваць як класічны сімфанічны рэпертуар, так і творы народнай музыкі.

Часам развіццё творчага калектыву прыводзіць да таго, што на яго базе ствараюцца вялікія творчыя аб'яднанні. Прыкладам можа служыць стварэнне нацыянальнага тэатральна-канцэртнага аб'яднання "Беларуская капэла", якое адбылося ў 1992 г. на базе аднайменнага музычнага калектыву. Мэтай стварэння стала адраджэнне нацыянальнай старажытнай музычнай культуры, даследаванне і уключэнне ў культурнае жыццё музычнай спадчыны, прапаганда сучаснай музыкі беларускіх кампазітараў. Стваральнікі тэатральна-канцэртнага аб'яднання зыходзілі з думкі, што ў мінулым Беларусь была асяродкам еўрапейскай музычнай культуры і неабходна адрадзіць гэтыя традыцыі. Для ажыццяўлення гэтай мэты праводзіліся фестывалі. Дзейнасць "Беларускай капэлы" садзейнічала з'яўленню тэатральных і канцэртных твораў на музыку старажытных беларускіх кампазітараў: аднаактовы балет кампазітара В. Кузняцова па творах Агінскага (1995) і пастаноўка на сцэне опернага тэатра оперы "Фаўст" А. Радзівіла (1999). Другі аспект дзейнасці капэлы – выдавецтва нот, даследаванні ў галіне гісторыі музыкі, адраджэнне старажытнай музычнай спадчыны.

Аднак неабходна прызнаць, што магчымасць выконваць старажытную музыку з'явілася толькі тады, калі быў назапашаны нотны матэрыял у даследчыкаў, з'явіліся выканаўцы і ансамблі, здольныя выканаць гэтыя творы, пры гэтым стала зразумела, што неабходна вывучэнне аўтэнтычных музычных інструментаў, на якіх выконвалася

старажытная музыка. Вывучэннем і выкананнем старажытнай музыкі займаюцца такія творчыя калектывы, як ансамбль салістаў „Класік-Авангард" , камерны мужчынскі хор „Унія", камерны хор Мінскага музычнага вучылішча імя М. Глінкі, ансамбль старадаўняй музыкі „Кантабіле" і многія іншыя.

Адраджэнне цікавасці да старажытнай беларускай музыкі можна лічыць адной з асаблівасцей беларускай культуры на сучасным этапе. Старажытная музыка стала крыніцай натхнення сучасных кампазітараў і выканаўцаў, яна ўсё часцей гучыць на канцэртах. Утварэнне і дзейнасць новых музычных ансамбляў і аркестраў садзейнічае ўзбагачэнню музычнага жыцця краіны, спрыяе яго разнастайнасці.

Музычнае жыццё Беларусі стала больш адметным, узбагацілася новымі творамі і вярнула да жыцця мноства твораў старажытнай музыкі. Аднак музычнае жыццё краіны не абмяжоўваецца канцэртамі класічнай і камерный музыкі, пастаноўкамі опер і балетаў. У першую чаргу масавы слухач цікавіцца эстрадай. Вельмі актыўна ў 90-я гг. развіваўся жанр песні. Акрамя знакамітых гуртоў "Сябры", "Верасы" і "Песняры", з'явіліся шматлікія творчыя калектывы "Ляпіс Трубецкі", "Крама", "Палац" і іншыя, дзейнасць якіх развіваецца ў розных стылістычных накірунках: рок, фольк-рок, аўтарская песня і іншыя.

### *5. Фестывальны рух на Беларусі.*

Адной з адметных рыс беларускай культуры канца XX ст. стала з'яўленне розных тэатральных і музычных фестываляў, якія значна ўзбагацілі культурнае жыццё краіны, дазвалялі гледачу пазнаёміцца з працамі разнастайных мастацкіх школ і накірункаў. У сярэдзіне 80-х гг. XX ст. фестывалі не былі вельмі частай з'явай на Беларусі. Мінск быў асноўным месцам правядзення фестываляў, не было ніводнага пастаяннага фестываля, які б праводзіўся ў правінцыі. Аднак гэта сітуацыя паступова змянілася ў 90-я гг.

Дэмакратызацыя грамадскага жыцця, якая пацягнула за сабой актыўныя змены ў тэатральным мастацтве, садзейнічала з'яўленню шматлікіх тэатраў-студый, якія пачалі засвойваць перадавыя накірункі заходняга мастацтва і выпрацоўвалі новыя падыходы да нацыянальнай тэматыкі. Тэатры-студыі аб'ядноўваліся ў рознага плану асацыяцыі. У 1989 г. у Мінску адбыўся рэспубліканскі фестываль тэатраў-студый. У 1991 г. ён атрымаў статус міжнароднага і назву "Студыйныя каляды". У тым жа 1991 г. пачаў сваю працу фестываль "Славянскія тэатральныя сустрэчы" ў Гомелі, дзе збіраліся тэатральныя трупы трох сумежных дзяржаў – Беларусі, Украіны і Расіі.

У 1993 г. пачаў сваё існаванне Міжнародны фестываль монаспектакляў "Я" у Мінску. Менавіта ў сезоне 93/94 гг. намецілася ажыўленне ў міжнародных кантактаў: нямецкі рэжысёр Х. Флахубер паставіў спектакль у Тэатры юнага гледача, беларускі рэжысёр Р. Таліпаў ставіў спектакль у Аўстрыі, пачала ажыццяўляцца і гастрольная дзейнасць тэатраў. З 1994 г. у Маладзечна адбываўся рэспубліканскі тэатральны фестываль "Маладзечанская сакавіца", арганізаваны з мэтай актывізацыі развіцця беларускага тэатральнага мастацтва.

Сярод беларускіх тэатральных фестываляў адным з самых вядомых стаў брэсцкі фестываль "Белая вежа", які ўпершыню быў праведзены ў 1996 г. Паступова склаўся асабісты твар брэсцкага фестывалю, які праходзіць пры фінансавай падтрымцы мясцовых улад і прадпрыемстваў горада. Даволі хутка фестываль развіваўся, пашыралася

геаграфія ўдзельнікаў фестываля. Вельмі важную ролю адыгрывае гэты фестываль і ў фарміраванні міжнародных культурных сувязяў. Традыцыйна ў Брэст прыязджаюць знакамітыя тэатры з краін Прыбалтыкі (Тэатр «Вайдылы» з Вільнюса, Рыжскі тэатр рускай драмы), якія зараз маюць сусветную вядомасць.

Вялікая колькасць разнапланавых тэатральных фестываляў папоўнілася ў 1998 г. Рэспубліканскім фестывалем нацыянальнай драматургіі імя В. І. Дуніна-Марцінкевіча, які праводзіўся раз у тры гады ў г. Бабруйску. Яго арганізатары спадзяваліся, што ён будзе садзейнічаць развіццю беларускай драматургіі. Па ўмовах конкурсу ў ім маглі прымаць удзел толькі тыя спектаклі, якія пастаўлены ў перыяд паміж двума фестывалямі.

Фестывальны рух у поўнай меры датычыўся не толькі драматычных ці музычных тэатраў, але і тэатраў лялек. З 1990 г. у Мінску праходзіў Беларускі фестываль тэатраў лялек, арганізаваны на базе Дзяржаўнага тэатра лялек Беларусі. На "Белай вежы" лялечныя тэатры таксама ўдзельнічалі у конкурскай праграме, іх спектаклі ацэньвае самастойнае журы.

Паступова пачалі з'яўляцца новыя музычныя беларускія фестывалі. Некаторыя з іх з-за недахопу сродкаў праводзідіся адзін-два разы і знікалі зусім, некаторыя сталі традыцыйнымі ("Славянскі базар" і фестываль імя Салярцінскага ў Віцебску, "Музычная восень" у Мінску). Упершыню фестываль сучаснай камернай музыкі імя І. Салярцінскага адбыўся ў 1989 г., арганізатарам гэтага мерапрыемства выступіла Віцебскае аддзяленне Беларускага музычнага таварыства. Гэты фестываль ужо быў арганізаваны па новых прынцыпах, якія пазней сталі галоўнымі: ініцыятыва зыходзіць ад якой небудзь грамадскай арганізацыі ці суполкі, вакол фестывалю групуецца некалькі прафесійных калектываў, якія акрэсліваюць асноўныя накірункі дзейнасці, рыхтуюць да фестывалю спецыяльны рэпертуар. Міністэрства культуры выступае спачатку як дарадчык і арбітр, часткова фінансуе. У арганізацыі культурнага жыцця ўсё большую ролю пачынаюць адыгрываць мясцовая ўлады.

Адзін з першых музычных фестываляў незалежнай Беларусі – „Адраджэнне беларускай капэлы", які ўпершыню адбыўся ў кастрычніку 1991 г., мастацкім кіраўніком гэтага мерапрыемства быў В. Скарабагатаў. Асноўнай мэтай правядзення фестывалю з'ўлялася адраджэнне старажытных еўрапейскіх традыцый капэлы, пашыраных на тэрыторыі Беларусі ў XVII – XVIII стст. На першым фестывалі прагучалі праваслаўныя распевы ў гонар Е. Полацкай, створаныя ў XII—XV стст., меса нясвіжскага капелана Шымкевіча, гімны ўсіх хрысціянскіх канфесій, якія існавалі на Беларусі XVIII – XX стст., старажытная свецкая музыка М. К. Агінскага, урыўкі з оперы "Агатка" І. Голанда, творы В. Цітова на вершы С. Полацкага і інш.

Самым знакамітым з усіх беларускіх фестываляў з'яўляецца "Славянскі базар", які дае магчымасць бліжэй пазнаёміцца з мастацтвам славянскіх народаў. У сярэдзіне 80-х гг. XX ст. у Віцебску быў пабудаваны адзін з самых вялікіх у Еўропе (у ім размешчана 5 тыс. месцаў) Летні Амфітэатр. Гэты будынак быў створаны спецыяльна для фестывалю польскай песні, які адбываўся на яго сцэне. Менавіта гэты фестываль і лічыцца непасрэдным папярэднікам і крыніцай "Славянскага базару", які нарадзіўся ў 1992 г. У той час складана было ўявіць сабе яго далейшы лёс – з часу яго заснавання было шмат фінансавых цяжкасцей і гучных скандалаў. Але факт застаецца фактам: кожны год у Віцебск прыязджае ўсё больш гасцей, таленавітых спевакоў і музыкантаў. Даўно гэтая з'ява выйшла за рамкі толькі музычнага фестывалю. За "Славянскім базарам" замацаваўся выраз "фестываль фестываляў". Ён пачынаўся як агульны праект трох бакоў —

Беларусі, Расіі і Украіны. Са снежня 1993 г. "Славянскі базар" зяўляецца членам міжнароднай Федэрацыі Фестывальных Арганізацый (FIDOF), якая прызнала гэты фестываль лепшым у свеце за 2000 г.

Праграма фестывалю ўзбагачаецца і змяняецца кожны год, выгляд яе вельмі стракаты і разнастайны. Традыцыйнымі ўжо сталі сольныя канцэрты зорак эстрады, Міжнародны фестываль дзіцячай творчасці, прагляды кінафільмаў, праца джазавага клуба, прэс-канферэнцыі. Паступова музычны фестываль увабраў у сябе і іншыя віды мастацтва. У ім з'явіліся "Тэатральныя сустрэчы", у рамках якіх віцябляне ўбачылі пастаноўкі некаторых спектакляў, пазней сур'ёзнае месца ў фестывальнай праграме пачынае займаць класічная музака, опера і балет. Традыцыйна важную ролю ў фестывалі адыгрывае фальклор. Але ўсё ж такі галоўным стрыжнем свята застаецца конкурс маладых выканаўцаў, які збірае штогадова прыкладна 15 – 20 маладых спевакоў.

У чэрвені 1993 г. упершыню прайшоў фестываль беларускай песні і паэзіі ў г. Маладзечна. Мэтай паравядзення гэтага фестывалю стала папулярызацыя беларускай музыкі і паэзіі, абуджэнне цікавасці да беларускай мовы і мастацтва. Арганізатарамі фестывалю сталі тагачасны мэр г. Маладзечна Г. Карпенка, мастацкі кіраўнік Дзяржаўнага канцэртнага аркестра РБ М. Фінберг і галоўны рэдактар творчага аб'яднання музычных і забаўляльных праграм Дзяржтэлерадыёкампаніі РБ Б. Бахціяраў. Яшчэ адна з мэт фестывалю – пошук новых таленавітых эстрадных выканаўцаў, для чаго праводзіўся конкурс маладых выканаўцаў.

У праграме фестывалю былі канцэрты джазавай і рок-музыкі, бардаўскай песні, фальклорных ансамбляў і аркестраў. У рамках музычнага фестывалю "Маладзечна" звычайна праводзіліся канцэрты лепшых музычных і харавых калектываў краіны, такіх, як Дзяржаўны хор імя Г. Цітовіча, Дзяржаўны кацэртны аркестр Беларусі пад кіраўніцтвам М. Фінберга, Дзяржаўны акадэмічны народны аркестр імя Жыновіча, выступаюць папулярныя беларускія выканаўцы. З 1998 г. усе спевакі – і зоркі, і маладыя канкурсанты – выконвалі песні толькі ў рэжыме "жывога гуку", а не пад фанаграму (гэтую ідэю выказаў і падтрымліваў М. Фінберг). Другая асаблівасць – спалучэнне музыкі народнай, эстраднай і рока. Галоўная ўмова ўдзелу выканаўцаў – усе творы, незалежна ад мастацкага накірунка, павінны былі гучаць па-беларуску.

У 1995 г. з'явіўся яшчэ адзін музычны фестываль, прысвечаны адраджэнню музычнай спадчыны Беларусі – фестываль старадаўняй беларускай інструментальный музыкі "Музы Нясвіжа", ініцыятарам якого таксама быў М. Фінберг. На Беларусі на тыя часы гэта быў адзіны фестываль камернай музыкі, які быў арганізаваны ў невялікім раённым цэнтры. Фінансаванне фестывалю адбывалася за кошт Міністэрства культуры, абласных і мясцовых улад, спонсараў. Для кожнага фестывалю "Музы Нясвіжа" выбіраецца якая-небудзь агульная тэма. У 1999 г. гэта была тэма "Музычныя сталіцы свету", у 2001 г. – музыка эпохі класіцызму і рамантызму, выконваліся творы А. Радзівіла, М. К. Агінскага і інш.

Па ініцыятыве Беларускай каталіцкай грамады і рымска-каталіцкай парафіі ў Магілёве з 1993 г. праводзіцца міжнародны фестываль хрысціянскай музыкі "Магутны Божа". Паступова ў арганізацыю фестывалю былі ўцягнуты ўлады г. Магілёва, існуе фонд "Магутны Божа". У конкурснай праграме ўдзельнічаюць прафесійныя, прыходскія хоры,

дзіцячыя і маладзёжныя ансамблі, індывідуальныя выканаўцы. Адной з умоў удзелу ў конкурсе з'яўляецца абавязковае выкананне якога-небудзь беларускага твора (ноты канкурсанты атрымліваюць загадзя). Конкурсныя канцэрты традыцыйна адбываюцца ў касцёле св. Станіслава, дзе выдатная акустыка.

У гонар кампазітара С. Манюшкі з 2000 г. у г. Чэрвень пачалі праводзіць штогадовы музычны фестываль «Убельскія ластаўкі», на якім выконваецца музыка С. Манюшкі і класічныя оперныя творы. У праграму фестывалю ўключаны конкурс маладых вакалістаў.

У 90-я гг. на Беларусі ўзнікла некалькі дзяржаўных і прыватных прафесійных тэатраў, з'явіліся такія традыцыйныя фестывалі, як фестываль монаспектакляў "Я", "Славянскія тэатральныя сустрэчы", "Белая вежа", "Маладзечанская сакавіца" і інш. Большасць беларускіх тэатральных фестываляў праходзіла ў абласных і раённых гарадах краіны, дзе існуюць тэатры. Гэта павышала мастацкі ўзровень саміх рэгіянальных тэатраў, дазваляла правінцыяльнаму гледачу пазнаёміцца з працамі лепшых тэатраў краіны і замежжа. Важную арганізацыйную ролю ў тэатральным руху адыгрывалі мясцовыя ўлады і спонсары.

Музычныя фестывалі садзейнічалі вяртанню ў культурнае жыццё шматлікіх твораў старажытнасці, якія былі занядбаны. Вакол арганізатараў фестываляў гуртуюцца творчыя калектывы, якія рыхтуюць свае праграмы да гэтых мерапрыемстваў. Часта арганізатарамі і ініцыятарамі фестываляў становяцца непасрэдна творчыя калектывы. З'яўленне вялікай колькасці разнастайных музычных фестываляў садзейнічае адраджэнню музычнай спадчыны, стымулюе развіццё музычнага мастацтва. Адраджэнню і папулярызацыі старажытнай музыкі прысвечаны фестывалі "Музы Нясвіжа" ў Нясвіжы, "Адраджэнне беларускай капэлы" ў Мінску, "Убельскія ластаўкі" ў г. Чэрвені і інш. Станоўчай рысай фестывальнага руху можна лічыць той факт, што многія з фестываляў адбываюцца ў маленькіх гарадах: Нясвіжы, Чэрвені, Заслаўлі, Маладзечна і інш.

### *Літаратура*

1. Лыч, Л. Гісторыя культуры Беларусі / Л. Лыч, У. Навіцкі. – Мн.: Экаперспектыва, 1996. – С. 400 – 450.

2. Папко, В.М. Гістарычныя тэмы і вобразы ў сучасным беларускім мастацтве // Вестник БрГТУ. – 2001. – № 6. – С. 22–25.

3. Папко, В.М. Развіццё беларускай скульптуры як паказальнік трансфармацыйных працэсаў у культуры // Системная трансформация общества: исторический опыт и современность: сборник научных трудов кафедр социально-гуманитарных наук. Брест, 2006. – Вып. 3. – С. 217–222.

4. Папко, В.М. Развіццё выяўленчага мастацтва на Беларусі і роля дзяржавы ў гэтых працэсах у 1985-2000 гг. // Вестник БрГТУ. – 2002. – № 6. – С.45–47.

5. Папко, В.М. Фестывальны рух на Беларусі ў кантэксце дзяржаўнай палітыкі (1985-2000) // Kulturowe i ekonomiczne aspekty procosow transformacji w Europie Srodkowo-Wschodniej. Politechnika Bialostocka, rozprawy naukowe nr. 126. – Bialystok. – 2005. – С. 196-203.

6. Парашкоў С.А. Гісторыя культуры Беларусі. – Мн.: Бел. навука, 2003. – С. 335–363.

7. Попко, О.Н. Театральный фестиваль "Белая вежа" в Бресте // Вестник БрГТУ. – 2000. – № 6. – С.24–26.

8. Тарановіч, А. «10 гадоў пасля, альбо беларускае мастацтва сярэдзіны 90-х гадоў» // Культура. – 1996. – 24–30 студзеня. – С. 6.

**Тэма 14. Рэспубліка Беларусь як суб'ект міжнародных культурных адносін.**

1. Унутраныя і знешнія дэтэрмінанты замежных культурных сувязяў Беларусі.
2. Арганізацыйна-прававы механізм замежных культурных сувязяў Беларусі.

### *1. Унутраныя і знешнія дэтэрмінанты замежных культурных сувязяў Беларусі.*

Важную ролю ў вызначэнні знешняй культурнай палітыкі Рэспублікі Беларусь адыгрывалі ўнутраныя фактары: дасягненне рэальнай дзяржаўнай незалежнасці, посткамуністычная трансфармацыя. На працягу сваёй гісторыі беларускія землі ўваходзілі ў склад розных дзяржаў, а беларускі народ быў вымушаны існаваць ва ўмовах, калі яго культура не падтрымлівалася з боку дзяржавы. Лепшыя прадстаўнікі беларускай нацыі – вучоныя, пісьменнікі, мастакі, кампазітары і рэлігійныя дзеячы працавалі на карысць народаў, якія мелі палітычную перавагу. Распад СССР і атрыманне дзяржаўнай незалежнасці далі краіне магчымасць самастойна вызначаць сваю ўнутраную і знешнюю культурную палітыку, распрацоўваць нарматыўна-прававые асновы міжнароднага культурнага ўзаемадзеяння, заключаць пагадненні з міжнароднымі арганізацыямі і замежнымі краінамі, фарміраваць механізм іх рэалізацыі.

Савецкая сістэма міжнароднага культурнага супрацоўніцтва, якая склалася ва ўмовах адміністрацыйна-каманднай сістэмы, перажывала працэс трансфармацыі ў новую дэмакратычную сістэму, якая абапіраецца на агульначалавечыя каштоўнасці і нацыянальныя інтарэсы. Дэмакратызацыя міжнародных сувязей спрыяла разбурэнню "жалезнай заслоны", якая на працягу дзесяцігоддзяў перашкаджала развіццю кантактаў беларускага грамадства з еўрапейскай і сусветнай цывілізацыямі. Прафесійныя і самадзейныя мастацкія калектывы атрымалі магчымасць самастойна ўсталёўваць замежныя кантакты.

Знешняя культурная палітыка Рэспублікі Беларусь распрацоўваецца і ажыццяўляецца ў той час, калі ў свеце рашуча пануе тэндэнцыя да глабалізацыі, няўхільна пашыраюцца геаграфічныя межы інфармацыйнага грамадства, у творчым працэсе тон задаюць постмадэрністы.

### *2. Арганізацыйна-прававы механізм замежных культурных сувязяў Беларусі.*

Арганізацыйная структура для распрацоўкі і ажыццяўлення знешняй культурнай палітыкі Рэспублікі Беларусь сфармавана з улікам адпаведных задач, якія былі вызначаны вышэйшым дзяржаўным кіраўніцтвам нашай краіны. У яе ўваходзяць віцэ-прэм'ер урада, які курыруе сацыяльны блок; адпаведныя структурныя падраздзяленні міністэрстваў замежных спраў, адукацыі, культуры, інфармацыі, Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, аташэ па пытаннях культуры беларускіх амбасад; айчынныя дыпламаты, якія займаюцца пытаннямі, звязанымі з ЮНЕСКА, Цэнтральна – Еўрапейскай Ініцыятывай; дамы беларускай культуры, якія размешчаны за мяжой. Пры гэтым выразна прасочваецца цеснае ўзаемадзеянне пералічаных структур з інстытутамі грамадзянскай супольнасці.

Ключавую ролю ў арганізацыі культурных сувязяў паміж Беларуссю і дзяржавай знаходжання амбасады адыгрывае аташэ па пытаннях культуры, які выконвае наступныя функцыі:

- актыўная, мэтанакіраваная прапаганда айчынных культурных здабыткаў у краіне знаходжання;
- максімальная дапамога ў арганізацыі выстаў айчынных мастакоў, у ажыццяўленні гастроляў айчынных майстроў мастацтваў;
- сістэматычны аналіз вопыту дзяржаўнай палітыкі ў сферы культуры, адукацыі, навукі ў краіне знаходжання;
- садзеянне ва ўсталяванні кантактаў паміж культурнымі, навуковымі, адукацыйнымі ўстановамі абедзвюх краін.

Зразумела, дзейнасць указаных структур вызначана перш за ўсё месцам дадзенага аспекту ў курсе канкрэтнай дзяржавы на міжнароднай арэне.

Актыўная знешняя культурная палітыка не толькі садзейнічае фарміраванню спрыяльнага вобразу краіны за мяжой, але ў многіх выпадках з'яўляецца важным стымулам эканамічнага развіцця. Праз культурныя сувязі можна дасягнуць узаемапаразумення і паглыблення эканамічных і палітычных адносін.

Былы Надзвычайны і Паўнамоцны Амбасадар Рэспублікі Беларусь у Польшчы Мікалай Крэчка адзначыў: "Культурная дыпламатыя... – гэта ці не самая шырокая магчымасць для рэкламы любой дзяржавы, для стварэння міжнароднага іміджу гэтай дзяржавы – выступае вельмі і вельмі важкім фактарам дыпламатычнай службы. І раней было так: першымі ідуць купцы, услед за імі – культура, а потым ужо крочыць палітыка. Праз гэту схему якраз сёння фарміруюцца стасункі з Беларуссю".[4]

Аднак на першым этапе існавання незалежнай Беларусі меліся і пэўныя цяжкасці ў галіне культурнага супрацоўніцтва з іншымі краінамі. У пачатку 1990-х гг. не былі вызначаны прыярытэты культурнага супрацоўніцтва і яго накірункі. Гэта прыводзіла да пэўнай анархіі ў пошуку партнёраў за мяжой. У арганізацыі замежнай гастрольнай дзейнасці мелі месца адмоўныя тэндэнцыі, якія былі звязаны з адсутнасцю неабходнага вопыту міжнародных сувязяў, нарматыўнай базы, валодання валютным рахункам, неабходнага кантролю з боку ўстаноў культуры, адпаведных аддзелаў Міністэрства культуры. На Беларусі культурны вектар быў паступова выключаны са знешнепалітычных прыярытэтаў. Так, у Палажэнні аб Міністэрстве замежных спраў Рэспублікі Беларусь (1998 г.), якое рэгламентавала дзейнасць знешнепалітычнага ведамства, культурны вектар знешняй палітыкі не ўзгадваецца. У аснову тагачаснага палітычнага курса была пакладзена ідэя аб тым, што ва ўмовах дэфіцыту фінансавання ўсе матэрыяльныя і інтэлектуальныя сродкі павінны быць сканцэнтраваны на эканамічным накірунку, які прыносіць хуткія дывідэнды, у адрозненне ад адукацыі і культуры, дзе трэба доўга чакаць вынікаў.

У пачатку XXI стагоддзя відавочна прасочваецца павышэнне ролі культурнай складовай у галіне міжнароднай палітыкі РБ. Прававы базіс знешняй культурнай палітыкі Рэспублікі Беларусь уключае два аспекты.

---

[4] Крэчка М. Нельга ускладаць праз палітычную прызму... // Культура. – 2001 – № 9. – 5–9 сакавіка. – С.9.

1. Блок канкрэтных міжнародных пагадненняў паміж РБ і замежнымі краінамі. Гэты блок падзяляецца на двухбаковыя і шматбаковыя пагадненні. Беларусь яшчэ ў савецкі перыяд падпісала міжнародныя канвенцыі аб ахове культурнай спадчыны: Канвенцыю аб абароне культурных каштоўнасцяў у выпадку ўзброенага канфлікта ад 14 мая 1954 г.; Канвенцыю аб мерах, якія накіраваны на забарону і папярэджанне незаконнага ўвозу, вывазу і перадачы ўласнасці на культурныя каштоўнасці ад 14 лістапада 1970 г.; Канвенцыю аб ахове сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны.

У постсавецкі перыяд блок адпаведных пагадненняў папоўніўся Еўрапейскай культурнай канвенцыяй (1993 г.), Канвенцыяй краін Чарнаморскага рэгіёна аб супрацоўніцтве ў галіне культуры, адукацыі, навукі і інфармацыі. Беларусь мае з шэрагам дзяржаў спецыяльныя пагадненні аб культурным супрацоўніцтве. Яны заклалі трывалы падмурак для адпаведнай дзейнасці РБ на балгарскім, брытанскім, германскім, італьянскім, кіпрскім, расійскім, румынскім, славацкім, славенскім і іншых напрамках.

2. Прывядзенне ўнутранага заканадаўства ў адпаведнасць з міжнароднымі абавязацельствамі нашай краіны. Яшчэ ў ліпені 1991 г. быў прыняты Закон "Аб культуры ў Беларускай ССР". Праз 13 год набыла юрыдычную сілу яго новая рэдакцыя, у якой узаемадзеянне беларускай нацыянальнай культуры з культурамі іншых народаў і яе інтэграцыя ў сусветную культуру былі ўключаны ў лік асноўных прынцыпаў ажыццяўлення і забеспячэння культурнай дзейнасці. З 1992 г. такую ж сілу набыў "Закон Рэспублікі Беларусь аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны", найноўшая рэдакцыя якога датуецца 9 студзеня 2006 г.

Рэспубліка Беларусь актыўна прапагандуе сваю культурную і прыродную спадчыну ў свеце, імкнецца прадставіць свае нацыянальна-культурныя здабыткі на міжнародным узроўні:

1. Для рэалізацыі гэтай мэты ў Спіс Сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны ЮНЕСКО былі ўключаны палацавы комплекс рэзідэнцыі Радзівілаў у Нясвіжы, замкавы комплекс у г. п. Мір, Белавежская пушча і геадэзічная дуга Струве. У стадыі падрыхтоўкі знаходзіцца дасье па Аўгустоўскаму каналу, яшчэ дзевяць аб'ектаў нацыянальнай культурнай спадчыны рэкамендаваны для ўключэння ў спіс экспертамі ЮНЕСКО.

2. Беларускі тэатр трывала ўпісаўся ў тканіну міжнародных культурных адносін. Тэатры актыўна гастралююць за мяжой, удзельнічаюць і заваёўваюць узнагароды ў такіх прэстыжных міжнародных фестывалях, як Эдзінбургскі (Англія), Шылераўскі і Бонскае біенале (Германія), Шэкспіраўскі (Іспанія), Чэхаўскі (Расія) і шмат іншых. Цэнтрам тэатральнага жыцця міжнароднага маштаба перыядычна становіцца і сама Беларусь, дзе праводзіцца шмат фестываляў з удзелам замежных гасцей ("Белая вежа" у Брэсце і інш.).

3. У міжнародным інтэр'еры грунтоўна выглядае беларускае кіно. На кінастудыі «Беларусьфільм» паспяхова ажыццяўляюцца міжнародныя творчыя праекты па стварэнню мастацкіх фільмаў сумесна з кінематаграфістамі Расіі, Германіі, Ізраіля і іншых краін. Неаднойчы азначаліся прызамі і ўзнагародамі міжнародных кінафестываляў фільмы «Белвідэацэнтра», такіх як фестываль нацый у Аўстрыі, «Пасланне да чалавеку» (Санкт-Пецярбург), біенале сучаснага мастацтва ў Цэнтры Пампіду (Парыж), «За-

латы Віцязь» (Мінск, Масква) і інш. Традыцыйна вялікім поспехам на сусветных кінафорумах карыстаецца беларускае анімацыйнае кіно. Падзеяй у рэспубліцы становіцца правядзенне аглядаў дасягненняў кінематаграфістаў розных краін. У 2007 г. на конкурс X міжнароднага фестываля «Анімаеўка» у Магілеве было атабрана 37 прац аніматараў з 12 краін. У кінафестывалі «Лістапад-2007» прынялі ўдзел кінематаграфісты з 33 краін свету.

4. Значна больш разнастайным стала дачыненне Беларусі да міжнароднага супрацоўніцтва ў галіне музыкальнай культуры. Шырокія маштабы набыў удзел нашай краіны ў міжнародных музычных фестывалях. Рэспубліка Беларусь пастаянна дэманструе здольнасць да арганізацыі падобных мерапрыемстваў на вышэйшым узроўні. Яскравым сведчаннем таму шмат гадоў з'яўляецца міжнародны музычны фестываль "Славянскі базар" у Віцебску. Актыўную гастрольную дзейнасць праводзяць оперная і балетная трупы Вялікага тэатра Беларусі, шырока прадстаўлена на музычных мерапрыемствах у свеце сучасная авангардная, эксперыментальная музыка.

5. У розных краінах свету з відавочным поспехам праходзяць выставы айчынных мастакоў. Іх творы выклікаюць вялікую цікавасць з боку наведвальнікаў падобных выстаў.

6. Беларускія пісьменнікі таксама атрымліваюць прызнанне за межамі краіны. Творы С. Алексіевіч "У вайны не жаночы твар", "Цынкавыя хлопчыкі", "Апошнія сведкі", "Чарнобыльская малітва", "Зачараваныя смерцю" адказвалі настроям не толькі беларускіх, але і замежных чытачоў. Бліскучы талент пісьменніцы ў паказе савецкай і постсавецкай рэчаіснасці адзначаюць замежныя даследчыкі яе творчасці. Ва ўзнагародавую калекцыю С. Алексіевіч уваходзяць прэстыжныя прэміі розных краін. У далёкім і блізкім замежжы таксама атрымалі шырокі рэзананс творы айчынных майстроў слова: В. Быкава, У. Арлова, А. Разанава, Н. Мацяш, А. Кудраўца, А. Паповай.

У працэсе ажыццяўлення знешняй культурнай палітыкі Рэспублікі Беларусь сустракаюцца і праблемы, вырашэнне якіх адпавядала б нацыянальным інтарэсам нашай краіны: вяртанне з далёкага і блізкага замежжа культурных каштоўнасцяў, якія сапраўды належаць беларускаму народу. Развіццю сучаснай беларускай культуры будзе садзейнічаць далучэнне Беларусі да Балонскага працэса. Негатыўны ўплыў на магчымасці Беларусі як суб'екта міжнародных культурных адносін аказвае сучасны сусветны эканамічны крызіс. Даследчык В.Г. Шадурскі сцвярджае, што Беларусь не з'яўляецца актыўным удзельнікам сусветнай культурнай прасторы, а толькі мае магчымасць больш ці менш паспяхова прыстасоўвацца да існуючых умоў і правілаў.

Такім чынам, за гады незалежнага існавання ўдзел Беларусі ў развіцці міжнароднага культурнага супрацоўніцтва набыў устойлівую дынаміку, што прасочваецца ў напаўненні рэальным зместам арганізацыйна-прававога, канцэптуальнага, практычнага аспектаў яе знешняй культурнай палітыкі. Разам з тым у дадзеным накірунку ёсць і праблемы, якія трэба неадкладна вырашаць.

***Літаратура***

1. Асновы культуралогіі: канспект лекцый / С.В. Снапкоўская, В.А. Вараб'ёва, В.М. Іўчанка, Н.І. Здановіч. – Мн.: Асар, 2008. – С. 197-198.

2. Малашук П.В. Белорусско-югославские отношения (1953-2003гг) – Диссертация на соискание ученой степени кандидата исторических наук. – Мн: БГУ, 2005. – 136 с.

3. Крэчка, М. Нельга ускладаць праз палітычную прызму... // Культура. – 2001 – № 9. – 5–9 сакавіка. – С. 9.

4. Шадурский, В.Г. Внешняя культурная политика Республики Беларусь / Белорусский журнал международного права и международных отношений. – 2000. – № 4. – http://evolutio.info/index.php?option=com_content&task=view&id=387Itemid=51.–27 27 апреля 2009 г.

5. www.embassybel.ru/embassy/mbassador/ - 21k – 16 студзеня 2009 года.

6. Стралец М.В. Асновы дыпламатычнай і консульскай службы: курс лекцый. Вучэбнае выданне. – Брэст: БрДТУ, 2008. – 188 с.

7. Парашкоў С.А. Гісторыя культуры Беларусі. – Мн.: Бел. навука, 2004. – 444 с.

## Заключэнне

Беларуская культура прайшла этапы свайго станаўлення ад язычніцтва, якое існавала ў дадзяржаўны перыяд гісторыі, да існавання ва ўмовах незалежнай дзяржавы. Геаграфічнае становішча беларускіх зямель стала прычынай многіх асаблівасцей культуры мясцовага насельніцтва. Галоўнай падзеяй ў сярэднявеччы можна лічыць прыняцце хрысціянства, якое паступова замяніла язычніцкія вераванні. Хрысціянства пранікала на беларускія землі з Захаду і Усходу, менавіта тут сутыкаліся праваслаўная і каталіцкая царква, якія абумовілі з цягам часу ўзнікненне асноўнай рысы беларускага менталітэта – талерантнасці. Хрысціянства ўкаранялася тут мірнымі метадамі, спалучалася з некаторымі элементамі язычніцтва.

Падчас ўключэння беларускіх зямель у склад Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага пашыраліся культурныя сувязі з Заходняй Еўропай і Руссю. У рамках ВКЛ фарміравалася беларуская народнасць, набыла статус дзяржаўнай старабеларуская мова, на якой ствараліся законы, друкаваліся кнігі, размаўлялі ў судзе і дзяржаўных установах. Стваралася новая этнанацыянальная культура, якая адрознівалася ад культур суседніх народнасцей. Некаторы ўплыў на культуру і мову беларускай народнасці аказалі народы, якія суседнічалі тут з беларусамі – балты, палякі, татары.

Культура XVI—XVIII стст. мела полілінгвістычны (шматмоўны) характар. Беларуская мова ўжывалася ў асноўным толькі ў вясковым асяроддзі, на ёй размаўлялі гарадскія нізы, частка шляхты і духавенства. Уплыў на беларускую культуру аказалі руская і заходнееўрапейская культуры. Культура Беларусі мае шэраг агульных элементаў з еўрапейскімі: лацінскі алфавіт пісьмовай мовы выкарыстоўваўся ў дадатак да кірыліцы, лацінскія карані маюць многія словы ў нацыянальных мовах. Беларускія землі былі ўключаны ў многія культурныя працэсы, якія адбываліся ў Заходняй Еўропе – Адраджэнне (пашырэнне ідэй гуманізму), Асветніцтва, Рэфармацыю. У беларускай архітэктуры і мастацтве праявіліся многія стылі еўрапейскага мастацтва – гатычны, Рэнесанс, барока, класіцызм, рамантызм, мадэрн і многія іншыя, якія набылі тут сваю рэгіянальную спецыфіку ("віленскае барока").

На працягу XX ст. развіццё нацыянальнага элемента ў беларускім выяўленчым, музычным і тэатральным мастацтве не толькі не падтрымлівалася з боку дзяржавы, але і наадварот падвяргалася ганенням. Выключэннем можна лічыць кароткі перыяд беларусізацыі. Атрыманне незалежнасці ў 1991 г. дало магчымасць развіваць нацыянальнае мастацтва, рэканструіраваць помнікі архітэктуры, занядбаныя ў савецкія часы, садзейнічала захаванню і распаўсюджванню беларускіх нацыянальных традыцый. Рэспубліка Беларусь ажыццяўляе актыўную ўнутраную і знешнюю культурную палітыку, папулярызуе за межамі краіны дасягненні свайго мастацтва. Значна ўзрасла роля мясцовых улад і прадпрыемстваў у фінансаванні галіны, што спрыяла ажыўленню культурнага жыцця правінцыі. Новай тэндэнцыяй стала імкненне мясцовых улад падкрэсліць гістарычныя і культурныя асаблівасці рэгіёнаў, што часта рабілася праз ушанаванне памяці аб сваіх знакамітых земляках.

Вучэбнае выданне

**ПАПКО ВОЛЬГА МІКАЛАЕЎНА**
**СТРАЛЕЦ МІХАІЛ ВАСІЛЬЕВІЧ**
**ВАСОВІЧ СЯРГЕЙ МІХАЙЛАВІЧ**
**МАЛАШУК ПАВЕЛ УЛАДЗІМІРАВІЧ**

# ГІСТОРЫЯ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСІ

*Рэкамендавана Саветам універсітэта ў якасці дапаможніка для студэнтаў усіх спецыяльнасцей*

Адказны за выпуск: **Папко В.М.**
Рэдактар: **Строкач Т.У.**
Камп'ютэрная вёрстка: **Баравікова А.А.**
Карэктар: **Нікітчык А.В.**
Дызайн вокладкі: **Шчарбіна А., Юшчанка Г.**

ISBN 978-985-493-146-3

Ліцэнзія № 02330/0549435 ад 8.04. 2009 г.
Падпісана ў друк 22.02.2010 г. Фармат 60×84 1/16.
Папера "Снягурачка". Гарнітура "Arial Narrow".
Ул.-друк. арк. 6,25. Умоўна-друк. арк. 5,8.
Тыраж 200 экз. Заказ № 196.
Надрукавана на рызографе ўстановы адукацыі "Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт".
224017, г. Брэст, вул. Маскоўская, 267.